# КРЫМІНАЛЬНА-ВЫКАНАЎЧЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

11 студзеня 2000 г. № 365-З

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 14 снежня 1999 года*

*Адобраны Саветам Рэспублікі 22 снежня 1999 года*

Змяненні і дапаўненні:

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2003 г. № 173-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 8, 2/922) <H10300173>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2003 г. № 183-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 8, 2/932) <H10300183>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 красавіка 2004 г. № 273-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2004 г., № 72, 2/1022) <H10400273>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2005 г. № 40-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 121, 2/1137) <H10500040>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 чэрвеня 2006 г. № 122-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 92, 2/1219) <H10600122>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 24 снежня 2007 г. № 299-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 3, 2/1396) <H10700299>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2008 г. № 315-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 14, 2/1412) <H10800315>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 2008 г. № 377-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 172, 2/1474) <H10800377>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2008 г. № 411-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 184, 2/1508) <H10800411> — Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 5 верасня 2008 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 21 ліпеня 2008 г. № 417-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 184, 2/1514) <H10800417>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 6 ліпеня 2009 г. № 37-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2009 г., № 171, 2/1589) <H10900037> — Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 1 жніўня 2009 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2009 г. № 43-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2009 г., № 173, 2/1595) <H10900043>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2010 г. № 123-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 120, 2/1675) <H11000123>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2011 г. № 318-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 134, 2/1870) <H11100318>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2011 г. № 322-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 134, 2/1874) <H11100322> — Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 6 чэрвеня 2012 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 2011 г. № 325-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 140, 2/1877) <H11100325>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 12 ліпеня 2013 г. № 55-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 23.07.2013, 2/2053) <H11300055>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2015 г. № 241-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 17.01.2015, 2/2239) <H11500241>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2015 г. № 307-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 24.07.2015, 2/2305) <H11500307>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 24 снежня 2015 г. № 331-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 29.12.2015, 2/2329) <H11500331>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2016 г. № 405-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 22.07.2016, 2/2404) <H11600405> — Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 23 студзеня 2017 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 24 кастрычніка 2016 г. № 439-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 15.11.2016, 2/2437) <H11600439> — Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 16 мая 2017 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2017 г. № 14-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 12.01.2017, 2/2452) <H11700014>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 131-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 28.07.2018, 2/2569) <H11800131>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2019 г. № 171-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 18.01.2019, 2/2609) <H11900171>

## ЗМЕСТ

АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА
РАЗДЗЕЛ I. АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ КРЫМІНАЛЬНА-ВЫКАНАЎЧАГА ЗАКАНАДАЎСТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 1. Крымінальна-выканаўчае заканадаўства Рэспублікі Беларусь
Артыкул 2. Задачы і змест крымінальна-выканаўчага заканадаўства Рэспублікі Беларусь
Артыкул 3. Крымінальна-выканаўчае заканадаўства і міжнародна-прававыя акты
Артыкул 4. Дзеянне крымінальна-выканаўчага заканадаўства ў прасторы і часе
Артыкул 5. Падставы выканання пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці
Артыкул 6. Прынцыпы крымінальна-выканаўчага заканадаўства Рэспублікі Беларусь
Артыкул 7. Выпраўленне асуджаных і яго асноўныя сродкі
ГЛАВА 2. ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА АСУДЖАНЫХ
Артыкул 8. Асновы прававога становішча асуджаных
Артыкул 9. Асноўныя абавязкі асуджаных
Артыкул 10. Асноўныя правы асуджаных
Артыкул 11. Права асуджаных на асабістую бяспеку
Артыкул 12. Забеспячэнне свабоды веравызнання асуджаных
Артыкул 13. Звароты асуджаных і парадак іх разгляду
ГЛАВА 3. ОРГАНЫ І ЎСТАНОВЫ, ЯКІЯ ВЫКОНВАЮЦЬ ПАКАРАННЕ І ІНШЫЯ МЕРЫ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ. КАНТРОЛЬ ЗА ІХ ДЗЕЙНАСЦЮ
Артыкул 14. Органы і ўстановы, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці
Артыкул 15. Паведамленне аб месцы адбывання пакарання

Артыкул 16. Прымяненне да асуджаных прымусовых мер бяспекі і лячэння
Артыкул 17. Кантроль дзяржаўных органаў
Артыкул 18. Судовы кантроль
Артыкул 19. Ведамасны кантроль вышэйстаячых органаў
Артыкул 20. Пракурорскі нагляд за выкананнем заканадаўства
Артыкул 21. Кантроль і ўдзел грамадскіх аб'яднанняў у працы органаў і ўстаноў, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці
Артыкул 22. Наведванне ўстаноў, якія выконваюць пакаранне
АСАБЛІВАЯ ЧАСТКА
РАЗДЗЕЛ II. ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯЎ, НЕ ЗВЯЗАНЫХ З ІЗАЛЯЦЫЯЙ АСУДЖАНАГА АД ГРАМАДСТВА
ГЛАВА 4. ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ГРАМАДСКІХ РАБОТ
Артыкул 23. Парадак выканання пакарання ў выглядзе грамадскіх работ
Артыкул 24. Умовы выканання і адбывання пакарання ў выглядзе грамадскіх работ
Артыкул 25. Падлік тэрміну пакарання ў выглядзе грамадскіх работ
Артыкул 26. Абавязкі адміністрацыі арганізацый па месцы адбывання асуджанымі пакарання ў выглядзе грамадскіх работ
Артыкул 27. Адказнасць асуджаных за парушэнне парадку і ўмоў адбывання пакарання ў выглядзе грамадскіх работ і за злоснае ўхіленне ад іх адбывання
Артыкул 28. Злоснае ўхіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе грамадскіх работ
ГЛАВА 5. ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ШТРАФУ
Артыкул 29. Парадак выканання пакарання ў выглядзе штрафу
Артыкул 30. Наступствы нявыплаты штрафу
ГЛАВА 6. ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАЗБАЎЛЕННЯ ПРАВА ЗАЙМАЦЬ ПЭЎНЫЯ ПАСАДЫ АБО ЗАЙМАЦЦА ПЭЎНАЙ ДЗЕЙНАСЦЮ
Артыкул 31. Парадак выканання пакарання ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю
Артыкул 32. Абавязкі адміністрацыі арганізацый па выкананні прыгавору
Артыкул 33. Абавязкі органаў, правамоцныхануляваць дазвол на займанне пэўнай дзейнасцю
Артыкул 34. Падлік тэрміну выканання пакарання ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю
Артыкул 35. Абавязкі асуджаных да пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю
Артыкул 36. Адказнасць за невыкананне прыгавору суда аб пазбаўленні права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю
ГЛАВА 7. ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАПРАЎЧЫХ РАБОТ
Артыкул 37. Парадак выканання пакарання ў выглядзе папраўчых работ
Артыкул 38. Умовы адбывання пакарання ў выглядзе папраўчых работ
Артыкул 39. Падлік тэрміну пакарання ў выглядзе папраўчых работ

Артыкул 40. Абавязкі адміністрацыі арганізацый па месцы адбывання асуджанымі папраўчых работ
Артыкул 41. Парадак правядзення вылічэнняў з заробку асуджаных да папраўчых работ
Артыкул 42. Меры заахвочвання, якія прымяняюцца да асуджаных да папраўчых работ
Артыкул 43. Адказнасць асуджаных за парушэнне парадку і ўмоў адбывання папраўчых работ і за злоснае ўхіленне ад іх адбывання
ГЛАВА 8. ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ АБМЕЖАВАННЯ ВОЛІ
Артыкул 44. Месцы адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі
Артыкул 45. Накіраванне асуджаных да абмежавання волі да месца адбывання пакарання і прыцягненне да адбывання пакарання
Артыкул 46. Падлік тэрміну пакарання ў выглядзе абмежавання волі
Артыкул 47. Парадак выканання пакарання ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу
Артыкул 48. Матэрыяльна-бытавое забеспячэнне асуджаных да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу
Артыкул 48[1]. Парадак выканання пакарання ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу
Артыкул 49. Медыка-санітарнае забеспячэнне асуджаных да абмежавання волі
Артыкул 50. Умовы працы асуджаных да абмежавання волі
Артыкул 51. Абавязкі органаў і ўстаноў, якія выконваюць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі
Артыкул 52. Абавязкі адміністрацыі арганізацый, у якіх працуюць асуджаныя да абмежавання волі, і індывідуальных прадпрымальнікаў, у якіх працуюць асуджаныя да абмежавання волі
Артыкул 53. Выхаваўчая праца з асуджанымі да абмежавання волі
Артыкул 54. Меры заахвочвання, якія прымяняюцца да асуджаных да абмежавання волі
Артыкул 55. Адказнасць асуджаных за парушэнне парадку і ўмоў адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі і за ўхіленне ад адбывання гэтага пакарання
Артыкул 56. Прымяненне мер заахвочвання і спагнання да асуджаных да абмежавання волі
Артыкул 57. Нагляд за асуджанымі да абмежавання волі і меры папярэджання парушэнняў устаноўленага парадку адбывання гэтага пакарання
РАЗДЗЕЛ III. ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ АРЫШТУ
ГЛАВА 9. ПАРАДАК І ЎМОВЫ ВЫКАНАННЯ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ АРЫШТУ
Артыкул 58. Месцы адбывання арышту
Артыкул 59. Парадак і ўмовы выканання пакарання ў выглядзе арышту
Артыкул 60. Прыцягненне да працы асуджаных да арышту
Артыкул 61. Меры заахвочвання і спагнання, якія прымяняюцца да асуджаных да арышту, і парадак іх прымянення

Артыкул 61[1]. Службовыя асобы, якія прымяняюць меры заахвочвання і спагнання да асуджаных да арышту
Артыкул 61[2]. Выключаны
Артыкул 62. Матэрыяльна-бытавое забеспячэнне і медыка-санітарнае абслугоўванне асуджаных, якія адбываюць арышт
РАЗДЗЕЛ IV. ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ
ГЛАВА 10. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ ВЫКАНАННЯ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ
Артыкул 63. Месцы адбывання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі
Артыкул 64. Віды папраўчых установ
Артыкул 65. Накіраванне асуджаных да пазбаўлення волі для адбывання пакарання
Артыкул 66. Перамяшчэнне асуджаных да пазбаўлення волі
Артыкул 67. Пакіданне асуджаных да пазбаўлення волі ў следчым ізалятары або турме
Артыкул 68. Змяненне ўмоў утрымання асуджаных да пазбаўлення волі ў межах адной папраўчай установы
Артыкул 69. Змяненне віду папраўчай установы і ўмоў рэжыму
Артыкул 70. Прыём асуджаных да пазбаўлення волі ў папраўчыя ўстановы
Артыкул 71. Асобнае ўтрыманне асуджаных да пазбаўлення волі ў папраўчых установах
Артыкул 72. Адбыванне асуджанымі да пазбаўлення волі ўсяго тэрміну пакарання ў адной папраўчай установе
ГЛАВА 11. РЭЖЫМ У ПАПРАЎЧЫХ УСТАНОВАХ І СРОДКІ ЯГО ЗАБЕСПЯЧЭННЯ
Артыкул 73. Рэжым у папраўчых установах і яго асноўныя патрабаванні
Артыкул 74. Тэхнічныя сродкі нагляду і кантролю ў папраўчых установах
Артыкул 75. Аператыўна-вышуковая дзейнасць у папраўчых установах
Артыкул 76. Рэжым асаблівага становішча ў папраўчых установах
Артыкул 77. Агульныя палажэнні аб прымяненні фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў і зброі ў папраўчых установах
Артыкул 78. Прымяненне фізічнай сілы ў папраўчых установах
Артыкул 79. Прымяненне спецыяльных сродкаў у папраўчых установах
Артыкул 80. Прымяненне агнястрэльнай зброі ў папраўчых установах
ГЛАВА 12. УМОВЫ АДБЫВАННЯ ПАКАРАННЯ Ў ПАПРАЎЧЫХ УСТАНОВАХ
Артыкул 81. Умовы адбывання пакарання асуджанымі да пазбаўлення волі
Артыкул 82. Набыццё асуджанымі да пазбаўлення волі прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці
Артыкул 83. Даванне сустрэч асуджаным да пазбаўлення волі
Артыкул 84. Атрыманне і адпраўленне асуджанымі да пазбаўлення волі пасылак, бандэролей і дробных пакетаў, атрыманне перадач
Артыкул 85. Перапіска асуджаных да пазбаўлення волі, адпраўленне і атрыманне імі грашовых пераводаў
Артыкул 86. Тэлефонныя размовы асуджаных да пазбаўлення волі
Артыкул 87. Прагулкі асуджаных да пазбаўлення волі

Артыкул 88. Прагляд асуджанымі да пазбаўлення волі кінафільмаў і тэлеперадач, праслухоўванне радыёперадач
Артыкул 89. Набыццё і захоўванне асуджанымі да пазбаўлення волі літаратуры і пісьмовых прылад
Артыкул 90. Умовы і парадак перамяшчэння асуджаных да пазбаўлення волі без канвою або суправаджэння
Артыкул 91. Пражыванне асуджаных жанчын па-за папраўчай калоніяй
Артыкул 92. Выезды асуджаных да пазбаўлення волі за межы папраўчых установ
Артыкул 93. Абавязковае дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне і пенсійнае забеспячэнне асуджаных да пазбаўлення волі
Артыкул 94. Матэрыяльна-бытавое забеспячэнне асуджаных да пазбаўлення волі
Артыкул 95. Асаблівасці матэрыяльна-бытавога забеспячэння асуджаных цяжарных жанчын, кормячых маці і жанчын, якія маюць дзяцей
Артыкул 96. Медыка-санітарнае забеспячэнне асуджаных
Артыкул 97. Матэрыяльная адказнасць асуджаных да пазбаўлення волі
ГЛАВА 13. ПРАЦА, ПРАФЕСІЯНАЛЬНА-ТЭХНІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ І ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА АСУДЖАНЫХ ДА ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ
Артыкул 98. Прыцягненне да працы асуджаных да пазбаўлення волі
Артыкул 99. Умовы працы асуджаных да пазбаўлення волі
Артыкул 100. Аплата працы асуджаных да пазбаўлення волі
Артыкул 101. Прыцягненне асуджаных да пазбаўлення волі да работ без аплаты працы
Артыкул 102. Вылічэнні з заработнай платы і іншых даходаў асуджаных да пазбаўлення волі
Артыкул 103. Выключаны
ГЛАВА 14. ВЫХАВАЎЧАЕ ЎЗДЗЕЯННЕ НА АСУДЖАНЫХ ДА ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ
Артыкул 104. Выхаваўчая праца з асуджанымі да пазбаўлення волі
Артыкул 105. Папячыцельскія саветы
Артыкул 106. Грамадскія выхавальнікі асуджаных да пазбаўлення волі
Артыкул 107. Псіхалагічная дапамога асуджаным
Артыкул 108. Самадзейныя арганізацыі асуджаных
Артыкул 109. Атрыманне адукацыі асуджанымі да пазбаўлення волі
Артыкул 110. Меры заахвочвання, якія прымяняюцца да асуджаных да пазбаўлення волі
Артыкул 111. Парадак прымянення мер заахвочвання да асуджаных да пазбаўлення волі
Артыкул 112. Меры спагнання, якія прымяняюцца да асуджаных да пазбаўлення волі
Артыкул 113. Парадак прымянення мер спагнання да асуджаных да пазбаўлення волі
Артыкул 114. Умовы ўтрымання асуджаных да пазбаўлення волі ў штрафных ізалятарах, памяшканнях камернага тыпу і адзіночных камерах
Артыкул 115. Службовыя асобы папраўчых установ, якія прымяняюць меры заахвочвання і спагнання да асуджаных да пазбаўлення волі

Артыкул 116. Крытэрыі і ступень выпраўлення асуджаных да пазбаўлення волі
Артыкул 117. Злоснае парушэнне асуджанымі да пазбаўлення волі ўстаноўленага парадку адбывання пакарання
ГЛАВА 15. АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАНАННЯ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ Ў ПАПРАЎЧЫХ УСТАНОВАХ РОЗНЫХ ВІДАЎ І ВА ЎМОВАХ РОЗНЫХ РЭЖЫМАЎ
Артыкул 118. Адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму
Артыкул 119. Адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму
Артыкул 120. Адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ва ўмовах строгага рэжыму
Артыкул 121. Адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ва ўмовах асаблівага рэжыму
Артыкул 122. Адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ва ўмовах пасялення
Артыкул 123. Парадак размяшчэння і ўмовы ўтрымання асуджаных у бальніцах і лячэбных папраўчых установах
Артыкул 124. Турмы
Артыкул 125. Умовы адбывання пакарання ў турме
ГЛАВА 16. АСАБЛІВАСЦІ АДБЫВАННЯ ПАКАРАННЯ Ў ВЫХАВАЎЧЫХ КАЛОНІЯХ
Артыкул 126. Умовы адбывання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі ў выхаваўчых калоніях
Артыкул 127. Меры заахвочвання, якія прымяняюцца да асуджаных у выхаваўчых калоніях
Артыкул 128. Асаблівасці прымянення мер заахвочвання да асуджаных у выхаваўчых калоніях
Артыкул 129. Меры спагнання, якія прымяняюцца да асуджаных у выхаваўчых калоніях
Артыкул 130. Парадак прымянення мер спагнання да асуджаных у выхаваўчых калоніях
Артыкул 131. Службовыя асобы выхаваўчай калоніі, якія прымяняюць меры заахвочвання і спагнання да асуджаных
Артыкул 132. Пакіданне ў выхаваўчых калоніях асуджаных, якія дасягнулі паўналецця
Артыкул 133. Перавод асуджаных з выхаваўчых калоній у папраўчыя ўстановы
Артыкул 134. Арганізацыя адукацыйнага працэсу і выхаваўчай работы ў выхаваўчай калоніі
Артыкул 135. Дзейнасць камісіі па справах непаўналетніх
РАЗДЗЕЛ V. ВЫКАНАННЕ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА АСУДЖАНЫХ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ АБМЕЖАВАННЯ ПА ВАЕННАЙ СЛУЖБЕ І АРЫШТУ
ГЛАВА 17. ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ АБМЕЖАВАННЯ ПА ВАЕННАЙ СЛУЖБЕ

Артыкул 136. Абавязкі камандзіра (начальніка) воінскай часці па выкананні пакарання ў выглядзе абмежавання па ваеннай службе
Артыкул 137. Вылічэнні з грашовага забеспячэння асуджанага ваеннаслужачага
Артыкул 138. Перамяшчэнне па службе асуджанага ваеннаслужачага
Артыкул 139. Выхаваўчая праца з асуджанымі ваеннаслужачымі
Артыкул 140. Спыненне выканання пакарання ў выглядзе абмежавання па ваеннай службе
Артыкул 141. Вызваленне ад пакарання або замена пакарання асуджанаму да абмежавання па ваеннай службе
ГЛАВА 18. ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ АРЫШТУ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА АСУДЖАНЫХ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ
Артыкул 142. Месцы адбывання арышту асуджанымі ваеннаслужачымі
Артыкул 143. Асобнае ўтрыманне асуджаных ваеннаслужачых
Артыкул 144. Накіраванне асуджаных ваеннаслужачых на гаўптвахту ваеннай камендатуры
Артыкул 145. Парадак і ўмовы адбывання арышту асуджанымі ваеннаслужачымі
Артыкул 146. Меры заахвочвання і спагнання, якія прымяняюцца да асуджаных да арышту ваеннаслужачых
Артыкул 147. Асаблівасці прававога становішча асуджаных да арышту ваеннаслужачых
ГЛАВА 19. ВЫКЛЮЧАНЫ
Артыкул 148. Выключаны
Артыкул 149. Выключаны
Артыкул 150. Выключаны
Артыкул 151. Выключаны
Артыкул 152. Выключаны
Артыкул 153. Выключаны
Артыкул 154. Выключаны
Артыкул 155. Выключаны
Артыкул 156. Выключаны
Артыкул 157. Выключаны
Артыкул 158. Выключаны
Артыкул 159. Выключаны
Артыкул 160. Выключаны
Артыкул 161. Выключаны
Артыкул 162. Выключаны
Артыкул 163. Выключаны
Артыкул 164. Выключаны
РАЗДЗЕЛ VI. ВЫКАНАННЕ ДАДАТКОВЫХ ПАКАРАННЯЎ
ГЛАВА 20. ПАРАДАК ВЫКАНАННЯ ДАДАТКОВЫХ ПАКАРАННЯЎ
Артыкул 165. Парадак выканання прыгавору аб пазбаўленні асуджанага воінскага або спецыяльнага звання
Артыкул 166. Выключаны
Артыкул 167. Выключаны
Артыкул 168. Выключаны
Артыкул 169. Выключаны

Артыкул 170. Выключаны
Артыкул 171. Выключаны
РАЗДЗЕЛ VII. ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАЖЫЦЦЁВАГА ЗНЯВОЛЕННЯ
ГЛАВА 21. ПАРАДАК І ЎМОВЫ ВЫКАНАННЯ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАЖЫЦЦЁВАГА ЗНЯВОЛЕННЯ
Артыкул 172. Месцы адбывання пажыццёвага зняволення
Артыкул 173. Парадак і ўмовы выканання пакарання ў выглядзе пажыццёвага зняволення
РАЗДЗЕЛ VIII. ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАКАРАННЯ СМЕРЦЮ
ГЛАВА 22. ПАРАДАК ВЫКАНАННЯ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАКАРАННЯ СМЕРЦЮ
Артыкул 174. Прававое становішча асуджаных да пакарання смерцю
Артыкул 175. Парадак выканання пакарання смерцю
Артыкул 176. Прыпыненне выканання пакарання смерцю
РАЗДЗЕЛ IX. ВЫКАНАННЕ МЕР КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ, НЕ ЗВЯЗАНЫХ З ПРЫМЯНЕННЕМ ПАКАРАННЯ
ГЛАВА 23. ПАРАДАК ПРЫМЯНЕННЯ МЕР ВЫПРАБАВАЛЬНАГА І ПРАФІЛАКТЫЧНАГА ЎЗДЗЕЯННЯ ПРЫ АДТЭРМІНОЎЦЫ ВЫКАНАННЯ ПАКАРАННЯ, УМОЎНЫМ НЕПРЫМЯНЕННІ ПАКАРАННЯ, А ТАКСАМА ПРЫ АСУДЖЭННІ БЕЗ ПРЫЗНАЧЭННЯ ПАКАРАННЯ
Артыкул 177. Органы, якія ажыццяўляюць выпрабавальны і прафілактычны кантроль, а таксама прафілактычнае назіранне за паводзінамі асуджаных
Артыкул 178. Абавязкі асуджаных пры ажыццяўленні мер крымінальнай адказнасці, не звязаных з прымяненнем пакарання
Артыкул 179. Парадак ажыццяўлення кантролю і прафілактычнага назірання за асуджанымі
Артыкул 180. Падлік тэрміну судзімасці, выпрабавальнага тэрміну і адтэрміноўкі
Артыкул 181. Прававыя наступствы невыканання асуджаным ускладзеных на яго абавязкаў і невыканання ўмоў выпрабавання
ГЛАВА $23^{1}$. ПАРАДАК ВЫКАНАННЯ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ КАНФІСКАЦЫІ
Артыкул $181^{1}$. Парадак выканання спецыяльнай канфіскацыі
Артыкул $181^{2}$. Абавязкі трэціх асоб у дачыненні да маёмасці, якая падлягае спецыяльнай канфіскацыі
ГЛАВА 24. ПРЫМЯНЕННЕ ПРЫМУСОВЫХ МЕР ВЫХАВАЎЧАГА ХАРАКТАРУ І ПРАФІЛАКТЫЧНАГА НАЗІРАННЯ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА НЕПАЎНАЛЕТНІХ АСУДЖАНЫХ
Артыкул 182. Органы, якія ажыццяўляюць кантроль за прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару і прафілактычнага назірання за асуджанымі
Артыкул 183. Парадак выканання прымусовых мер выхаваўчага характару
Артыкул 184. Падлік тэрмінаў прымянення прымусовых мер выхаваўчага характару

Артыкул 185. Меры заахвочвання і спагнання, якія прымяняюцца да непаўналетніх, асуджаных з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару
РАЗДЗЕЛ X. ВЫЗВАЛЕННЕ АД АДБЫВАННЯ ПАКАРАННЯ. ДАПАМОГА АСОБАМ, ВЫЗВАЛЕНЫМ АД АДБЫВАННЯ ПАКАРАННЯ, І КАНТРОЛЬ ЗА ІМІ
ГЛАВА 25. ВЫЗВАЛЕННЕ АД АДБЫВАННЯ ПАКАРАННЯ
Артыкул 186. Падставы вызвалення ад адбывання пакарання
Артыкул 187. Парадак прадстаўлення да датэрміновага вызвалення ад адбывання пакарання
Артыкул 188. Прадстаўленне асоб, якія адбываюць пажыццёвае зняволенне, да замены гэтага пакарання пазбаўленнем волі
Артыкул 189. Адтэрміноўка адбывання пакарання ў дачыненні да асуджаных цяжарных жанчын і жанчын, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў
Артыкул 190. Наступствы невыканання ўмоў адтэрміноўкі адбывання пакарання асуджанай жанчынай да дасягнення дзіцём трохгадовага ўзросту
Артыкул 191. Спыненне адбывання пакарання і парадак вызвалення асуджаных
ГЛАВА 26. ДАПАМОГА ВЫЗВАЛЕНЫМ АД АДБЫВАННЯ ПАКАРАННЯ
Артыкул 192. Аказанне дапамогі вызваленым у іх працоўным і бытавым уладкаванні
Артыкул 193. Аказанне дапамогі вызваленым з папраўчых установ, папраўчых установ адкрытага тыпу, арыштных дамоў
Артыкул 194. Права вызваленых ад пакарання на працоўнае і бытавое ўладкаванне і іншыя віды сацыяльнай дапамогі
ГЛАВА 27. НАЗІРАННЕ І НАГЛЯД ЗА АСОБАМІ, ВЫЗВАЛЕНЫМІ АД АДБЫВАННЯ ПАКАРАННЯ
Артыкул 195. Прававое становішча асоб, якія адбылі пакаранне
Артыкул 196. Прафілактычнае назіранне за асобамі, якія адбылі пакаранне і ўмоўна-датэрмінова вызвалены ад пакарання
Артыкул 197. Кантроль за ўмоўна-датэрмінова вызваленымі ад пакарання на працягу неадбытай часткі пакарання
Артыкул 198. Парадак устанаўлення прэвентыўнага нагляду
Артыкул 199. Выключаны
Артыкул $199^1$. Выключаны
Артыкул 200. Парадак ажыццяўлення прэвентыўнага нагляду
Артыкул 201. Абавязкі асобы, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд
Артыкул 202. Парадак спынення прэвентыўнага нагляду
Артыкул 203. Адказнасць за невыкананне патрабаванняў прэвентыўнага нагляду
Артыкул 204. Скаргі і заявы, звязаныя з ажыццяўленнем прэвентыўнага нагляду
РАЗДЗЕЛ XI. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 205. Увядзенне ў дзеянне гэтага Кодэкса

**АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА**

**РАЗДЗЕЛ I**

# АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ КРЫМІНАЛЬНА-ВЫКАНАЎЧАГА ЗАКАНАДАЎСТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 1. Крымінальна-выканаўчае заканадаўства Рэспублікі Беларусь

Крымінальна-выканаўчае заканадаўства Рэспублікі Беларусь складаецца з гэтага Кодэкса* і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь, якія вызначаюць парадак і ўмовы выканання і адбывання пакарання, а таксама прымянення іншых мер крымінальнай адказнасці.

---

*Часткі артыкулаў (за выключэннем тых, якія маюць адну частку) у гэтым Кодэксе нумаруюцца арабскімі лічбамі з кропкай, пункты частак артыкулаў – арабскімі лічбамі з дужкай.

### Артыкул 2. Задачы і змест крымінальна-выканаўчага заканадаўства Рэспублікі Беларусь

1. Крымінальна-выканаўчае заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з мэтамі крымінальнай адказнасці мае сваімі задачамі рэгуляванне выканання і адбывання асуджанымі пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці, вызначэнне сродкаў дасягнення мэт крымінальнай адказнасці і сацыяльнай адаптацыі асуджаных у працэсе яе рэалізацыі, абарону праў і законных інтарэсаў асуджаных.

2. У адпаведнасці з пастаўленымі задачамі гэты Кодэкс устанаўлівае агульныя палажэнні і прынцыпы выканання пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці, прадугледжаных Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь; парадак і ўмовы выканання і адбывання ўказаных мер крымінальна-прававога ўздзеяння, а таксама прымянення ў дачыненні да асуджаных сродкаў папраўчага і прафілактычнага ўздзеяння; прававое становішча асуджаных і сістэму гарантый абароны іх праў і законных інтарэсаў; парадак дзейнасці органаў і ўстаноў, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, а таксама ўдзелу дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў і грамадзян у выпраўленні асуджаных; парадак вызвалення ад пакарання і аказання дапамогі вызваленым у сацыяльнай адаптацыі.

3. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання ў межах сваёй кампетэнцыі маюць права прымаць заснаваныя на законе нарматыўныя прававыя акты аб пытаннях выканання пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці. Гэтымі нарматыўнымі прававымі актамі не могуць устанаўлівацца абмежаванні для асуджаных, калі яны не прадугледжаны законам.

### Артыкул 3. Крымінальна-выканаўчае заканадаўства і міжнародна-прававыя акты

1. Крымінальна-выканаўчае заканадаўства Рэспублікі Беларусь грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, агульнапрызнаных прынцыпах і нормах міжнароднага права, міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь, якія адносяцца да выканання пакарання і абыходжання з асуджанымі.

2. Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы выканання пакарання і абыходжання з асуджанымі, чым тыя, якія прадугледжаны крымінальна-выканаўчым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, то прымяняюцца непасрэдна правілы міжнароднага дагавора, акрамя выпадкаў, калі з міжнароднага дагавора вынікае, што для прымянення такіх норм патрабуецца выданне ўнутрыдзяржаўнага акта.

3. У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, прынцыпамі і нормамі міжнароднага права крымінальна-выканаўчае заканадаўства Рэспублікі Беларусь і практыка яго прымянення грунтуюцца на строгім захаванні гарантый абароны ад катаванняў, гвалту і іншага жорсткага або зневажальнага для чалавечай годнасці абыходжання з асуджанымі.

### Артыкул 4. Дзеянне крымінальна-выканаўчага заканадаўства ў прасторы і часе

1. Выкананне пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.
2. Парадак і ўмовы выканання і адбывання пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці вызначаюцца крымінальна-выканаўчым заканадаўствам, якое дзейнічае падчас іх прымянення.

### Артыкул 5. Падставы выканання пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці

1. Падставамі выканання пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці з'яўляюцца абвінаваўчы прыгавор або прысуд ці пастанова суда, якія яго змяняюць і што ўступілі ў законную сілу, а таксама акт амністыі або акт памілавання.
2. Органы і ўстановы, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, не пазней за дзесяць сутак пасля атрымання распараджэння суда з копіяй або выпіскай з прыгавору (прысуду, пастановы) паведамляюць суду аб прыняцці яго да выканання.

### Артыкул 6. Прынцыпы крымінальна-выканаўчага заканадаўства Рэспублікі Беларусь

Крымінальна-выканаўчае заканадаўства Рэспублікі Беларусь грунтуецца на прынцыпах законнасці, гуманізму, дэмакратызму, роўнасці асуджаных перад законам, дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі выканання пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці, рацыянальнага прымянення мер прымусу і сродкаў выпраўлення асуджаных, стымулявання іх правапаслухмяных паводзін, спалучэння прымусовых мер з выхаваўчым уздзеяннем.

### Артыкул 7. Выпраўленне асуджаных і яго асноўныя сродкі

1. Прымяненне пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці мае мэтай выпраўленне асуджаных і папярэджанне здзяйснення злачынстваў як асуджанымі, так і іншымі асобамі.
2. Выпраўленне асуджаных – гэта фарміраванне ў іх гатоўнасці весці правапаслухмяны лад жыцця.
3. Асноўнымі сродкамі дасягнення мэт крымінальнай адказнасці ў працэсе яе прымянення з'яўляюцца ўстаноўлены парадак выканання і адбывання пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці, выхаваўчая праца, праца, карысная для грамадства, атрыманне асуджанымі адукацыі, грамадскае ўздзеянне.
4. Сродкі выпраўлення асуджаных прымяняюцца з улікам форм рэалізацыі крымінальнай адказнасці, віду пакарання, характару і ступені грамадскай небяспекі здзейсненага злачынства, асобы асуджанага і яго паводзін.

## ГЛАВА 2
## ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА АСУДЖАНЫХ

### Артыкул 8. Асновы прававога становішча асуджаных

1. Дзяржава гарантуе абарону праў, свабод і законных інтарэсаў асуджаных, забяспечвае ўстаноўленыя законам умовы прымянення пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці ў дачыненні да асуджаных, гарантыі сацыяльнай справядлівасці, іх сацыяльную, прававую і іншую абароненасць.

2. Пры выкананні пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці асуджаным гарантуюцца правы і свабоды грамадзян Рэспублікі Беларусь з абмежаваннямі, устаноўленымі крымінальным, крымінальна-выканаўчым і іншым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Асуджаныя не могуць быць вызвалены ад выканання сваіх грамадзянскіх абавязкаў, за выключэннем устаноўленых законам выпадкаў.

3. Асуджаныя замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства карыстаюцца правамі і выконваюць абавязкі, якія ўстаноўлены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, у тым ліку міжнароднымі дамовамі Рэспублікі Беларусь аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, з абмежаваннямі, прадугледжанымі крымінальным, крымінальна-выканаўчым і іншым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

4. Правы і абавязкі асуджаных, а таксама іх абмежаванне вызначаюцца зыходзячы з парадку і ўмоў выканання і адбыцця пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці.

**Артыкул 9. Асноўныя абавязкі асуджаных**

1. Асуджаныя да пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці павінны выконваць абавязкі, устаноўленыя крымінальна-выканаўчым заканадаўствам у дачыненні да парадку і ўмоў адбывання пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці, законныя патрабаванні органаў і ўстаноў, якія выконваюць дадзеныя меры крымінальна-прававога ўздзеяння, з'яўляцца па іх выкліку і даваць тлумачэнні аб пытаннях выканання прыгавору. У выпадку няяўкі на выклік асуджаны можа быць прыведзены прымусова.

2. Асуджаныя абавязаны ветліва ставіцца да работнікаў органаў і ўстаноў, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, як падчас знаходжання асуджаных ва ўказаных органах і ўстановах, так і падчас наведвання іх работнікамі гэтых органаў па месцы жыхарства, працы або навучання.

3. Асуджаныя, за якімі на працягу тэрміну судзімасці ажыццяўляецца прафілактычнае назіранне, абавязаны спачатку паведамляць органу, які ажыццяўляе прафілактычнае назіранне, аб змене месца жыхарства, аб выездзе з-за асабістых спраў у іншую мясцовасць на тэрмін, большы за адзін месяц, з'яўляцца ва ўказаны орган на яго выклік і пры неабходнасці даваць тлумачэнні адносна сваіх паводзінаў і ладу жыцця.

4. Асуджанаму, які не выконвае ўскладзеныя на яго абавязкі, можа быць абвешчана афіцыйнае папярэджанне.

**Артыкул 10. Асноўныя правы асуджаных**

1. Асуджаныя маюць права на атрыманне інфармацыі аб сваіх правах і абавязках, парадку і ўмовах адбыцця прызначаных судом пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці. Адміністрацыя органа або ўстановы, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, абавязана даць асуджаным указаную інфармацыю, а таксама знаёміць іх з усімі яе змяненнямі.

2. Асуджаныя маюць права на ветлівае абыходжанне з боку работнікаў органа або ўстановы, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці. Асуджаныя не павінны падвяргацца жорсткаму, бесчалавечнаму або зневажальнаму для іх годнасці абыходжанню. Меры прымусу да іх могуць быць ужытыя няйнакш як на падставе закона.

3. Асуджаныя не могуць быць падвергнуты медыцынскім або іншым доследам незалежна ад іх згоды.

4. Выключана.

5. Асуджаныя, у тым ліку замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, маюць права даваць тлумачэнні, весці перапіску, звяртацца ў адміністрацыю органа або ўстановы, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, суд, пракуратуру з прапановамі, заявамі і скаргамі на беларускай, рускай або іншых мовах, якімі яны валодаюць, а ў неабходных выпадках карыстацца паслугамі перакладчыка. Адказы асуджаным даюцца на мове звароту. Пры адсутнасці магчымасці даць адказ на мове

звароту ён даецца на адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь з перакладам на мову звароту.

5[1]. Асуджаныя, у тым ліку замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, маюць права звяртацца ў дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі, не ўказаныя ў частцы 5 гэтага артыкула, да індывідуальных прадпрымальнікаў у парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб.

6. Асуджаныя маюць права на ахову здароўя. Медыцынская дапамога асуджаным можа аказвацца ў амбулаторных, стацыянарных умовах, ва ўмовах аддзялення дзённага знаходжання, а таксама па-за арганізацыяй аховы здароўя ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

6[1]. Асуджаныя маюць права на займанне фізічнай культурай і спортам.

7. Асуджаныя маюць права на сацыяльнае забеспячэнне, у тым ліку і на атрыманне пенсій у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

8. Для атрымання юрыдычнай дапамогі асуджаныя маюць права карыстацца паслугамі адвакатаў або іншых асоб, якія маюць права на аказанне юрыдычнай дапамогі.

9. Асуджаныя замежныя грамадзяне маюць права ва ўстаноўленым парадку падтрымліваць сувязь з дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі і консульскімі ўстановамі сваіх дзяржаў у Рэспубліцы Беларусь, а грамадзяне дзяржаў, якія не маюць дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў у Рэспубліцы Беларусь, – з дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі дзяржаў, якія ўзялі на сябе абарону іх інтарэсаў, або з міждзяржаўнымі органамі і міжнароднымі арганізацыямі, якія займаюцца абаронай указаных асуджаных.

10. Парадак ажыццяўлення праў асуджаных устанаўліваецца гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

11. Пры ажыццяўленні праў асуджаных не павінны парушацца парадак і ўмовы адбыцця пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці, а таксама ўшчамляцца правы і законныя інтарэсы іншых асоб.

**Артыкул 11. Правы асуджаных на асабістую бяспеку**

1. Асуджаныя маюць права на асабістую бяспеку.

2. Пры ўзнікненні пагрозы асабістай бяспекі асуджанага, які адбывае пакаранне ў выглядзе арышту, абмежавання волі, пазбаўлення волі або пажыццёвага зняволення, ён мае права звярнуцца з заявай аб забеспячэнні асабістай бяспекі да любой службовай асобы ўстановы, якая выконвае пакаранне. У гэтым выпадку службовая асоба абавязана неадкладна прыняць меры для забеспячэння асабістай бяспекі асуджанага.

3. Начальнік установы, якая выконвае ўказаныя ў частцы 2 гэтага артыкула пакаранні, па заяве асуджанага або па ўласнай ініцыятыве прымае рашэнне аб пераводзе асуджанага ў бяспечнае месца або іншыя меры, якія ліквідуюць пагрозу асабістай бяспекі асуджанага.

**Артыкул 12. Забеспячэнне свабоды веравызнання асуджаных**

1. Асуджаным гарантуецца свабода веравызнання.

2. Ва ўстановах, якія выконваюць пакаранне, асуджаным дазваляецца аднаасобна або сумесна з іншымі асуджанымі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай, выказваць і распаўсюджваць перакананні, звязаныя з адносінамі да рэлігіі, удзельнічаць у выкананні рэлігійных культаў, рытуалаў і абрадаў, не забароненых законам. У гэтых мэтах асуджаныя могуць набываць прадметы культу і рэлігійную літаратуру і карыстацца імі. Для выканання рэлігійных культаў, рытуалаў і абрадаў адміністрацыя ўказаных устаноў выдзяляе адпаведнае памяшканне. Пры выкананні рэлігійных культаў, рытуалаў і абрадаў не павінны парушацца Правілы ўнутранага распарадку папраўчых устаноў, а таксама правы іншых асуджаных.

3. Асуджаным, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі, па іх просьбе можа быць дадзены дазвол на наведванне месцаў богаслужэнняў. Па просьбе асуджаных,

якія адбываюць арышт, пазбаўленне волі, пажыццёвае зняволенне, а таксама асуджаных да пакарання смерцю да іх запрашаюцца святары.

4. Да асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў адзіночных камерах, штрафных і дысцыплінарных ізалятарах папраўчых устаноў, а таксама ў памяшканнях камернага тыпу калоній, святары дапускаюцца з дазволу і ў парадку, які вызначае адміністрацыя ўстановы.

### Артыкул 13. Звароты асуджаных і парадак іх разгляду

1. Прапановы, заявы і скаргі асуджаных могуць быць выказаны ў вуснай або пісьмовай форме. Іх разглядае адміністрацыя органаў і ўстаноў, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці.

2. Прапановы, заявы і скаргі асуджаных да пакаранняў у выглядзе арышту, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення і пакарання смерцю, адрасаваныя ў органы і арганізацыі, індывідуальным прадпрымальнікам, якія ўказаны ў частках 5 і $5^1$ артыкула 10 гэтага Кодэкса, накіроўваюцца праз адміністрацыю ўстаноў, што выконваюць пакаранне.

3. Асуджаныя да іншых відаў пакарання і мер крымінальнай адказнасці накіроўваюць прапановы, заявы і скаргі самастойна.

4. Прапановы, заявы і скаргі асуджаных, указаных у частцы 2 гэтага артыкула, адрасаваныя ў органы, якія ажыццяўляюць дзяржаўны кантроль і нагляд за дзейнасцю ўстаноў, што выконваюць гэтыя пакаранні, цэнзуры не падлягаюць і не пазней за суткі (за выключэннем выхадных, дзяржаўных свят і святочных дзён, устаноўленых і аб'яўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь непрацоўнымі) накіроўваюцца па прызначэнні.

5. Органы і службовыя асобы, якім накіраваны прапановы, заявы і скаргі асуджаных, павінны разгледзець іх ва ўстаноўленыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь тэрміны і прынятыя рашэнні давесці да ведама асуджаных праз адміністрацыю ўстаноў, якія выконваюць пакаранне.

6. Прапановы, заявы і скаргі асуджаных наконт рашэнняў і дзеянняў органаў і ўстаноў, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, не прыпыняюць іх выкананне.

## ГЛАВА 3
## ОРГАНЫ І ЎСТАНОВЫ, ЯКІЯ ВЫКОНВАЮЦЬ ПАКАРАННЕ І ІНШЫЯ МЕРЫ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ. КАНТРОЛЬ ЗА ІХ ДЗЕЙНАСЦЮ

### Артыкул 14. Органы і ўстановы, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці

1. Пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ і абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу выконвае крымінальна-выканаўчая інспекцыя па месцы жыхарства асуджанага.

2. Пакаранне ў выглядзе штрафу, а таксама спецыяльную канфіскацыю маёмасці выконваюць судовыя выканаўцы.

3. Пакаранне ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю выконвае крымінальна-выканаўчая інспекцыя па месцы жыхарства або працы асуджанага, папраўчая ўстанова адкрытага тыпу або папраўчая ўстанова. Патрабаванні прыгавору аб пазбаўленні права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю выконвае адміністрацыя па месцы працы асуджанага, а таксама органы, правамоцныя ў адпаведнасці з законам ануляваць дазвол на займанне адпаведнымі відамі дзейнасці.

4. Пакаранне ў выглядзе папраўчых работ выконвае крымінальна-выканаўчая інспекцыя па месцы працы асуджанага.

5. Пакаранні ў выглядзе арышту, абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення і пакарання смерцю выконваюць установы крымінальна-выканаўчай сістэмы.
6. Пакаранне ў выглядзе пазбаўлення воінскага або спецыяльнага звання выконваюць адпаведныя органы або службовыя асобы, якія прысвоілі гэтыя званні.
7. Пакаранне, прызначанае ваеннаслужачым, выконваецца: абмежаванне па ваеннай службе – камандаваннем воінскіх часцей, устаноў, органаў і воінскіх фарміраванняў, у якіх праходзяць службу ўказаныя ваеннаслужачыя; арышт – камандаваннем гарнізонаў на гаўптвахтах ваенных камендатур для ваеннаслужачых.
8. Кантроль за паводзінамі асуджаных з адтэрміноўкай выканання пакарання, умоўным непрымяненнем пакарання і без прызначэння пакарання ажыццяўляюць крымінальна-выканаўчыя інспекцыі па месцы жыхарства ўказаных асоб.
8[1]. Кантроль за паводзінамі ваеннаслужачых, асуджаных з адтэрміноўкай выканання пакарання, умоўным непрымяненнем пакарання і без прызначэння пакарання, ажыццяўляе камандаванне воінскіх часцей.
8[2]. Прафілактычнае назіранне і прэвентыўны нагляд ажыццяўляюць тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў па месцы жыхарства асоб, за якімі ажыццяўляецца прафілактычнае назіранне або ўстаноўлены прэвентыўны нагляд.
9. Кантроль і прафілактычнае назіранне за выкананнем мер крымінальнай адказнасці, не звязаных з прымяненнем пакарання, у дачыненні да непаўналетніх асуджаных ускладаюцца на інспекцыі па справах непаўналетніх па месцы жыхарства асуджаных.
10. Парадак дзейнасці тэрытарыяльных органаў унутраных спраў па выкананні пакаранняў і іншых мер крымінальнай адказнасці ў частцы, не ўрэгуляванай гэтым Кодэксам, а таксама формы дакументаў, якія выкарыстоўваюцца пры выкананні пакаранняў і іншых мер крымінальнай адказнасці, вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 15. Паведамленне аб месцы адбывання пакарання**

Аб прыбыцці асуджанага да месца адбывання пакарання адміністрацыя ўстановы, якая выконвае пакаранне, абавязана не пазней за трое сутак з дня яго прыбыцця накіраваць паведамленне аднаму са сваякоў асуджанага на падставе яго пісьмовай заявы.

**Артыкул 16. Прымяненне да асуджаных прымусовых мер бяспекі і лячэння**

1. У дачыненні да асоб, асуджаных да арышту, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення і хворых на хранічны алкагалізм, наркаманію, таксікаманію, асоб, хворых на псіхічныя расстройствы (захворванні), або асуджаных, прызнаных асобамі з паменшанай наяўнасцю свядомасці, установы, якія выконваюць пакаранне, прымяняюць прымусовыя меры бяспекі і лячэння, прызначаныя судом.
2. Выключана.
3. У дачыненні да асуджаных да іншых пакаранняў і мер крымінальнай адказнасці прызначаныя судом прымусовыя меры бяспекі і лячэння прымяняюцца па месцы іх жыхарства шляхам прымусовага амбулаторнага назірання і лячэння.
4. Калі падчас адбывання пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці будзе выяўлена, што асуджаны хварэе на хранічны алкагалізм, наркаманію, таксікаманію, з'яўляецца асобай, хворай на псіхічнае расстройства (захворванне), або прызнаны асобай з паменшанай наяўнасцю свядомасці, орган або ўстанова, якія выконваюць указаныя меры крымінальна-прававога ўздзеяння, накіроўваюць у суд прадстаўленне аб прызначэнні такому асуджанаму прымусовых мер бяспекі і лячэння.
5. У дачыненні да асуджаных да пакаранняў, указаных у частцы 1 гэтага артыкула, хворых на актыўную форму туберкулёзу, ВІЧ-інфікаваных, хворых на СНІД або не

прайшоўшых поўнага курса лячэння венерычнага захворвання, установай, якая выконвае пакаранне, ва ўстаноўленым парадку прымяняецца абавязковае лячэнне.

**Артыкул 17. Кантроль дзяржаўных органаў**

1. Дзяржаўныя органы ў межах сваёй кампетэнцыі кантралююць дзейнасць органаў і ўстаноў, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці.

2. Парадак кантролю рэгулюе заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 18. Судовы кантроль**

1. Установы, што выконваюць пакаранне, паведамляюць суду, які пастанавіў прыгавор, аб пачатку і месцы адбыцця асуджаным пакарання ў выглядзе арышту, абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення.

2. Органы і ўстановы абавязаны паведамляць суду, які пастанавіў прыгавор, аб выкананні пакарання ў выглядзе грамадскіх работ, штрафу, пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, папраўчых работ, абмежавання па ваеннай службе, абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, пакарання смерцю, а таксама аб спецыяльнай канфіскацыі маёмасці.

3. Органы, якія ў адпаведнасці з прыгаворам аб пазбаўленні права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю абавязаны ануляваць дазвол на займанне адпаведнымі відамі дзейнасці, а таксама выканаць прыгавор у частцы пазбаўлення асуджанага вайсковага або спецыяльнага звання, паведамляюць суду аб выкананні прыгавору.

4. У парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, суд кантралюе выкананне пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці пры рашэнні пытанняў:

1) умоўна-датэрміновага вызвалення ад пакарання або замены неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем;

2) змяненне віду папраўчай установы асуджанаму, які адбывае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі;

2[1]) пераводу асуджанага да пакарання ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу для адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу;

3) замены непаўналетняму асуджанаму прымусовай меры выхаваўчага характару на больш строгую;

4) устанаўлення дадатковых забарон для непаўналетняга асуджанага, якому прызначана прымусовая мера выхаваўчага характару ў выглядзе абмежавання свабоды вольнага часу;

5) датэрміновага спынення знаходжання непаўналетняга ў спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установе, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе;

6) устанаўлення, прадаўжэння, спынення прэвентыўнага нагляду, а таксама змянення патрабаванняў прэвентыўнага нагляду, прадугледжаных часткай 8 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

7) адмены адтэрміноўкі выканання пакарання або ўмоўнага непрымянення пакарання;

8) прымянення тэрмінаў даўнасці выканання абвінаваўчага прыгавору.

5. У парадку, устаноўленым заканадаўствам, суд разглядае скаргі на дзеянні адміністрацыі органаў і ўстаноў, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці.

**Артыкул 19. Ведамасны кантроль вышэйстаячых органаў**

Ведамасны кантроль вышэйстаячых органаў за дзейнасцю органаў і ўстаноў, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, ажыццяўляецца ў парадку, які вызначае заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 20. Пракурорскі нагляд за выкананнем заканадаўства**

Пракурорскі нагляд за выкананнем заканадаўства органамі і ўстановамі, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, ажыццяўляецца Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь і падначаленымі яму пракурорамі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 21. Кантроль і ўдзел грамадскіх аб'яднанняў у працы органаў і ўстаноў, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці**

1. На падставе і ў парадку, прадугледжаных заканадаўствам, грамадскія аб'яднанні могуць кантраляваць дзейнасць органаў і ўстаноў, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці.

2. Грамадскія аб'яднанні ўдзельнічаюць у выпраўленні асуджаных, а таксама садзейнічаюць працы органаў і ўстаноў, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці.

3. У выпраўленні асуджаных, а таксама ў грамадскім кантролі за дзейнасцю органаў і ўстаноў, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, удзельнічаюць наглядальныя камісіі пры мясцовых выканаўчых і распарадчых органах, а ў дачыненні да непаўналетніх асуджаных – і камісіі па справах непаўналетніх. Парадак дзейнасці наглядальных камісій і камісій па справах непаўналетніх вызначае заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 22. Наведванне ўстаноў, якія выконваюць пакаранне**

1. Пры выкананні службовых абавязкаў наведваць установы, якія выконваюць пакаранне, без спецыяльнага дазволу маюць права:

1) Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;

2) Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь і яго намеснікі, а таксама ўпаўнаважаныя імі пракуроры і пракуроры, якія непасрэдна ажыццяўляюць нагляд за выкананнем пакарання на адпаведнай тэрыторыі;

3) службовыя асобы органаў кіравання ўстановамі, якія выконваюць пакаранне;

4) старшыні, намеснікі старшынь і суддзі Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь і Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, суддзі судоў, якія ажыццяўляюць судаводства на тэрыторыях, дзе размешчаны ўстановы, якія выконваюць пакаранне;

5) дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў і члены камісій мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія кантралююць дзейнасць устаноў, што выконваюць пакаранне, у межах адпаведных тэрыторый.

2. Прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі і іншыя асобы маюць права наведваць установы, якія выконваюць пакаранне, пры дазволе адміністрацыі гэтых устаноў або адпаведных вышэйстаячых органаў кіравання ўстановамі, якія выконваюць пакаранне.

3. Кіна-, фота- і відэаздымка асуджаных, іх інтэрв'юіраванне, у тым ліку з выкарыстаннем сродкаў аўдыя-, відэатэхнікі, дазваляюцца адміністрацыяй устаноў або вышэйстаячымі органамі кіравання ўстановамі, якія выконваюць пакаранне, з пісьмовай згоды саміх асуджаных.

4. Кіна-, фота- і відэаздымка аб'ектаў, што забяспечваюць бяспеку ўстаноў і ахову асуджаных, ажыццяўляецца з дазволу адміністрацыі ўстаноў або вышэйстаячых органаў кіравання ўстановамі, якія выконваюць пакаранне.

## АСАБЛІВАЯ ЧАСТКА

## РАЗДЗЕЛ II

## ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯЎ, НЕ ЗВЯЗАНЫХ З ІЗАЛЯЦЫЯЙ АСУДЖАНАГА АД ГРАМАДСТВА

## ГЛАВА 4

## ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ГРАМАДСКІХ РАБОТ

### Артыкул 23. Парадак выканання пакарання ў выглядзе грамадскіх работ

1. Пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ выконваюць крымінальна-выканаўчыя інспекцыі па месцы жыхарства асуджаных на аб'ектах, якія вызначаюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі пасля ўзгаднення з крымінальна-выканаўчымі інспекцыямі.

2. Асуджаныя да грамадскіх работ прыцягваюцца да адбывання пакарання не пазней за пятнаццаць дзён з дня паступлення ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю адпаведнага распараджэння суда з копіяй або выпіскай з прыгавору (прысуду, пастановы).

3. Крымінальна-выканаўчыя інспекцыі вядуць улік асуджаных, растлумачваюць ім парадак і ўмовы адбывання пакарання, вызначаюць від грамадскіх работ, узгадняюць з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі пералік аб'ектаў, на якіх асуджаныя адбываюць грамадскія працы, кантралююць паводзіны асуджаных, арганізуюць і праводзяць выхаваўчую працу з асуджанымі, вядуць сумарны ўлік адпрацаванага асуджанымі часу, прымаюць рашэнне аб прыводзе асуджаных, якія не з'яўляюцца на іх выклік, праводзяць першапачатковыя мерапрыемствы для вышуку асуджаных. Парадак арганізацыі і правядзення выхаваўчай работы з асуджанымі да грамадскіх работ вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 24. Умовы выканання і адбывання пакарання ў выглядзе грамадскіх работ

1. Асуджаныя да грамадскіх работ абавязаны працаваць на вызначаных для іх аб'ектах і адпрацаваць вызначаны судом тэрмін грамадскіх работ, выконваць правілы ўнутранага працоўнага распарадку арганізацый, у якіх яны адбываюць грамадскія работы, добрасумленна адносіцца да працы, з'яўляцца на выклік у крымінальна-выканаўчую інспекцыю і іншыя службы тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў ва ўказаны тэрмін для правядзення размоў, наведвання выхаваўчых мерапрыемстваў, а таксама дачы пісьмовых тлумачэнняў аб пытаннях, звязаных з адбываннем пакарання, даводзіць да ведама крымінальна-выканаўчай інспекцыі змяненне месца жыхарства.

2. Даванне асуджанаму працоўных адпачынкаў па асноўным месцы працы, канікул на працягу навучальнага года не прыпыняе выканання пакарання ў выглядзе грамадскіх работ.

3. У выпадку давання асуджанаму ў перыяд адбывання грамадскіх работ сацыяльных адпачынкаў у сувязі з атрыманнем адукацыі або ў сувязі з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС або з-за ўважлівых прычын асабістага і сямейнага характару выкананне дадзенага пакарання прыпыняецца на перыяд указаных адпачынкаў. Асуджаны ў гэтых выпадках абавязаны паведаміць крымінальна-выканаўчай інспекцыі па месцы адбывання пакарання аб атрыманні ім адпаведнага адпачынку і прадставіць неабходнае пацвярджэнне гэтага.

4. У выпадку ўзнікнення ў перыяд адбывання асуджаным грамадскіх работ абставін, прадугледжаных часткай 4 артыкула 49 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, крымінальна-выканаўчая інспекцыя накіроўвае ў суд прадстаўленне аб вызваленні асуджанага ад далейшага адбывання пакарання.

### Артыкул 25. Падлік тэрміну пакарання ў выглядзе грамадскіх работ

1. Тэрмін пакарання ў выглядзе грамадскіх работ лічыцца гадзінамі, на працягу якіх асуджаны адбываў грамадскія работы.

2. Час грамадскіх работ не можа перавышаць чатыры гадзіны ў выхадныя дні і ў дні, калі асуджаны не навучаецца або не заняты на асноўнай працы; у працоўныя дні, дні правядзення вучэбных заняткаў (заняткаў) – дзве гадзіны да або пасля заканчэння працы ці вучобы, а па просьбе асуджанага – чатыры гадзіны. Асуджанымі, якія не

атрымліваюць адукацыі і якія не маюць пастаяннага месца працы, грамадскія працы з іх згоды могуць адбывацца звыш чатырох, але не больш за восем гадзін у дзень. Час грамадскіх работ на працягу тыдня, як правіла, не можа быць меншы за дванаццаць гадзін.

3. Час грамадскіх работ, якія адбывае непаўналетні асуджаны, не можа перавышаць тры гадзіны ў дні, калі асуджаны не навучаецца або не заняты на асноўнай працы, а ў працоўныя дні, дні правядзення навучальных заняткаў (заняткаў) – дзве гадзіны, але не больш за тры дні ў тыдзень.

4. Пры наяўнасці ўважлівых прычын крымінальна-выканаўчая інспекцыя мае права дазволіць асуджанаму адпрацаваць на працягу тыдня меншую колькасць гадзін.

**Артыкул 26. Абавязкі адміністрацыі арганізацый па месцы адбывання асуджанымі пакарання ў выглядзе грамадскіх работ**

1. Адміністрацыя арганізацый па месцы адбывання асуджаным пакарання ў выглядзе грамадскіх работ абавязана кантраляваць выкананне асуджаным вызначаных для яго работ, штомесяц прадстаўляць у крымінальна-выканаўчую інспекцыю звесткі аб колькасці гадзін, на працягу якіх асуджаны адбываў пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ, паведамляць крымінальна-выканаўчай інспекцыі аб парушэнні асуджаным парадку і ўмоў адбывання пакарання ў выглядзе грамадскіх работ.

2. Выключана.

3. У выпадку прычынення асуджанаму калецтва, звязанага з адбываннем пакарання ў выглядзе грамадскіх работ, пакрыццё яму шкоды ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 27. Адказнасць асуджаных за парушэнне парадку і ўмоў адбывання пакарання ў выглядзе грамадскіх работ і за злоснае ўхіленне ад іх адбывання**

1. Парушэннем парадку і ўмоў адбывання асуджаным пакарання ў выглядзе грамадскіх работ з'яўляюцца:

1) невыкананне грамадскіх работ без уважлівых прычын;

2) адмова ад выканання вызначанага для асуджанага віду грамадскіх работ або няяўка ва ўстаноўлены тэрмін для выканання грамадскіх работ па накіраванні крымінальна-выканаўчай інспекцыі без уважлівых прычын;

3) іншае парушэнне працоўнай дысцыпліны падчас выканання грамадскіх работ;

4) няяўка ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю без уважлівых прычын.

2. За парушэнне асуджаным да пакарання ў выглядзе грамадскіх работ парадку і ўмоў адбывання пакарання крымінальна-выканаўчая інспекцыя выносіць яму афіцыйнае папярэджанне аб крымінальнай адказнасці за злоснае ўхіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе грамадскіх работ.

3. Асуджаныя, якія злосна ўхіляюцца ад адбывання пакарання ў выглядзе грамадскіх работ, прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 28. Злоснае ўхіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе грамадскіх работ**

1. Асобай, якая злосна ўхіляецца ад адбывання пакарання ў выглядзе грамадскіх работ прызнаецца асуджаны, які:

1) не выйшаў на грамадскія работы без уважлівых прычын больш за два разы пасля афіцыйнага папярэджання на працягу адбывання дадзенага пакарання;

2) здзейсніў больш за два разы пасля афіцыйнага папярэджання на працягу адбывання дадзенага пакарання іншыя парушэнні працоўнай дысцыпліны падчас выканання грамадскіх работ;

3) схаваўся з мэтай ухілення ад адбывання пакарання.

2. Асуджаны, які знік з месца жыхарства і месцазнаходжанне якога невядома, аб'яўляецца ў вышук і можа быць затрыманы з санкцыі пракурора на тэрмін да трыццаці сутак. Затрыманы асуджаны змяшчаецца ў ізалятар часовага ўтрымання тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў. Спагнанне з асуджанага грашовай сумы, зрасходаванай у сувязі з яго вышукам, праводзіцца шляхам здзяйснення выканаўчага надпісу. Памер грашовай сумы, зрасходаванай у сувязі з вышукам асуджанага, вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 5
## ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ШТРАФУ

### Артыкул 29. Парадак выканання пакарання ў выглядзе штрафу

1. Асуджаны да штрафу абавязаны выплаціць штраф на працягу трыццаці дзён з дня ўступлення прыгавору суда ў законную сілу.
2. У выпадку, калі асуджаны не мае магчымасці аднаразова выплаціць штраф, суд па хадайніцтве асуджанага і заключэнні судовага выканаўцы можа адтэрмінаваць або растэрмінаваць выплату штрафу на тэрмін да аднаго года.
3. У выпадку нявыплаты асуджаным штрафу яго спаганяе судовы выканаўца прымусова ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб выканаўчым вядзенні.
4. Спагнанне штрафу не можа быць накіравана на маёмасць, на якую не можа быць накіравана спагнанне па выканаўчых дакументах.

### Артыкул 30. Наступствы нявыплаты штрафу

1. Пры нявыплаце асуджаным штрафу і немагчымасці яго прымусовага спагнання ў сувязі з адсутнасцю ў асуджанага неабходных сродкаў і маёмасці судовы выканаўца ўносіць у суд прадстаўленне аб замене штрафу грамадскімі работамі ў адпаведнасці з часткай 3 артыкула 50 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. У выпадку замены штрафу грамадскімі работамі яны выконваюцца ў парадку, прадугледжаным гэтым Кодэксам.
2. Пры нявыплаце асуджаным штрафу ва ўстаноўлены тэрмін без уважлівых прычын і ўхіленні ад яго выплаты пры наяўнасці рэальнай магчымасці выканання дадзенага пакарання судовы выканаўца афіцыйна папярэджвае асуджанага аб недапушчальнасці такіх паводзін, аб чым робіцца адзнака ў выканаўчых дакументах.
3. У выпадку, калі асуджаны пасля афіцыйнага папярэджання працягвае ўхіляцца ад выплаты штрафу пры магчымасці яго выплаціць, судовы выканаўца накіроўвае ў орган папярэдняга следства матэрыялы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання.

## ГЛАВА 6
## ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАЗБАЎЛЕННЯ ПРАВА ЗАЙМАЦЬ ПЭЎНЫЯ ПАСАДЫ АБО ЗАЙМАЦЦА ПЭЎНАЙ ДЗЕЙНАСЦЮ

### Артыкул 31. Парадак выканання пакарання ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю

1. Пакаранне ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, прызначанае ў якасці асноўнага, а таксама пры адтэрміноўцы выканання пакарання і ўмоўным непрымяненні пакарання выконваюць крымінальна-выканаўчыя інспекцыі па месцы жыхарства асуджанага.

1[1]. Гэта пакаранне, прызначанае ў якасці дадатковага да пакарання ў выглядзе папраўчых работ, ажыццяўляюць крымінальна-выканаўчыя інспекцыі па месцы працы асуджанага.

2. Гэта пакаранне, прызначанае ў якасці дадатковага да пакарання ў выглядзе арышту, абмежавання волі, пазбаўлення волі, выконваюць органы і ўстановы, якія выконваюць асноўнае пакаранне, а пасля адбыцця асноўнага пакарання – крымінальна-выканаўчая інспекцыя па месцы жыхарства асуджанага.

3. Орган або ўстанова, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, вядуць улік асуджаных, кантралююць выкананне асуджанымі прадугледжанай прыгаворам суда забароны займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, правяраюць выкананне прадпісанняў прыгавору адміністрацыяй арганізацый па месцы працы асуджаных, а таксама органамі, правамоцнымі ануляваць дазвол на займанне адпаведным відам дзейнасці, забароненай для асуджанага, арганізуюць і праводзяць выхаваўчую працу з асуджанымі. Парадак арганізацыі і правядзення выхаваўчай працы з асуджанымі да пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

4. Адміністрацыя ўстановы, у якой адбывае асноўнае пакаранне асоба, асуджаная таксама да дадатковага пакарання ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, не можа прыцягваць асуджанага да работ, выкананне якіх яму забаронена.

### Артыкул 32. Абавязкі адміністрацыі арганізацый па выкананні прыгавору

1. Прадпісанні прыгавору аб пазбаўленні права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю абавязковыя для адміністрацыі арганізацыі па месцы працы асуджанага.

2. Адміністрацыя арганізацыі па месцы працы асуджанага абавязана:

1) не пазней за тры дні пасля атрымання копіі або выпіскі з прыгавору суда і паведамлення органа або ўстановы, што выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, вызваліць асуджанага ад пасады або ад займання тым відам дзейнасці, права на занятак якой ён пазбаўлены; унесці ў працоўную кніжку асуджанага запіс аб тым, на якой падставе, на які тэрмін і якія пасады ён пазбаўлены права займаць або якога роду дзейнасцю пазбаўлены права займацца; накіраваць у орган або ўстанову, што выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, паведамленне аб выкананні прадпісанняў прыгавору;

2) падаваць па патрабаванні органа або ўстановы, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, дакументы, звязаныя з выкананнем пакарання;

3) у выпадках змянення або спынення працоўнага дагавора з асуджаным у трохдзённы тэрмін паведаміць аб гэтым у орган або ўстанову, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці;

4) выдаць асобе, якая адбыла пакаранне або вызвалена ад яго ва ўстаноўленым законам парадку, па яе просьбе наўзамен працоўнай кніжкі яе дублікат без унясення ў яе запісу аб пакаранні.

### Артыкул 33. Абавязкі органаў, правамоцных ануляваць дазвол на займанне пэўнай дзейнасцю

1. Прадпісанні прыгавору суда аб пазбаўленні права займацца пэўнай дзейнасцю абавязковыя для органаў, правамоцных ануляваць дазвол на займанне адпаведным відам дзейнасці.

2. Правамоцныя органы не пазней за тры дні пасля атрымання копіі або выпіскі з прыгавору і паведамлення органу або ўстанове, што выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, абавязаны ануляваць дазвол на займанне той дзейнасцю, якая забаронена асуджанаму, забраць адпаведны дакумент, які дае дадзенай асобе права займацца ўказанай дзейнасцю, і накіраваць паведамленне аб гэтым органу або ўстанове, што выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці.

### Артыкул 34. Падлік тэрміну выканання пакарання ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю

1. Тэрмін выканання пакарання ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, прызначанага ў якасці асноўнага пакарання або ў якасці дадатковага да пакарання ў выглядзе папраўчых работ, абмежавання па ваеннай службе, абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, а таксама пры адтэрміноўцы выканання пакарання і ўмоўным непрымяненні пакарання, калі выкананне дадатковага пакарання не адтэрмінавана, лічыцца з моманту ўступлення прыгавору суда ў законную сілу. У тэрмін выканання пакарання не залічваецца час, на працягу якога асуджаны займаў забароненыя для яго пасады або займаўся забароненай для яго дзейнасцю.

2. Пры прызначэнні пакарання ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю ў якасці дадатковага пакарання да арышту, абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, пазбаўлення волі тэрмін выканання дадзенага пакарання лічыцца адпаведна з дня вызвалення асуджанага ад адбывання ўказаных відаў пакарання.

3. У выпадках, указаных у частцы 2 гэтага артыкула, прадпісанні прыгавору аб пазбаўленні права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю распаўсюджваюцца таксама на час адбывання асуджаным арышту, абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, пазбаўлення волі.

### Артыкул 35. Абавязкі асуджаных да пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю

Асуджаныя да пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю абавязаны выконваць прадпісанні прыгавору, прадстаўляць не патрабаванне крымінальна-выканаўчай інспекцыі дакументы, звязаныя з адбываннем указанага пакарання, паведамляць у крымінальна-выканаўчую інспекцыю аб месцы працы, яго змене або аб звальненні з працы, аб змене месца жыхарства.

### Артыкул 36. Адказнасць за невыкананне прыгавору суда аб пазбаўленні права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю

Службовыя асобы, якія не выконваюць прыгавор суда аб пазбаўленні права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, што ўступіў у законную сілу, а таксама асуджаныя, якія ўхіляюцца ад выканання прыгавору, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 7
## ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАПРАЎЧЫХ РАБОТ

### Артыкул 37. Парадак выканання пакарання ў выглядзе папраўчых работ

1. Пакаранне ў выглядзе папраўчых работ адбываецца па месцы працы асуджаных.

2. Асуджаныя да папраўчых работ прыцягваюцца да адбывання пакарання не пазней за пятнаццацідзённы тэрмін з дня паступлення ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю адпаведнага распараджэння суда з копіяй або выпіскай з прыгавору.

3. Крымінальна-выканаўчыя інспекцыі вядуць улік асуджаных, растлумачваюць парадак і ўмовы адбывання пакарання, кантралююць захаванне ўмоў адбывання пакарання асуджанымі і выкананне прадпісанняў прыгавору адміністрацыяй арганізацый, у якіх працуюць асуджаныя, кантралююць правільнасць і своечасовасць вылічэнняў з заработнай платы асуджаных і пералічэнне ўтрыманых сум у адпаведны бюджэт, арганізуюць і праводзяць з асуджанымі выхаваўчую працу, кантралююць паводзіны асуджаных, пры неабходнасці накіроўваюць іх у камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, кіраўніцтва (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта для працаўладкавання, прымаюць рашэнне аб прыводзе асуджаных, якія не з'яўляюцца на іх выклік, праводзяць першапачатковыя мерапрыемствы для вышуку асуджаных, рыхтуюць

і перадаюць у адпаведную службу матэрыялы аб асуджаных, месцазнаходжанне якіх невядома, прымяняюць меры заахвочвання і спагнання, выдаюць пісьмовыя дазволы на спыненне працоўнага дагавора па пагадненні бакоў або яго скасаванне па жаданні асуджанага ў перыяд адбывання пакарання. Парадак арганізацыі і правядзення выхаваўчай працы з асуджанымі да папраўчых работ вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

4. Калі асуджаны да папраўчых работ да моманту ўступлення прыгавору ў законную сілу не працуе, яму прапануецца ўладкавацца на працу на працягу пятнаццаці дзён па ўласным жаданні. Калі асуджаны не ўладкаваўся на працу пасля сканчэння ўказанага тэрміну, ён накіроўваецца ў камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, кіраўніцтва (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта і працаўладкоўваецца імі ў прыярытэтным парадку. У гэтым выпадку асуджаны да папраўчых работ не мае права адмаўляцца ад прапанаванай яму працы па месцы жыхарства.

5. У выпадку ўзнікнення ў перыяд адбывання асуджаным папраўчых работ абставін, прадугледжаных часткай 3 артыкула 52 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, крымінальна-выканаўчая інспекцыя ўносіць у суд прадстаўленне аб вызваленні асуджанага ад далейшага адбывання пакарання або замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем. Асуджаная цяжарная жанчына вызваляецца ад папраўчых работ з дня пачатку водпуску па цяжарнасці і родах.

6. Паводзіны асуджаных да папраўчых работ, якія не дасягнулі васямнаццацігадовага ўзросту, кантралююць таксама інспекцыі па справах непаўналетніх.

**Артыкул 38. Умовы адбывання пакарання ў выглядзе папраўчых работ**

1. Асуджаныя да папраўчых работ знаходзяцца на ўліку ў крымінальна-выканаўчай інспекцыі, а непаўналетнія асуджаныя – і ў інспекцыі па справах непаўналетніх і абавязаны выконваць устаноўлены парадак і ўмовы адбывання дадзенага пакарання.

2. З заробку асуджаных праводзяцца вылічэнні ў даход дзяржавы ў памеры, устаноўленым прыгаворам суда.

3. У перыяд адбывання папраўчых работ асуджаным забараняецца спыняць працоўны дагавор па пагадненні бакоў або скасоўваць яго па жаданні асуджанага без пісьмовага дазволу крымінальна-выканаўчай інспекцыі. Дазвол можа быць выдадзены пасля праверкі падстаў спынення працоўнага дагавора. Адмова ў выдачы дазволу павінна быць матывавана. Рашэнне аб адмове можа быць абскарджана ва ўстаноўленым законам парадку.

4. Асуджаны, які не мае працы, абавязаны працаўладкавацца самастойна або стаць на ўлік у камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, кіраўніцтве (аддзеле) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта на працягу пятнаццаці дзён з дня пакідання ранейшага месца працы. Асуджаны не мае права адмаўляцца ад працы, прапанаванай камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, кіраўніцтвам (аддзелам) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта.

5. Асуджаны абавязаны на працягу пяці дзён паведаміць у крымінальна-выканаўчую інспекцыю аб змяненні месца працы і месца жыхарства.

6. Выключана.

7. Працоўныя і сацыяльныя водпускі, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб працы, даюцца асуджаным на агульных падставах. У выпадку іх давання асуджанаму адміністрацыя арганізацыі абавязана не пазней за тры дні пасля іх давання паведаміць аб гэтым крымінальна-выканаўчай інспекцыі па месцы адбывання асуджаным пакарання.

### Артыкул 39. Падлік тэрміну пакарання ў выглядзе папраўчых работ

1. Тэрмін папраўчых работ вылічаецца гадамі, месяцамі і днямі, на працягу якіх асуджаны працаваў і з яго заробку праводзіліся вылічэнні. Колькасць дзён, адпрацаваных асуджаным, павінна быць не меншай за колькасць рабочых дзён, якія прыпадаюць на кожны месяц устаноўленага судом тэрміну пакарання. Калі асуджаны не адпрацаваў указанай колькасці дзён і адсутнічаюць падставы, устаноўленыя гэтым Кодэксам для заліку неадпрацаваных дзён у тэрмін пакарання, адбыванне папраўчых работ працягваецца да поўнай адпрацоўкі асуджаным прызначанай колькасці працоўных дзён.
2. Пачаткам тэрміну адбывання пакарання з'яўляецца дзень атрымання адміністрацыяй арганізацыі, дзе працуе асуджаны, копіі або выпіскі з прыгавору (прысуду, пастановы) суда і іншых дакументаў з крымінальна-выканаўчай інспекцыі.
3. У тэрмін пакарання не залічваецца час, на працягу якога асуджаны афіцыйна быў прызнаны беспрацоўным.
4. У выпадку захворвання асуджанага на працягу больш чым чатырох месяцаў запар крымінальна-выканаўчая інспекцыя накіроўвае ў суд прадстаўленне аб адтэрміноўцы выканання пакарання ў адпаведнасці з Крымінальна-працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.
5. Тэрмін адбывання пакарання асуджаным, які працуе ў арганізацыі, дзе прымяняецца падсумаваны ўлік рабочага часу, вылічаецца зыходзячы з працягласці працоўнага часу за ўліковы перыяд, які не перавышае ўстаноўленай колькасці працоўных гадзін.
6. У тэрмін адбывання пакарання не залічваюцца:
1) час, на працягу якога асуджаны не працаваў па няўважлівых прычынах;
2) час захворвання, выкліканага алкагольным ап'яненнем або спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў, або дзеяннямі, звязанымі з алкагольным ап'яненнем або спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў;
3) час адбывання адміністрацыйнага спагнання ў выглядзе арышту або папраўчых работ, а таксама ўтрымання пад вартай у якасці меры стрымання па іншай справе ў перыяд адбывання пакарання;
4) час знаходжання ў адпачынку без захавання заработнай платы.

### Артыкул 40. Абавязкі адміністрацыі арганізацый па месцы адбывання асуджанымі папраўчых работ

1. На адміністрацыю арганізацый па месцы адбывання асуджанымі папраўчых работ ускладаюцца правільнае і своечасовае вылічэнне з заробку асуджаных і пералічэнне ва ўстаноўленым парадку ўтрыманых сум у адпаведны бюджэт і штомесячнае прадстаўленне ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю разліковых звестак, кантроль за паводзінамі асуджаных па месцы працы і садзейнічанне крымінальна-выканаўчай інспекцыі ў правядзенні выхаваўчай працы з асуджанымі, захаванне ўмоў адбывання пакарання, прадугледжаных гэтым Кодэксам, паведамленне крымінальна-выканаўчай інспекцыі аб прымененых да асуджаных мерах заахвочвання і спагнання, аб ухіленні іх ад адбывання пакарання, а таксама папярэдняе апавяшчэнне аб пераводзе іх на іншую працу і аб звальненні.
2. Невыкананне пералічаных абавязкаў цягне за сабой адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 41. Парадак правядзення вылічэнняў з заробку асуджаных да папраўчых работ

1. Крымінальна-выканаўчая інспекцыя кантралюе правільнасць і своечасовасць вылічэнняў з заробку асуджаных да папраўчых работ і пералічэннем утрыманых сум у

адпаведны бюджэт. Для такога кантролю крымінальна-выканаўчыя інспекцыі маюць права прыцягваць дзяржаўныя фінансавыя і падатковыя органы.

2. Вылічэнні праводзяцца з заработнай платы па асноўным месцы працы асуджанага за кожны адпрацаваны месяц незалежна ад наяўнасці да яго прэтэнзій па выканаўчых дакументах. Вылічэнні праводзяцца з усёй сумы заробку без выключэння з гэтай сумы падаткаў і іншых выплат.

3. Пры правядзенні вылічэнняў улічваюцца грашовая і натуральная часткі заробку асуджанага.

4. Вылічэнні не праводзяцца з дапамог, якія атрымліваюцца асуджаным у парадку сацыяльнага страхавання і сацыяльнага забеспячэння, з выплат аднаразовага характару, не прадугледжаных сістэмай заработнай платы.

5. Дапамогі па часовай непрацаздольнасці асуджанага вызначаюцца з яго заробку за вылікам утрыманняў у памеры, устаноўленым прыгаворам суда.

6. У выпадку адмены прыгавору суда са спыненнем вядзення па крымінальнай справе асуджанаму вяртаюцца сумы, утрыманыя з яго заработнай платы.

7. Крымінальна-выканаўчая інспекцыя, асуджаны або адміністрацыя арганізацыі па месцы яго працы мае права звяртацца ў суд з хадайніцтвам аб зніжэнні памеру вылічэнняў з заработнай платы асуджанага ў выпадку пагаршэння яго матэрыяльнага становішча.

**Артыкул 42. Меры заахвочвання, якія прымяняюцца да асуджаных да папраўчых работ**

1. За добрыя паводзіны і добрасумленнае стаўленне да працы да асуджаных да папраўчых работ крымінальна-выканаўчыя інспекцыі могуць прымяняць наступныя меры заахвочвання:

1) абвяшчэнне падзякі;

2) датэрміновае зняцце раней накладзенага спагнання.

2. Асуджаныя, да якіх ва ўстаноўленых законам выпадках і парадку могуць быць прыменены замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем або ўмоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання, што цвёрда сталі на шлях выпраўлення або якія даказалі сваё выпраўленне, могуць быць адпаведна прадстаўлены крымінальна-выканаўчай інспекцыяй да замены неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем або да ўмоўна-датэрміновага вызвалення ад пакарання.

**Артыкул 43. Адказнасць асуджаных за парушэнне парадку і ўмоў адбывання папраўчых работ і за злоснае ўхіленне ад іх адбывання**

1. Парушэннем парадку і ўмоў адбывання асуджаным папраўчых работ з'яўляюцца:

1) непаступленне без уважлівых прычын на працу на працягу пятнаццаці дзён з дня звальнення з ранейшага месца працы або ўхіленне ад пастаноўкі на ўлік у камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, кіраўніцтве (аддзеле) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта на працягу пятнаццаці дзён, а таксама адмова ад прапанаванай яму працы без уважлівых прычын;

2) няяўка ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю без уважлівых прычын;

3) прагул (у тым ліку адсутнасць на працы больш за тры гадзіны на працягу працоўнага дня) без уважлівых прычын;

4) з'яўленне на працы ў стане алкагольнага ап'янення або ў стане, выкліканым спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў, а таксама распіванне алкагольных, слабаалкагольных напояў, піва, спажыванне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў на працоўным месцы або ў рабочы час;

5) спыненне працоўнага дагавора па пагадненні бакоў або яго скасаванне па жаданні асуджанага без пісьмовага дазволу крымінальна-выканаўчай інспекцыі.

2. За парушэнне асуджаным да папраўчых работ парадку і ўмоў адбывання пакарання крымінальна-выканаўчая інспекцыя можа скарыстаць да яго наступныя меры спагнання:

1) вымова;

2) устанаўленне на тэрмін да трох месяцаў абавязковай яўкі на рэгістрацыю ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю не менш за два разы на месяц.

3. Адначасова з накладаннем спагнання крымінальна-выканаўчая інспекцыя выносіць асуджанаму афіцыйнае папярэджанне аб крымінальнай адказнасці за злоснае ўхіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе папраўчых работ.

3[1]. Асуджаны лічыцца не маючым спагнанняў, калі на працягу аднаго года з дня накладання апошняга спагнання на яго не было накладзена новае спагнанне.

4.Асобай, якая злосна ўхіляецца ад адбывання пакарання ў выглядзе папраўчых работ, прызнаецца асуджаны, які працягвае парушаць парадак і ўмовы адбывання пакарання пасля абвяшчэння яму афіцыйнага папярэджання, а таксама асуджаны, што знік з месца жыхарства з мэтай ухілення ад адбывання пакарання.

5. Зніклы з месца жыхарства асуджаны, месцазнаходжанне якога невядома, аб'яўляецца ў вышук і можа быць затрыманы з санкцыі пракурора на тэрмін да трыццаці сутак. Затрыманы асуджаны змяшчаецца ў ізалятар часовага ўтрымання тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў. Спагнанне з асуджанага грашовай сумы, зрасходаванай у сувязі з яго вышукам, праводзіцца шляхам здзяйснення выканаўчага надпісу. Памер грашовай сумы, зрасходаванай у сувязі з вышукам асуджанага, вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 8
## ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ АБМЕЖАВАННЯ ВОЛІ

### Артыкул 44. Месцы адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі

1. Асуджаныя да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу адбываюць пакаранне ў папраўчых установах адкрытага тыпу з улікам умоў, неабходных для іх выпраўлення, забеспячэння бяспекі і папярэджання здзяйснення імі злачынстваў. Парадак арганізацыі працы папраўчых устаноў адкрытага тыпу вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

2. Выключана.

2[1]. Асуджаныя да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу адбываюць пакаранне па месцы пастаяннага жыхарства.

3. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы абавязаны садзейнічаць папраўчым установам адкрытага тыпу ў працоўным і бытавым уладкаванні асуджаных, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі.

4. Асуджаныя да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу адбываюць увесь тэрмін пакарання, як правіла, у адной папраўчай установе адкрытага тыпу.

5. Перавод асуджанага для далейшага адбывання пакарання з адной папраўчай установы адкрытага тыпу ў іншую такога ж віду дапускаецца пры рэарганізацыі або ліквідацыі папраўчай установы адкрытага тыпу, для атрымання асуджаным сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі пры ўмове паспяховай здачы ўступных экзаменаў, у сувязі з сямейнымі абставінамі па заяве асуджанага, пры пагрозе асабістай бяспекі асуджанага, а таксама пры іншых выключных абставінах, якія перашкаджаюць далейшаму знаходжанню асуджанага ў дадзенай папраўчай установе адкрытага тыпу. Парадак пераводу асуджаных вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 45. Накіраванне асуджаных да абмежавання волі да месца адбывання пакарання і прыцягненне да адбывання пакарання**

1. Асуджаныя да абмежавання волі з накіраваннем або без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, асуджаныя, пераведзеныя з папраўчых устаноў адкрытага тыпу для адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, а таксама асуджаныя, якім неадбытая частка пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі заменена пакараннем у выглядзе абмежавання волі з накіраваннем або без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, прыбываюць да месца адбывання пакарання самастойна за кошт дзяржавы. З улікам асобы асуджанага да абмежавання волі з адбываннем пакарання ў папраўчай установе адкрытага тыпу, месца размяшчэння папраўчай установы адкрытага тыпу асуджаны можа быць дастаўлены ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу пад канвоем або ў суправаджэнні. Асуджаныя, якім неадбытая частка пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі заменена пакараннем у выглядзе абмежавання волі, вызваляюцца з папраўчых устаноў у дзень паступлення з суда адпаведных дакументаў, а пры дастаўленні пад канвоем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу вызваляюцца з-пад варты з моманту прыбыцця ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

2. Крымінальна-выканаўчая інспекцыя на падставе прыгавору суда ўручае прадпісанне аб выездзе да месца адбывання пакарання асуджаным да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Адміністрацыя папраўчай установы на падставе прысуду (пастановы) суда ўручае прадпісанне аб выездзе да месца адбывання пакарання асуджаным, якім абмежаванне волі з накіраваннем або без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу прызначана ў парадку замены неадбытай часткі пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі больш мяккім пакараннем. Адміністрацыя папраўчай установы адкрытага тыпу на падставе прысуду (пастановы) суда ўручае прадпісанне аб выездзе да месца адбывання пакарання асуджаным, пераведзеным з папраўчых устаноў адкрытага тыпу для адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Асуджаны абавязаны выехаць да месца адбывання пакарання згодна з устаноўленым прадпісаннем маршрутам у дзень атрымання прадпісання папраўчай установы і не пазней за трое сутак з дня атрымання прадпісання крымінальна-выканаўчай інспекцыі. Асуджаны абавязаны прыбыць да месца адбывання пакарання на працягу тэрміну, указанага ў прадпісанні.

3. Асуджаныя да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу прыцягваюцца да адбывання пакарання крымінальна-выканаўчай інспекцыяй не пазней за дзесяцідзённы тэрмін з дня паступлення ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю копіі або выпіскі з прыгавору і пісьмовага распараджэння суда аб выкананні прыгавору. Такія асуджаныя абавязаны прыбыць на выклік крымінальна-выканаўчай інспекцыі для пастаноўкі на ўлік і атрымання пісьмовага паведамлення аб парадку і ўмовах адбывання пакарання.

4. Пры ўхіленні асуджанага ад атрымання прадпісання аб выездзе да месца адбывання пакарання або пры нявыездзе ва ўстаноўлены тэрмін да месца адбывання пакарання асуджаны затрымліваецца тэрытарыяльным органам унутраных спраў з санкцыі пракурора на тэрмін да пятнаццаці сутак для выяўлення прычын няяўкі ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю або нявыезду да месца адбывання пакарання.

5. У выпадку ўхілення асуджанага да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу ад атрымання прадпісання аб выездзе да месца адбывання пакарання або нявыезду да месца адбывання пакарання без уважлівых прычын тэрытарыяльны орган унутраных спраў можа накіраваць асуджанага да месца адбывання пакарання ў парадку, вызначаным Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Зніклы з месца жыхарства асуджаны, месцазнаходжанне якога невядома, аб'яўляецца ў

вышук і можа быць затрыманы з санкцыі пракурора на тэрмін да трыццаці сутак. Затрыманы асуджаны змяшчаецца ў ізалятар часовага ўтрымання тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў. Спагнанне з асуджанага грашовай сумы, зрасходаванай у сувязі з яго вышукам, праводзіцца шляхам здзяйснення выканаўчага надпісу. Памер грашовай сумы, зрасходаванай у сувязі з вышукам асуджанага, вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

5[1]. Асуджаны да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, затрыманы па пастанове начальніка тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў у выпадках, прадугледжаных часткамі 4 і 5 гэтага артыкула, утрымліваецца ў следчым ізалятары.

6. У выпадку нявыезду да месца адбывання пакарання без уважлівых прычын асуджанага, якому неадбытая частка пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі заменена пакараннем у выглядзе абмежавання волі з накіраваннем або без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, або ў выпадку ўхілення ад атрымання прадпісання або нявыезду да месца адбывання пакарання без уважлівых прычын асуджанага, які пераведзены з папраўчай установы адкрытага тыпу для адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, адміністрацыя папраўчай установы накіроўвае ў суд матэрыялы для адмены замены неадбытай часткі пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі пакараннем у выглядзе абмежавання волі з накіраваннем або без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу або пераводу з папраўчай установы адкрытага тыпу для адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

### Артыкул 46. Падлік тэрміну пакарання ў выглядзе абмежавання волі

1. Тэрмін пакарання ў выглядзе абмежавання волі лічыцца з дня пастаноўкі:

1) асуджанага да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу – на ўлік у папраўчай установе адкрытага тыпу;

2) асуджанага да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу – на ўлік у крымінальна-выканаўчай інспекцыі.

2. У тэрмін пакарання залічваюцца час утрымання асуджанага пад вартай у якасці меры стрымання, час знаходжання ў папраўчай установе з дня вынясення судовай пастановы аб замене асуджанаму да пазбаўлення волі неадбытай часткі пакарання пакараннем у выглядзе абмежавання волі і час руху пад канвоем з папраўчай установы ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу пры замене неадбытай часткі пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі абмежаваннем волі з разліку адзін дзень знаходжання пад вартай за два дні абмежавання волі.

3. У тэрмін пакарання не залічваецца час самавольнай адсутнасці асуджанага на працы або па месцы адбывання пакарання больш за адны суткі, а таксама час звыш дазволенага тэрміну выезду, за выключэннем перыяду захворвання.

4. У тэрмін пакарання залічваецца час руху асуджанага з папраўчай установы да месца адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі самастойна па прадпісанні, час руху асуджанага з адной папраўчай установы адкрытага тыпу ў іншую, а таксама час руху асуджанага пад канвоем у выпадку яго затрымання за самавольнае пакіданне месца адбывання пакарання або непрыбыццё да месца адбывання пакарання з разліку адзін дзень за дзень.

### Артыкул 47. Парадак выканання пакарання ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу

1. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы па прадстаўленні органа кіравання ўстановамі, якія выконваюць пакаранне, вызначаюць межы тэрыторыі папраўчай установы адкрытага тыпу.

2. У дачыненні да асуджаных у папраўчых установах адкрытага тыпу дзейнічаюць Правілы ўнутранага распарадку папраўчых устаноў адкрытага тыпу, якія зацвярджае Міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь пасля ўзгаднення з Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь.

3. Асуджаныя, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, знаходзяцца пад наглядам і абавязаны:

1) выконваць Правілы ўнутранага распарадку папраўчых устаноў адкрытага тыпу;

2) працаваць па накіраванні адміністрацыі папраўчай установы адкрытага тыпу, за выключэннем асуджаных, якія маюць пастаяннае месца працы па месцы адбывання пакарання;

3) пастаянна знаходзіцца ў межах тэрыторыі папраўчай установы адкрытага тыпу, не пакідаць яе без дазволу адміністрацыі. Асуджаным да абмежавання волі, а таксама асуджаным, якім абмежаванне волі прызначана ў парадку замены пакарання больш мяккім пакараннем, у неабходных выпадках адміністрацыя папраўчай установы адкрытага тыпу можа дазволіць кароткатэрміновы выезд на тэрмін да пяці сутак за межы тэрыторыі папраўчай установы адкрытага тыпу пасля пастаноўкі іх на ўлік. Час кароткатэрміновага выезду асуджаных залічваецца ў тэрмін адбывання дадзенага пакарання;

4) пражываць, як правіла, у жылых памяшканнях папраўчай установы адкрытага тыпу і не пакідаць папраўчую ўстанову адкрытага тыпу без дазволу адміністрацыі гэтай установы;

5) удзельнічаць без аплаты працы ў работах па добраўпарадкаванні будынкаў і тэрыторыі папраўчай установы адкрытага тыпу ў нерабочы час працягласцю да чатырох гадзін у тыдзень;

6) пастаянна мець пры сабе замест дакумента, які сведчыць асобу, пасведчанне асуджанага, узор і парадак выдачы якога зацвярджае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь;

7) праходзіць па патрабаванні супрацоўнікаў папраўчай установы адкрытага тыпу медыцынскі агляд на прадмет вызначэння стану алкагольнага ап'янення або стану, выкліканага спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў;

8) па пастанове начальніка папраўчай установы адкрытага тыпу пастаянна насіць электронныя сродкі кантролю свайго месца знаходжання, выконваць правілы іх эксплуатацыі;

9) не дапускаць страты, наўмыснага пашкоджання або знішчэння электронных сродкаў кантролю свайго месца знаходжання;

10) неадкладна інфармаваць адміністрацыю папраўчай установы адкрытага тыпу аб страце, пашкоджанні ці знішчэнні або тэхнічных няспраўнасцях электронных сродкаў кантролю свайго месца знаходжання;

11) у выпадку страты, наўмыснага пашкоджання або знішчэння электронных сродкаў кантролю свайго месца знаходжання кампенсаваць урон у парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

4. Папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу падраздзяляюцца на:

1) папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу для асоб, якія раней не адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі;

2) папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі.

5. Асуджаныя жанчыны, якія раней не адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, могуць утрымлівацца з асуджанымі жанчынамі, якія раней адбывалі пакаранне ў

выглядзе пазбаўлення волі, з захаваннем умоў асобнага ўтрымання ў межах адной папраўчай установы адкрытага тыпу.

6. У адной папраўчай установе адкрытага тыпу не могуць адбываць пакаранне асуджаныя, якія здзейснілі злачынства ў саўдзеле.

7. Асуджаным забараняецца набываць, захоўваць і выкарыстоўваць прадметы і рэчывы, пералік якіх устаноўлены Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў адкрытага тыпу. У выпадку выяўлення ў асуджаных такіх прадметаў і рэчываў яны па матываванай пастанове начальніка папраўчай установы адкрытага тыпу канфіскуюцца і перадаюцца на захоўванне, або знішчаюцца, або рэалізуюцца. Рэалізацыя канфіскаваных прадметаў ажыццяўляецца на падставе матываванай пастановы начальніка папраўчай установы адкрытага тыпу, санкцыянаванай пракурорам. Сродкі ад рэалізацыі канфіскаваных прадметаў залічваюцца на рахунак папраўчай установы адкрытага тыпу.

8. Асуджаныя, а таксама памяшканні, у якіх яны пражываюць, могуць падвяргацца вобшуку, а рэчы асуджаных – агляду. Асабісты вобшук праводзяць асобы аднаго полу з асуджанымі. Парадак правядзення вобыску і агляду вызначаецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў адкрытага тыпу.

9. Асуджаным, якія не дапускаюць парушэння Правіл унутранага распарадку папраўчых устаноў адкрытага тыпу і маюць сям'ю, акрамя асоб, абавязаных кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, што знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, асуджаных за злачынствы, прадугледжаныя артыкулам 174 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, і за іншыя злачынствы, здзейсненыя ў перыяд працы ў арганізацыях на падставе судовай пастановы, згодна з пастановай начальніка папраўчай установы адкрытага тыпу, але не раней чым праз чатыры месяцы з дня пастаноўкі асуджанага на ўлік у папраўчай установе адкрытага тыпу можа быць дазволена пражыванне з сям'ёй у жылым памяшканні, якое належыць ім на праве ўласнасці або займаецца імі згодна з дагаворам найму (паднайму) жылога памяшкання. Гэтыя асуджаныя абавязаны з'яўляцца ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу для рэгістрацыі. Перыядычнасць рэгістрацыі вызначаецца пастановай начальніка папраўчай установы адкрытага тыпу. Асуджаныя, якія пражываюць у жылым памяшканні, што належыць ім на праве ўласнасці або займаецца імі паводле дагавора найму (паднайму) жылога памяшкання, абавязаны ў вольны ад працы (навучання) час пастаянна знаходзіцца ў сваім жыллі або на прыдамавой тэрыторыі, не адыходзячы ад жылля далей за адлегласць, вызначаную адміністрацыяй папраўчай установы адкрытага тыпу, а з дзевятнаццаці да шасці гадзін – толькі ў сваім жыллі. Калі рэжым рабочага часу або расклад навучальных заняткаў (заняткаў) асуджанага не дазваляюць яму знаходзіцца ва ўказаны час у сваім жыллі, адміністрацыяй папраўчай установы адкрытага тыпу ўстанаўліваецца іншы час пастаяннага знаходжання асуджанага ў сваім жыллі. Час выхаду асуджанага за межы вызначанай адміністрацыяй папраўчай установы адкрытага тыпу адлегласці ад жылля да месца працы (навучання) устанаўлівае адміністрацыя папраўчай установы адкрытага тыпу на аснове рэжыму рабочага часу або раскладу навучальных заняткаў (заняткаў) і часу, неабходнага на дарогу. Выхад асуджанага за межы ўказанай адлегласці для наведвання арганізацый аховы здароўя, сувязі, гандлю, бытавога абслугоўвання і іншых арганізацый дапускаецца толькі ў межах населенага пункта да дзвюх гадзін на дзень у час, устаноўлены адміністрацыяй папраўчай установы адкрытага тыпу. Такім асуджаным забараняецца наведванне месцаў правядзення фізкультурна-аздараўленчых, спартыўна-масавых, культурных мерапрыемстваў, ігральных устаноў, а таксама гандлёвых аб'ектаў, дзе распіваюць алкагольныя, слабаалкагольныя напоі, піва, жылля іншых асоб. Пастанова начальніка папраўчай установы адкрытага тыпу аб дазволе асуджанаму пражывання з сям'ёй у жылым памяшканні, якое належыць ім на праве ўласнасці або займаецца імі па дагаворы найму ці паднайму жылога памяшкання, у выпадку парушэння асуджаным

парадку і ўмоў адбывання пакарання, прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці за здзяйсненне адміністрацыйнага правапарушэння, асуджэння за здзяйсненне злачынства адмяняецца. Паўторнае даванне асуджаным, якія зрабілі ўказаныя дзеянні, права пражывання па-за папраўчай установай адкрытага тыпу не дапускаецца.

10. Права на адукацыю асуджанымі, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, ажыццяўляецца шляхам атрымання імі асноўнай адукацыі, а таксама дадатковай адукацыі ў завочнай форме атрымання адукацыі, а таксама дадатковай адукацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

11. Супрацоўнікі папраўчай установы адкрытага тыпу пры ажыццяўленні кантролю за захаваннем асуджанымі парадку і ўмоў адбывання пакарання маюць права:

1) патрабаваць ад адміністрацыі арганізацыі, у якой працуе асуджаны, звесткі аб працоўнай дзейнасці асуджанага і захаванні ім працоўнай дысцыпліны, а ад арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка), дзе навучаецца асуджаны, – звесткі аб наведванні навучальных заняткаў (заняткаў) і паводзінах асуджанага;

2) наведваць асуджанага па месцы яго працы, навучання;

3) дастаўляць асуджанага ў арганізацыі аховы здароўя для правядзення медыцынскага агляду на прадмет вызначэння стану алкагольнага ап'янення або стану, выкліканага спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў;

4) выкарыстоўваць электронныя сродкі кантролю за месцам знаходжання асуджанага, пералік якіх вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Парадак прымянення, нашэння і абслугоўвання ўказаных сродкаў устанаўлівае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

12. Асуджаным, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, забараняецца:

1) ужываць алкагольныя, слабаалкагольныя напоі, піва, наркатычныя сродкі, псіхатропныя рэчывы, іх аналагі, таксічныя або іншыя адурманьвальныя рэчывы;

2) наведваць месцы правядзення фізкультурна-аздараўленчых, спартыўна-масавых, культурных мерапрыемстваў без суправаджэння супрацоўнікаў папраўчай установы адкрытага тыпу, ігральныя ўстановы, а таксама гандлёвыя аб'екты, дзе ажыццяўляецца распіванне алкагольных, слабаалкагольных напояў, піва, жылля іншых асоб. Адміністрацыяй папраўчай установы адкрытага тыпу можа быць дазволена наведванне жылля блізкіх сваякоў у вольны ад працы час або ў выхадны дзень на чатыры гадзіны;

3) адмаўляцца ад працы па накіраванні адміністрацыі папраўчай установы адкрытага тыпу, за выключэннем асуджаных, якія маюць пастаяннае месца працы па месцы адбывання пакарання;

4) спыняць працоўны дагавор па пагадненні бакоў або скасоўваць яго па жаданні асуджанага без пісьмовага дазволу адміністрацыі папраўчай установы адкрытага тыпу.

### Артыкул 48. Матэрыяльна-бытавое забеспячэнне асуджаных да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу

1. Асуджаным да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу забяспечваюцца неабходныя жыллёва-бытавыя ўмовы.

2. Асуджаныя размяшчаюцца ў жылых памяшканнях папраўчых устаноў адкрытага тыпу, дзе ім даюцца індывідуальнае спальнае месца і пасцельныя рэчы.

$2^1$. Норма жылой плошчы на аднаго асуджанага ў папраўчай установе адкрытага тыпу не можа быць меншай за тры квадратныя метры. Асуджаныя штомесяц кампенсуюць кошт

камунальных паслуг зыходзячы з фактычнага спажывання гэтых паслуг у натуральным выяўленні на падставе даных індывідуальных або групавых прыбораў уліку, а пры іх адсутнасці – на падставе норм (нарматываў) спажывання, якія ўстанаўліваюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, а таксама тарыфаў на камунальныя паслугі для насельніцтва, якія ўстанаўліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, у парадку, устаноўленым Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

3. Асуджаныя набываюць адзенне, бялізну і абутак самастойна за кошт уласных сродкаў. Пры адсутнасці ў асуджаных уласных сродкаў адміністрацыя папраўчай установы адкрытага тыпу можа аказаць ім дапамогу.

4. Харчаванне асуджаных арганізуецца адміністрацыяй папраўчых устаноў адкрытага тыпу і аплачваецца асуджанымі за кошт уласных сродкаў. Пры адсутнасці ў асуджаных уласных сродкаў іх харчаванне забяспечваецца за кошт дзяржавы з наступным пакрыццём яго кошту асуджанымі.

5. Асуджаныя, якія адбываюць пакаранне ў папраўчых установах адкрытага тыпу, маюць права мець пры сабе грашовыя сродкі і выкарыстоўваць іх, а таксама набываць, захоўваць і выкарыстоўваць прадметы, вырабы і рэчывы, за выключэннем тых, якія забаронены Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў адкрытага тыпу.

**Артыкул 48[1]. Парадак выканання пакарання ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу**

1. Супрацоўнікі крымінальна-выканаўчай інспекцыі і ўпаўнаважаныя супрацоўнікі іншых службаў тэрытарыяльных органаў унутраных спраў пры ажыццяўленні кантролю за захаваннем асуджанымі да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу парадку і ўмоў адбывання пакарання маюць права:

1) патрабаваць ад адміністрацыі арганізацыі, у якой працуе асуджаны, звесткі аб працоўнай дзейнасці асуджанага і захаванні ім працоўнай дысцыпліны, а ад арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка), дзе навучаецца асуджаны, – звесткі аб наведванні навучальных заняткаў (заняткаў) і паводзінах асуджанага;

2) выклікаць асуджанага для правядзення размоў, наведвання выхаваўчых мерапрыемстваў і патрабаваць ад яго пісьмовыя тлумачэнні аб пытаннях, звязаных з адбываннем пакарання;

3) уваходзіць у любы час сутак у жыллё асуджанага;

4) наведваць асуджанага па месцы яго працы, навучання;

5) дастаўляць асуджанага ў арганізацыі аховы здароўя для правядзення медыцынскага агляду на прадмет вызначэння стану алкагольнага ап'янення або стану, выкліканага спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў;

6) затрымліваць асуджанага ў выпадку парушэння ім парадку і ўмоў адбывання пакарання ў адпаведнасці з часткай 3 артыкула 57 гэтага Кодэкса;

7) выдаваць асуджанаму, які мяняе месца жыхарства, прадпісанне з ускладаннем абавязку стаць на ўлік у тэрытарыяльным органе ўнутраных спраў па новым месцы жыхарства;

8) выкарыстоўваць электронныя сродкі кантролю за месцам знаходжання асуджанага, пералік якіх вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Парадак прымянення, нашэння і абслугоўвання ўказаных сродкаў устанаўлівае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

2. Асуджаны да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу абавязаны:

1) прыбыць на выклік крымінальна-выканаўчай інспекцыі для пастаноўкі на ўлік або прыбыць ва ўказаны ў прадпісанні тэрмін да выбранага месца жыхарства і стаць на ўлік у крымінальна-выканаўчай інспекцыі;
2) з'яўляцца ў тэрытарыяльны орган унутраных спраў для рэгістрацыі, перыядычнасць і час якой устанаўліваюцца крымінальна-выканаўчай інспекцыяй з улікам магчымасці асуджанага да перамяшчэння зыходзячы са стану яго здароўя і ўзросту. Перыядычнасць рэгістрацыі не можа перавышаць чатыры разы на месяц;
3) з'яўляцца па выкліку ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю і іншыя службы тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў для правядзення размоў, наведвання выхаваўчых мерапрыемстваў, а таксама дачы пісьмовых тлумачэнняў па пытаннях, звязаных з адбываннем пакарання;
4) праходзіць па патрабаванні супрацоўнікаў тэрытарыяльных органаў унутраных спраў медыцынскі агляд на прадмет вызначэння стану алкагольнага ап'янення або стану, выкліканага спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў;
5) паведамляць крымінальна-выканаўчай інспекцыі аб паступленні на працу, навучанне і аб змяненні месца працы, навучання;
6) прыбыць у крымінальна-выканаўчую інспекцыю і паведаміць ёй аб змяненні месца жыхарства не менш за тры дні да яго ажыццяўлення;
7) выязджаць для атрымання адукацыі ў завочнай форме атрымання адукацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у іншы населены пункт Рэспублікі Беларусь пасля прадстаўлення ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю выкліку (даведкі-выкліку) арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка), дзе навучаецца асуджаны, а ва ўсіх астатніх выпадках – з дазволу крымінальна-выканаўчай інспекцыі;
8) у вольны ад працы, навучання час пастаянна знаходзіцца ў сваім жыллі або на прыдамавой тэрыторыі, не адыходзячы ад жылля далей за адлегласць, вызначаную крымінальна-выканаўчай інспекцыяй, а з дзевятнаццаці да шасці гадзін – у сваім жыллі. Калі рэжым рабочага часу або расклад навучальных заняткаў (заняткаў) асуджанага не дазваляюць яму знаходзіцца ва ўказаны час у сваім жыллі, крымінальна-выканаўчая інспекцыя вызначае іншы час пастаяннага знаходжання асуджанага ў сваім жыллі;
9) даваць магчымасць беспярашкоднага ўваходу ў сваё жыллё супрацоўнікам крымінальна-выканаўчай інспекцыі і ўпаўнаважаным супрацоўнікам іншых службаў тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў у мэтах кантролю за захаваннем парадку і ўмоў адбывання пакарання;
10) мець пастаяннае месца працы, уключаючы надомную працу, або займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, калі асуджаны падлягае абавязковаму прыцягненню да працы;
11) згодна з пастановай начальніка тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў пастаянна насіць электронныя сродкі кантролю свайго месца знаходжання, выконваць правілы іх эксплуатацыі, з'яўляцца на выклік крымінальна-выканаўчай інспекцыі або службовых асоб тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў, якія ажыццяўляюць электронны кантроль, для тэхнічнага абслугоўвання гэтых сродкаў;
12) ажыццяўляць тэлефонную сувязь з тэрытарыяльным органам унутраных спраў, у тым ліку пры выкарыстанні электронных сродкаў кантролю свайго месца знаходжання, у парадку, вызначаным Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь;
13) не дапускаць згубы, наўмыснага пашкоджання або знішчэння электронных сродкаў кантролю свайго месца знаходжання;
14) неадкладна інфармаваць тэрытарыяльны орган унутраных спраў аб згубе, пашкоджанні ці знішчэнні або тэхнічных няспраўнасцях электронных сродкаў кантролю свайго месца знаходжання;

15) у выпадку згубы, наўмыснага пашкоджання або знішчэння электронных сродкаў кантролю свайго месца знаходжання кампенсаваць урон у парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

16) зарэгістравацца ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, кіраўніцтве (аддзеле) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта на працягу пятнаццаці дзён з дня атрымання прадпісання аб накіраванні ў орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

3. Час выхаду асуджанага за межы адлегласці ад жылля, вызначанай крымінальна-выканаўчай інспекцыяй, да месца працы, навучання ўстанаўліваецца крымінальна-выканаўчай інспекцыяй на аснове рэжыму рабочага часу або раскладу навучальных заняткаў (заняткаў) і часу, неабходнага на дарогу. Выхад асуджанага за межы ўказанай адлегласці для наведвання арганізацый аховы здароўя, сувязі, гандлю, бытавога абслугоўвання і іншых арганізацый дапускаецца толькі ў межах населенага пункта да дзвюх гадзін у дзень у час, прызначаны крымінальна-выканаўчай інспекцыяй. Выхад без уважлівых прычын за межы адлегласці ад жылля, вызначанай крымінальна-выканаўчай інспекцыяй, у выхадныя, дзяржаўныя святы і святочныя дні, устаноўленыя і аб'яўленыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь нерабочымі, асуджанаму забаронены. Выбыццё за межы населенага пункта можа быць дазволена асуджанаму ў дзённы час для правядзення гаспадарчых і іншых работ. Па хадайніцтве наймальніка, у якога працуе асуджаны, крымінальна-выканаўчай інспекцыяй асуджанаму можа быць дазволены выезд у службовую камандзіроўку ў межах тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з ускладаннем на яго абавязку зарэгістравацца ў тэрытарыяльным органе ўнутраных спраў па месцы знаходжання. У іншых выпадках крымінальна-выканаўчая інспекцыя можа дазволіць асуджанаму выезд у іншы населены пункт у межах тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з ускладаннем на яго абавязку зарэгістравацца ў тэрытарыяльным органе ўнутраных спраў па месцы знаходжання пры выездзе на тэрмін, большы за двое сутак. Асуджаны, які атрымлівае адукацыю ў завочнай форме атрымання адукацыі ў іншым населеным пункце Рэспублікі Беларусь, выязджае для ўдзелу ў навучальных занятках, экзаменацыйнай сесіі пасля прадстаўлення ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю выкліку (даведкі-выкліку) арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка), дзе навучаецца асуджаны.

4. Асуджаны да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, які падлягае абавязковаму прыцягненню да працы і да моманту пачатку выканання пакарання не мае пастаяннага месца працы, абавязаны на працягу пятнаццаці дзён працаўладкавацца самастойна. Калі асуджаны не ўладкаваўся на працу пасля сканчэння ўказанага тэрміну, ён накіроўваецца крымінальна-выканаўчай інспекцыяй у камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, кіраўніцтва (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта для арганізацыі яго працаўладкавання.

5. Асуджаным, які адбываюць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, забараняецца:

1) спажываць алкагольныя, слабаалкагольныя напоі, піва, наркатычныя сродкі, псіхатропныя рэчывы, іх аналагі, таксічныя або іншыя адурманьвальныя рэчывы;

2) наведваць месцы правядзення фізкультурна-аздараўленчых, спартыўна-масавых, культурных мерапрыемстваў, ігральныя ўстановы, гандлёвыя аб'екты, дзе ажыццяўляецца распіванне алкагольных, слабаалкагольных напояў, піва, а таксама жылля іншых асоб. Крымінальна-выканаўчай інспекцыяй можа быць дазволена наведванне жылля блізкіх сваякоў;

3) спыняць працоўны дагавор па пагадненні бакоў або скасоўваць яго па жаданні асуджанага без пісьмовага дазволу крымінальна-выканаўчай інспекцыі, калі асуджаны падлягае абавязковаму прыцягненню да працы;

4) адмаўляцца ад працы, прапанаванай камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, кіраўніцтвам (аддзелам) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта;
5) рабіць самастойнае зняцце, перамяшчэнне электронных сродкаў кантролю свайго месца знаходжання або выконваць іншыя дзеянні, накіраваныя на наўмысную перашкоду іх працы.

**Артыкул 49. Медыка-санітарнае забеспячэнне асуджаных да абмежавання волі**

1. Медыцынская і санітарна-эпідэміялагічная дапамога асуджаным да абмежавання волі аказваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.
2. Аказанне медыцынскай дапамогі асуджаным да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу ажыццяўляецца арганізацыямі аховы здароўя па месцы знаходжання папраўчых устаноў адкрытага тыпу, а асуджаным да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу – па месцы пастаяннага жыхарства або працы асуджаных у парадку, установленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб ахове здароўя.
3. Адміністрацыя папраўчых устаноў адкрытага тыпу нясе адказнасць за выкананне ўстаноўленых санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў у папраўчых установах адкрытага тыпу.
4. Адміністрацыя папраўчых устаноў адкрытага тыпу абавязана арганізаваць правядзенне медыцынскіх аглядаў асуджаных да абмежавання волі, якія прыцягваюцца да працы, калі гэта неабходна для выканання адпаведных відаў работ.

**Артыкул 50. Умовы працы асуджаных да абмежавання волі**

1. Асуджаныя да абмежавання волі прыцягваюцца да працы ў арганізацыях незалежна ад форм уласнасці, а таксама ў індывідуальных прадпрымальнікаў.
2. Праца асуджаных рэгулюецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб працы і аб ахове працы, за выключэннем правіл прыёму на працу, звальнення з працы, пераводу на іншую працу. Час працы ў перыяд адбывання дадзенага пакарання залічваецца ў працоўны стаж у парадку, установленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.
3. Перавод асуджанага на іншую працу, у тым ліку ў іншую мясцовасць, можа ажыццяўляцца адміністрацыяй арганізацыі, у якой працуе асуджаны, і індывідуальным прадпрымальнікам, у якога працуе асуджаны, па ўзгадненні:
1) з адміністрацыяй папраўчай установы адкрытага тыпу – у дачыненні да асуджанага да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу;
2) з крымінальна-выканаўчай інспекцыяй – у дачыненні да асуджанага да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.
4. Асуджаным да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, якія не маюць неабходнай спецыяльнасці для выканання работ па месцы адбывання пакарання, адміністрацыя папраўчай установы адкрытага тыпу садзейнічае яе набыццю.

**Артыкул 51. Абавязкі органаў і ўстаноў, якія выконваюць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі**

1. Адміністрацыя папраўчай установы адкрытага тыпу вядзе ўлік асуджаных да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, растлумачвае парадак і ўмовы адбывання пакарання, арганізуе працоўны і бытавы лад асуджаных, забяспечвае захаванне парадку і ўмоў адбывання пакарання, ажыццяўляе нагляд за асуджанымі і прымае меры для папярэджання парушэння ўстаноўленага парадку адбывання пакарання, арганізуе і праводзіць з асуджанымі выхаваўчую працу, прымяняе ўстаноўленыя законам меры заахвочвання і спагнання, рыхтуе асуджаных да вызвалення,

праводзіць першапачатковыя мерапрыемствы для вышуку асуджаных, абвяшчае іх у вышук.

1[1]. Крымінальна-выканаўчая інспекцыя вядзе ўлік і асабістыя справы асуджаных да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, уручае пісьмовае паведамленне аб парадку і ўмовах адбывання пакарання, з удзелам упаўнаважаных супрацоўнікаў іншых службаў тэрытарыяльных органаў унутраных спраў кантралюе захаванне парадку і ўмоў адбывання пакарання асуджанымі, арганізуе і праводзіць з асуджанымі выхаваўчую працу, пры неабходнасці накіроўвае іх у камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, кіраўніцтва (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта для садзейнічання ў працаўладкаванні, прымае рашэнне аб прымусовым прыводзе асуджаных, якія не з'яўляюцца на яе выклік, праводзіць першапачатковыя мерапрыемствы для вышуку асуджаных, рыхтуе і перадае ў адпаведную службу тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў матэрыялы аб асуджаных, месца знаходжання якіх невядома, прымяняе ўстаноўленыя законам меры заахвочвання і спагнання.

2. Парадак выканання ўказаных абавязкаў вызначаецца гэтым Кодэксам, а таксама іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 52. Абавязкі адміністрацыі арганізацый, у якіх працуюць асуджаныя да абмежавання волі, і індывідуальных прадпрымальнікаў, у якіх працуюць асуджаныя да абмежавання волі**

1. Адміністрацыя арганізацый, у якіх працуюць асуджаныя да абмежавання волі, і індывідуальныя прадпрымальнікі, у якіх працуюць асуджаныя да абмежавання волі, забяспечваюць прыцягненне іх да працы з улікам стану здароўя і па магчымасці спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці, спецыялізацыі, прафесіі) і прысвоенай кваліфікацыі, арганізуюць іх прафесійную падрыхтоўку, удзельнічаюць у стварэнні неабходных жыллёва-бытавых умоў.

2. Адміністрацыі арганізацый, у якіх працуюць асуджаныя да абмежавання волі, і індывідуальным прадпрымальнікам, у якіх працуюць асуджаныя да абмежавання волі, забараняецца звальняць іх з працы, акрамя выпадкаў:

1) вызвалення ад адбывання пакарання на падставах, устаноўленых Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь;

2) пераводу асуджанага на працу ў іншую арганізацыю, да іншага індывідуальнага прадпрымальніка;

2[1]) пераводу асуджанага да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу для адбывання пакарання ў іншую папраўчую ўстанову адкрытага тыпу або для адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу;

3) уступлення ў законную сілу прыгавору суда, якім асоба, што адбывае пакаранне ў выглядзе абмежавання волі, асуджана да пазбаўлення волі;

4) немагчымасці выканання дадзенай працы з-за стану здароўя.

**Артыкул 53. Выхаваўчая праца з асуджанымі да абмежавання волі**

1. З асуджанымі да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу і без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу праводзіцца выхаваўчая праца адпаведна адміністрацыяй папраўчай установы адкрытага тыпу і крымінальна-выканаўчай інспекцыяй з удзелам арганізацыі (індывідуальнага прадпрымальніка), дзе працуюць або навучаюцца асуджаныя. Выхаваўчая праца з асуджанымі да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу праводзіцца ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 104–108 і 116 гэтага Кодэкса, з улікам асаблівасцей адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі.

2. Актыўны ўдзел асуджаных у праведзеных мерапрыемствах выхаваўчага характару падтрымліваецца і ўлічваецца пры вызначэнні ступені іх выпраўлення.

3. Парадак арганізацыі і правядзення выхаваўчай працы з асуджанымі да абмежавання волі вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 54. Меры заахвочвання, якія прымяняюцца да асуджаных да абмежавання волі**

1. За належнае захаванне парадку і ўмоў адбывання пакарання да асуджаных да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу могуць быць прыменены наступныя меры заахвочвання:

1) абвяшчэнне падзякі;

2) дазвол на правядзенне выхадных, дзяржаўных свят і святочных дзён, устаноўленых і аб'яўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь нерабочымі, з выездам за межы папраўчай установы адкрытага тыпу;

3) дазвол на правядзенне водпуску або яго часткі з выездам за межы папраўчай установы адкрытага тыпу;

4) датэрміновае зняцце раней накладзенага спагнання.

1[1]. За належнае захаванне парадку і ўмоў адбывання пакарання да асуджаных да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу могуць быць прыменены наступныя меры заахвочвання:

1) абвяшчэнне падзякі;

2) дазвол на перыяд да двух месяцаў у выхадныя, дзяржаўныя святы і святочныя дні, устаноўленыя і аб'яўленыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь нерабочымі, пакідаць жыллё ў дзённы час са знаходжаннем у межах населенага пункта па месцы жыхарства;

3) дазвол на перыяд да двух месяцаў у выхадныя, дзяржаўныя святы і святочныя дні, устаноўленыя і аб'яўленыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь нерабочымі, пакідаць жыллё са знаходжаннем у межах тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

4) датэрміновае зняцце раней накладзенага спагнання.

1[2]. Асуджаныя да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, якія цвёрда сталі на шлях выпраўлення і маюць пастаяннае месца жыхарства, могуць быць пераведзены па пастанове (прысудзе) суда для адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

2. Асуджаныя да абмежавання волі могуць быць прадстаўлены ва ўстаноўленых законам выпадках і парадку да ўмоўна-датэрміновага вызвалення ад пакарання або замены неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем.

**Артыкул 55. Адказнасць асуджаных за парушэнне парадку і ўмоў адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі і за ўхіленне ад адбывання гэтага пакарання**

1. Парушэннямі парадку і ўмоў адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу з'яўляюцца невыкананне асуджаным ускладзеных на яго абавязкаў, невыкананне Правіл унутранага распарадку папраўчых установ адкрытага тыпу, парушэнне ўстаноўленых забарон, працоўнай дысцыпліны, грамадскага парадку.

1[1]. Парушэннямі парадку і ўмоў адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу з'яўляюцца невыкананне асуджаным ускладзеных на яго абавязкаў, парушэнне забарон, указаных у частцы 5 артыкула 48[1] гэтага Кодэкса, працоўнай дысцыпліны і грамадскага парадку.

2. Да асуджаных да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, якія парушаюць парадак і ўмовы адбывання пакарання, могуць быць прыменены наступныя меры спагнання:

1) пазачарговае дзяжурства па прыбіранні і добраўпарадкаванні папраўчай установы адкрытага тыпу;
2) вымова;
3) дысцыплінарная ізаляцыя на тэрмін да дзесяці сутак з выхадам або без выхаду на працу (навучанне).
3. Да асуджаных да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, якія парушаюць парадак і ўмовы адбывання пакарання, могуць быць прыменены наступныя меры спагнання:
1) вымова;
2) пазбаўленне дазволу, дадзенага ў парадку заахвочвання, пакідаць жыллё ў выхадныя, дзяржаўныя святы і святочныя дні, устаноўленыя і аб'яўленыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь нерабочымі;
3) дысцыплінарная ізаляцыя на тэрмін да пятнаццаці сутак з выхадам або без выхаду на працу (навучанне).
4. Дысцыплінарная ізаляцыя заключаецца ва ўтрыманні асуджанага:
1) да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу – у штрафным ізалятары папраўчай установы адкрытага тыпу або ў ізалятары часовага ўтрымання тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў па месцы размяшчэння папраўчай установы адкрытага тыпу на ўмовах утрымання ў штрафным ізалятары папраўчай установы адкрытага тыпу;
2) да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу – у ізалятары часовага ўтрымання тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў па месцы жыхарства асуджанага на ўмовах утрыманняі ў штрафным ізалятары папраўчай установы адкрытага тыпу.
4[1]. Кошт харчавання, якое даецца асуджаным, змешчаным у ізалятар часовага ўтрымання тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў у парадку дысцыплінарнай ізаляцыі, аплачваецца асуджанымі паводле фактычных выдаткаў у поўным памеры ў парадку, устаноўленым Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.
5. Лічыцца, што асуджаны злосна парушае парадак і ўмовы адбывання пакарання, калі ён мае не менш за тры спагнанні за парушэнне парадку і ўмоў адбывання пакарання. Асуджанаму, які дапусціў злоснае парушэнне парадку і ўмоў адбывання пакарання, выносіцца афіцыйнае папярэджанне аб крымінальнай адказнасці за ўхіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі.
6. Ухіленнем ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі з'яўляюцца:
1) непрыбыццё або невяртанне ва ўстаноўлены тэрмін асуджанага да месца адбывання пакарання без уважлівых прычын або яго самавольнае пакіданне з мэтай ухілення ад адбывання пакарання;
2) парушэнне асуджаным парадку і ўмоў адбывання дадзенага пакарання пасля вынясення афіцыйнага папярэджання;
3) адмова ад нашэння электронных сродкаў кантролю свайго месца знаходжання або іх наўмыснае пашкоджанне ці знішчэнне ў мэтах ухілення ад адбывання пакарання.
7. Пры непрыбыцці або невяртанні ва ўстаноўлены тэрмін асуджанага да месца адбывання пакарання, а таксама ў выпадку самавольнага пакідання месца адбывання пакарання ў дачыненні да асуджанага праводзяцца першапачатковыя мерапрыемствы па вышуку, ён аб'яўляецца ў вышук і падлягае затрыманню.
8. Пры затрыманні асуджанага да абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу ён накіроўваецца да месца адбывання пакарання ў парадку, устаноўленым Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.
8[1]. Асуджаны, затрыманы ў выпадках, прадугледжаных часткамі 7 і 8 гэтага артыкула, утрымліваецца ў следчым ізалятары.

9. Пры наяўнасці даных аб ухіленні асуджанага ад адбывання пакарання адміністрацыя папраўчай установы адкрытага тыпу, крымінальна-выканаўчая інспекцыя накіроўваюць у орган папярэдняга следства матэрыялы для ажыццяўлення крымінальнага пераследавання.

10. Затрыманне асуджанага ў выпадках, прадугледжаных часткай 7 гэтага артыкула, праводзіцца тэрытарыяльнымі органамі ўнутраных спраў або адміністрацыяй папраўчай установы адкрытага тыпу з санкцыі пракурора на тэрмін, не больш за трыццаць сутак. Спагнанне з асуджанага грашовай сумы, зрасходаванай у сувязі з яго вышукам, праводзіцца шляхам здзяйснення выканаўчага надпісу. Памер грашовай сумы, зрасходаванай у сувязі з вышукам асуджанага, вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 56. Прымяненне мер заахвочвання і спагнання да асуджаных да абмежавання волі**

1. Заахвочванні і спагнанні, што прымяняюцца да асуджаных да абмежавання волі, абвяшчаюцца пастановамі службовых асоб, якія маюць права на іх прымяненне.

2. Прымяняць меры заахвочвання і спагнання, прадугледжаныя гэтым Кодэксам, у поўным аб'ёме маюць права:

1) начальнік папраўчай установы адкрытага тыпу – у дачыненні да асуджаных да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу;

2) начальнік тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў – у дачыненні да асуджаных да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

3. Прымяняць меры заахвочвання ў поўным аб'ёме і меры спагнання, указаныя ў пунктах 1 і 2 часткі 3 артыкула 55 гэтага Кодэкса, маюць права намеснік начальніка тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў, начальнік крымінальна-выканаўчай інспекцыі.

4. Пры прымяненні мер спагнання ўлічваюцца абставіны здзяйснення парушэння, асабістыя якасці і папярэднія паводзіны асуджанага. Накладзенае спагнанне павінна адпавядаць цяжару здзейсненага парушэння. Спагнанне на асуджаных да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу накладаецца не пазней за дзесяць сутак з дня выяўлення парушэння, а калі ў сувязі з парушэннем праводзілася праверка, – з дня яе заканчэння, але не пазней за тры месяцы з дня здзяйснення парушэння. Пры здзяйсненні асуджаным парушэння, звязанага з самавольнай адсутнасцю ў папраўчай установе адкрытага тыпу, спагнанне накладаецца не пазней за дзесяць сутак з дня прыбыцця або дастаўлення асуджанага ва ўстанову, у тым ліку з улікам часу, затрачанага на правядзенне праверкі. На асуджаных да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу спагнанне накладаецца не пазней за трыццаць сутак з дня выяўлення парушэння, а пры здзяйсненні асуджаным да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу парушэння, звязанага з самавольнай адсутнасцю па месцы жыхарства, – у дзень яўкі або дастаўлення асуджанага ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю.

5. Асуджаны да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу лічыцца падвергнутым спагнанню з моманту вынясення пастановы аб яго накладанні. Пры гэтым асуджаны павінен быць азнаёмлены пад подпіс з такой пастановай на працягу трох сутак пасля яе вынясення. Асуджаны, які пасля вынясення пастановы аб накладанні спагнання самавольна пакінуў месца жыхарства, павінен быць азнаёмлены пад подпіс з такой пастановай на працягу трох сутак пасля яго яўкі або дастаўлення ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю. Калі на працягу ўстаноўленага часу асуджаны не азнаёмлены з пастановай аб накладанні спагнання, асуджаны лічыцца не падвергнутым спагнанню. Аб адмове асуджанага азнаёміцца з пастановай аб накладанні спагнання складаецца акт.

6. Асуджаны да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу лічыцца падвергнутым спагнанню з моманту вынясення пастановы аб яго накладанні.

Пры гэтым асуджаны павінен быць азнаёмлены пад подпіс з такой пастановай на працягу трох сутак пасля яе вынясення. Асуджаны, які пасля вынясення пастановы аб накладанні спагнання самавольна пакінуў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, павінен быць азнаёмлены пад подпіс з такой пастановай на працягу трох сутак пасля яго прыбыцця або дастаўлення ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Калі на працягу ўстаноўленага часу асуджаны не азнаёмлены з пастановай аб накладанні спагнання, асуджаны лічыцца не падвергнутым спагнанню. Аб адмове асуджанага азнаёміцца з пастановай аб накладанні спагнання складаецца акт.

7. У выпадку, калі ў дачыненні да асуджанага, які парушыў устаноўлены парадак і ўмовы адбывання пакарання, задачы выхаваўчай працы могуць быць дасягнуты без прымянення меры спагнання, начальнік папраўчай установы адкрытага тыпу мае права вынесці вуснае папярэджанне аб недапушчальнасці парушэння ўстаноўленага парадку і ўмоў адбывання пакарання. У выпадку, калі пасля вынясення вуснага папярэджання асуджаны зноў дапусціў парушэнне ўстаноўленага парадку і ўмоў адбывання пакарання, у дачыненні да яго прымяняюцца меры спагнання ў парадку, устаноўленым часткай 4 гэтага артыкула. Не дапускаецца вынясенне вуснага папярэджання пасля афіцыйнага папярэджання аб крымінальнай адказнасці за ўхіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі.

8. Датэрміновае зняцце накладзенага спагнання дапускаецца, як правіла, не раней чым:

1) праз адзін месяц з дня накладання спагнанняў, указаных у пункце 1 часткі 2 і пунктах 1 і 2 часткі 3 артыкула 55 гэтага Кодэкса;

2) праз тры месяцы з дня накладання спагнання, указанага ў пункце 2 часткі 2 артыкула 55 гэтага Кодэкса, або з дня адбыцця мер спагнання, указаных у пункце 3 часткі 2 і пункце 3 часткі 3 артыкула 55 гэтага Кодэкса.

9. Меры заахвочвання, за выключэннем заахвочвання ў выглядзе датэрміновага зняцця раней накладзенага спагнання, прымяняюцца, калі асуджаны не мае спагнанняў.

10. Датэрміновае зняцце раней накладзеных спагнанняў ажыццяўляецца па чарзе, пачынаючы з першага непагашанага спагнання. Датэрмінова здымаць спагнанні з асуджанага маюць права службовыя асобы, якія наклалі спагнанні, а таксама вышэйстаячыя службовыя асобы.

11. Асуджаны лічыцца не маючым спагнанняў, калі на працягу аднаго года з дня накладання апошняга спагнання ён не быў падвергнуты новаму спагнанню. У выпадку, калі асуджаны самавольна пакінуў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу або месца жыхарства, дадзены тэрмін прыпыняецца да дня яго прыбыцця, яўкі або дастаўлення адпаведна ў такую ўстанову або крымінальна-выканаўчую інспекцыю.

12. Спагнанні, накладзеныя з парушэннем патрабаванняў гэтага Кодэкса, падлягаюць адмене пастановай начальніка папраўчай установы адкрытага тыпу, начальніка тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў.

13. Меры заахвочвання, прадугледжаныя пунктамі 2 і 3 часткі 1 артыкула 54 гэтага Кодэкса, выконваюцца згодна з пісьмовай заявай асуджанага, пададзенай на імя начальніка папраўчай установы адкрытага тыпу.

### Артыкул 57. Нагляд за асуджанымі да абмежавання волі і меры папярэджання парушэнняў устаноўленага парадку адбывання гэтага пакарання

1. Нагляд за асуджанымі да абмежавання волі зводзіцца да кантролю за імі па месцы іх жыхарства, працы (навучання). Нагляд за асуджанымі, якія адбываюць пакаранне з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, ажыццяўляе адміністрацыя гэтай установы ва ўзаемадзеянні з тэрытарыяльнымі органамі ўнутраных спраў, а за асуджанымі да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу – крымінальна-выканаўчая інспекцыя і ўпаўнаважаныя супрацоўнікі іншых службаў

тэрытарыяльных органаў унутраных спраў. Парадак ажыццяўлення нагляду за асуджанымі да абмежавання волі з накіраваннем і без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

2. У выпадку парушэння асуджаным да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу парадку і ўмоў адбывання пакарання і неабходнасці папярэджання здзяйснення ім іншых правапарушэнняў па пастанове дзяжурнага памочніка начальніка папраўчай установы адкрытага тыпу ён можа быць змешчаны не больш чым на дваццаць чатыры гадзіны ў штрафны ізалятар папраўчай установы адкрытага тыпу, а пры адсутнасці ва ўстанове штрафнога ізалятара – у ізалятар часовага ўтрымання тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў па месцы знаходжання папраўчай установы адкрытага тыпу да вырашэння пытання аб прымяненні да яго меры спагнання.

$2^1$. У выпадку намеру асуджанага прынесці шкоду ўласнаму жыццю і (або) здароўю або жыццю і (або) здароўю іншых грамадзян і немагчымасці змяшчэння асуджанага ў штрафны ізалятар папраўчай установы адкрытага тыпу або ў ізалятар часовага ўтрымання тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў ён па пастанове дзяжурнага памочніка начальніка папраўчай установы адкрытага тыпу можа быць змешчаны ў спецыяльна абсталяваны пакой аператыўна-дзяжурнай службы папраўчай установы адкрытага тыпу да адмовы ад сваіх намераў, але не больш чым на тры гадзіны.

$2^2$. Парадак змяшчэння ў штрафны ізалятар, у спецыяльна абсталяваны пакой аператыўна-дзяжурнай службы папраўчай установы адкрытага тыпу, патрабаванні да абсталявання і ўмовы ўтрымання асуджаных у іх вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

3. У выпадку парушэння асуджаным да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу парадку і ўмоў адбывання пакарання ён можа быць затрыманы для высвятлення абставін парушэння на тэрмін да трох гадзін, а пры неабходнасці папярэджання здзяйснення ім іншых правапарушэнняў – да дваццаці чатырох гадзін па пастанове начальніка тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў, яго намесніка, а пры іх адсутнасці – па пастанове дзяжурнага па тэрытарыяльным органе ўнутраных спраў да вырашэння пытання аб прымяненні да яго меры спагнання. У выпадку затрымання на тэрмін, большы за тры гадзіны ён змяшчаецца ў ізалятар часовага ўтрымання.

## РАЗДЗЕЛ III
## ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ АРЫШТУ
## ГЛАВА 9
## ПАРАДАК І ЎМОВЫ ВЫКАНАННЯ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ АРЫШТУ
### Артыкул 58. Месцы адбывання арышту

1. Асуджаныя да арышту адбываюць пакаранне па месцы асуджэння ў арыштных дамах, размешчаных у раёне, найбольш прыбліжаным да іх пастаяннага месца жыхарства. Арыштныя дамы могуць размяшчацца на ахоўных тэрыторыях устаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы.

2. Асуджаны адбывае ўвесь тэрмін пакарання, як правіла, у адным арыштным доме.

3. Перавод асуджанага з аднаго арыштнага дома ў іншы дапускаецца ў выпадку яго захворвання або для забеспячэння яго асабістай бяспекі, а таксама пры іншых выключных абставінах, якія перашкаджаюць далейшаму знаходжанню асуджанага ў дадзеным арыштным доме.

4. Парадак накіравання да месца адбывання пакарання асуджаных да арышту ўстанаўлівае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Па пастанове начальніка тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў перад накіраваннем асуджаных да арышту да месца адбывання пакарання яны могуць утрымлівацца ў следчых ізалятарах, пры гэтым тэрмін такога ўтрымання павінен складаць не больш за пяць дзён. Тэрмін

утрымання асуджаных да арышту ў следчых ізалятарах залічваецца ў тэрмін пакарання, пры гэтым адзін дзень утрымання ў следчым ізалятары адпавядае аднаму дню арышту.

**Артыкул 59. Парадак і ўмовы выканання пакарання ў выглядзе арышту**

1. Асуджаныя да арышту ўтрымліваюцца ва ўмовах строгай ізаляцыі. Ізалявана ад іншых катэгорый асоб, якія адбываюць арышт, і асобна размяшчаюцца асуджаныя мужчыны, асуджаныя жанчыны, непаўналетнія асуджаныя, а таксама асуджаныя, якія раней адбывалі пакаранне ў папраўчых установах і маюць судзімасць.

2. На асуджаных да арышту распаўсюджваюцца ўмовы ўтрымання, устаноўленыя гэтым Кодэксам для асуджаных да пазбаўлення волі, якія адбываюць пакаранне на агульным рэжыме ў турме. Атрыманне адукацыі асуджанымі, якія адбываюць арышт, не ажыццяўляецца. Перамяшчэнне іх без канвою не дазваляецца.

3. Непаўналетнім, асуджаным да арышту, даюцца кароткатэрміновыя сустрэчы адзін раз на месяц працягласцю да чатырох гадзін з блізкімі сваякамі і асобамі, якія замяняюць бацькоў. Непаўналетнія, асуджаныя да арышту, карыстаюцца правам штодзённай прагулкі працягласцю да дзвюх гадзін.

4. Выключана.

5. Пры выключных абставінах (смерць або цяжкае захворванне блізкага сваяка, якое пагражае яго жыццю, стыхійнае бедства, якое прынесла значны матэрыяльны ўрон асуджанаму або яго сям'і) асуджаным да арышту рашэннем начальніка арыштнага дома можа быць дазволена тэлефонная размова працягласцю да пятнаццаці хвілін з блізкімі сваякамі з аплатай з асабістых сродкаў асуджаных.

6. Асуджаным да арышту можа быць дазволены кароткатэрміновы выезд за межы арыштнага дома працягласцю да сямі сутак, не лічачы часу, неабходнага для праезду туды і назад, у сувязі з выключнымі абставінамі, указанымі ў частцы 5 гэтага артыкула.

7. Адміністрацыя арыштнага дома арганізуе і праводзіць з асуджанымі да арышту выхаваўчую працу. Парадак арганізацыі і правядзення выхаваўчай працы з асуджанымі да арышту вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

8. Прымяненне фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў, агнястрэльнай зброі ў дачыненні да асуджаных да арышту ажыццяўляецца на падставах і ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 77–80 гэтага Кодэкса.

Заўвага. Пад блізкімі сваякамі ў гэтым і наступных артыкулах гэтага Кодэкса разумеюцца бацькі, дзеці, усынавіцелі, усыноўленыя, родныя браты і сёстры, дзед, бабка, унукі, муж (жонка), а таксама члены сям'і, якія не з'яўляюцца сваякамі асуджанага.

**Артыкул 60. Прыцягненне да працы асуджаных да арышту**

1. Асуджаныя да арышту, абавязаныя кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, абавязаны працаваць у месцах і на работах, якія вызначаюцца адміністрацыяй арыштнага дома або ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы, на тэрыторыі якой размешчаны арыштны дом. Праца такіх асуджаных арганізуецца ў парадку і на ўмовах, устаноўленых гэтым Кодэксам у дачыненні да асуджаных да пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі.

2. Адміністрацыя арыштнага дома мае права прыцягваць асуджаных да арышту да выканання работ па гаспадарчым абслугоўванні арыштнага дома працягласцю да дзесяці гадзін на тыдзень, але не больш за дзве гадзіны на дзень без аплаты. Асобы, указаныя ў частцы 1 гэтага артыкула, прыцягваюцца да дадзеных работ у вольны ад працы час, а асуджаныя, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, – па іх жаданні.

**Артыкул 61. Меры заахвочвання і спагнання, якія прымяняюцца да асуджаных да арышту, і парадак іх прымянення**

1. За добрыя паводзіны да асуджаных могуць прымяняцца наступныя меры заахвочвання:
1) абвяшчэнне падзякі;

2) датэрміновае зняцце раней накладзенага спагнання;
3) дазвол на тэлефонную размову працягласцю да пятнаццаці хвілін з аплатай з асабістых сродкаў асуджанага.
2. За парушэнне ўстаноўленага парадку адбывання пакарання да асуджаных могуць прымяняцца наступныя меры спагнання:
1) вымова;
2) змяшчэнне ў штрафны ізалятар на тэрмін да дзесяці сутак.
3. Меры заахвочвання і спагнання, што прымяняюцца да асуджаных, абвяшчаюцца пастановамі службовых асоб, якія маюць права на іх прымяненне.
4. Меры заахвочвання, за выключэннем датэрміновага зняцця раней накладзенага спагнання, прымяняюцца, калі асуджаны не мае спагнанняў.
5. Датэрміновае зняцце раней накладзеных спагнанняў ажыццяўляецца па чарзе, пачынаючы з першага непагашанага спагнання.
6. Датэрмінова здымаць спагнанні з асуджанага маюць права службовыя асобы, якія наклалі спагнанні, а таксама вышэйстаячыя службовыя асобы.
7. Датэрміновае зняцце накладзенага спагнання дапускаецца, як правіла, не раней за:
1) пятнаццаць сутак з дня накладання спагнання, указанага ў пункце 1 часткі 2 гэтага артыкула;
2) адзін месяц з дня адбыцця спагнання, указанага ў пункце 2 часткі 2 гэтага артыкула.
8. Пры прымяненні да асуджанага мер спагнання ўлічваюцца абставіны здзяйснення парушэння, асабістыя якасці асуджанага і яго папярэднія паводзіны. Накладзенае спагнанне павінна адпавядаць цяжару і характару парушэння. Не дапускаецца за адно парушэнне накладаць некалькі спагнанняў. За некалькі парушэнняў, здзейсненых адначасова або на працягу адных сутак, можа накладацца адно спагнанне.
9. Спагнанне накладаецца не пазней за дзесяць сутак з дня выяўлення парушэння, а калі ў сувязі з парушэннем праводзілася праверка, – з дня яе заканчэння, але не пазней за трыццаць сутак з дня здзяйснення парушэння. Спагнанне выконваецца неадкладна, а ў выпадку немагчымасці неадкладнага выканання – не пазней за пятнаццаць сутак з дня яго накладання.
10. Асуджаны не можа быць падвергнуты спагнанню, не атрымаўшы магчымасці выказацца і даць пісьмовае тлумачэнне ў сваё апраўданне. Службовыя асобы, якія выкарыстоўваюць да асуджаных меры спагнання, павінны ўсебакова і поўна ўлічваць абставіны здзяйснення парушэння, ступень віны асуджанага, яго апраўданні і накладаць спагнанне пасля асабістай размовы з ім.
11. Змяшчэнне асуджаных у штрафны ізалятар праводзіцца з указаннем тэрміну ўтрымання ў ім.
12. Прымяненне меры спагнання ў выглядзе змяшчэння ў штрафны ізалятар ажыццяўляецца толькі пасля агляду асуджанага медыцынскім работнікам, які павінен пісьмова пацвердзіць, што асуджаны здольны перанесці такое спагнанне. Медыцынскі работнік штодзённа наведвае асуджаных, якія адбываюць указанае спагнанне. Ён абавязаны неадкладна паведамляць пісьмова начальніку арыштнага дома або начальніку ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы, на тэрыторыі якой размешчаны арыштны дом, аб неабходнасці прыпынення выканання гэтага спагнання па прычыне фізічнага або псіхічнага стану асуджанага.
13. Выкананне спагнання ў выглядзе змяшчэння ў штрафны ізалятар прыпыняецца і аднаўляецца з-за медыцынскіх паказанняў рашэннем службовай асобы, якая наклала такое спагнанне. Пры гэтым дадзеная службовая асоба мае права скараціць пазасталы тэрмін спагнання або прыняць рашэнне аб спыненні яго выканання.
14. Асуджаны мае права абскардзіць рашэнне службовай асобы аб накладанні спагнання вышэйстаячай службовай асобе, пракурору або ў суд. У выпадку абскарджання

асуджаным рашэння аб накладанні спагнання яго выкананне не прыпыняецца. Пры наяўнасці падстаў спагнанне можа быць адменена або заменена службовай асобай, якая яго прымяніла, або вышэйстаячай службовай асобай, якая мае на гэта права, або адменена пракурорам ці судом. Рашэнне службовай асобы аб накладанні спагнання можа быць абскарджана не пазней за адзін год з моманту накладання спагнання вышэйстаячай службовай асобе або пракурору. Абскарджанне ў суд рашэння службовай асобы аб накладанні спагнання праводзіцца ў парадку, устаноўленым Грамадзянскім працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

15. Асуджаны лічыцца не маючым спагнанняў, калі на працягу двух месяцаў з дня накладання апошняга спагнання ён не быў падвергнуты новаму спагнанню.

**Артыкул 61[1]. Службовыя асобы, якія прымяняюць меры заахвочвання і спагнання да асуджаных да арышту**

1. Прымяняць меры заахвочвання і спагнання да асуджаных у поўным аб'ёме маюць права начальнікі арыштных дамоў, а таксама вышэйстаячыя службовыя асобы. Пры размяшчэнні арыштнага дома на тэрыторыі іншай установы крымінальна-выканаўчай сістэмы спагнанне ў выглядзе змяшчэння ў штрафны ізалятар прымяняе начальнік установы крымінальна-выканаўчай сістэмы, на тэрыторыі якой размешчаны арыштны дом.

2. Датэрмінова здымаць спагнанні з асуджанага маюць права службовыя асобы, якія наклалі спагнанні, а таксама вышэйстаячыя службовыя асобы.

3. Пералік вышэйстаячых службовых асоб, якія маюць права прымяняць меры заахвочвання і спагнання да асуджаных, а таксама датэрмінова здымаць спагнанні з асуджаных, устанаўліваецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў і Правіламі ўнутранага распарадку следчых ізалятараў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 61[2]. Выключаны**

**Артыкул 62. Матэрыяльна-бытавое забеспячэнне і медыка-санітарнае абслугоўванне асуджаных, якія адбываюць арышт**

1. Матэрыяльна-бытавое забеспячэнне асуджаных да арышту ажыццяўляецца паводле норм, устаноўленых для асуджаных да пазбаўлення волі, якія адбываюць пакаранне на агульным рэжыме ў турме, а непаўналетніх асуджаных – паводле норм, устаноўленых для выхаваўчых калоній.

2. Медыка-санітарнае абслугоўванне асуджаных да арышту ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым для асуджаных да пазбаўлення волі.

## РАЗДЗЕЛ IV
## ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ

## ГЛАВА 10
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ ВЫКАНАННЯ ПАКАРАННЯ У ВЫГЛЯДЗЕ ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ

**Артыкул 63. Месцы адбывання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі**

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі адбываюць пакаранне ў папраўчых установах на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

2. Асуджаныя да пазбаўлення волі накіроўваюцца ў папраўчыя ўстановы з улікам умоў, неабходных для іх выпраўлення, падтрымання карысных сацыяльных сувязей са сваякамі, забеспячэння бяспекі і папярэджання здзяйснення імі злачынстваў.

3. Асуджаныя да пазбаўлення волі замежныя грамадзяне, што адбываюць пакаранне ў папраўчых установах Рэспублікі Беларусь, могуць быць накіраваны для далейшага адбывання пакарання ў дзяржавы, грамадзянамі якіх яны з'яўляюцца, у парадку, устаноўленым міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 64. Віды папраўчых устаноў

1. Папраўчымі ўстановамі з'яўляюцца папраўчыя калоніі, выхаваўчыя калоніі, турмы, лячэбныя папраўчыя ўстановы. Следчыя ізалятары выконваюць функцыі папраўчых устаноў у дачыненні да асуджаных да пазбаўлення волі, пакінутых у следчых ізалятарах для выканання работ па гаспадарчым абслугоўванні.

2. Асуджаныя, якія дасягнулі васямнаццацігадовага ўзросту, адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчых калоніях, якія падраздзяляюцца на:

1) папраўчыя калоніі-пасяленні;

2) папраўчыя калоніі для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі;

3) папраўчыя калоніі для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі;

4) папраўчыя калоніі асаблівага рэжыму.

3. У папраўчых калоніях-пасяленнях адбываюць пакаранне:

1) асуджаныя за злачынствы, здзейсненыя з-за неасцярожнасці, да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах пасялення;

2) асуджаныя, якія сталі на шлях выпраўлення, пераведзеныя з папраўчых калоній для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, і папраўчых калоній для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, у парадку, устаноўленым часткай 3 артыкула 69 гэтага Кодэкса. У адной папраўчай калоніі-пасяленні не могуць утрымлівацца асуджаныя за злачынствы, здзейсненыя з-за неасцярожнасці, да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах пасялення і асуджаныя, якія сталі на шлях выпраўлення, пераведзеныя з папраўчых калоній для асоб, што раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі.

4. У папраўчых калоніях для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, адбываюць пакаранне асобы, якія раней не адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі:

1) мужчыны, асуджаныя да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага і ўзмоцненага рэжымаў;

2) жанчыны, асуджаныя да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму;

3) мужчыны і жанчыны, асуджаныя да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах строгага рэжыму, у дачыненні да якіх пакаранне прызначана ў адпаведнасці з часткай 6 артыкула 57 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

5. У папраўчых калоніях для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, адбываюць пакаранне асобы, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі:

1) мужчыны, асуджаныя да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага, узмоцненага і строгага рэжымаў;

2) жанчыны, асуджаныя да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага і строгага рэжымаў.

6. Выключана.

7. У папраўчых калоніях асаблівага рэжыму адбываюць пакаранне асуджаныя мужчыны пры асабліва небяспечным рэцыдыве злачынстваў, а таксама асуджаныя, якім пакаранне смерцю ў парадку памілавання заменена пажыццёвым зняволеннем, асуджаныя да пажыццёвага зняволення, асуджаныя, якім пакаранне смерцю або пажыццёвае зняволенне заменена пазбаўленнем волі.

8. У турмах адбываюць пакаранне асуджаныя да пазбаўлення волі на тэрмін, большы за пяць гадоў, за здзяйсненне асабліва цяжкіх злачынстваў, пры асабліва небяспечным рэцыдыве злачынстваў, асуджаныя, якім пакаранне смерцю ў парадку памілавання

заменена пажыццёвым зняволеннем, асуджаныя да пажыццёвага зняволення, а таксама асуджаныя, пераведзеныя ў турму з папраўчых калоній за злоснае парушэнне ўстаноўленага парадку адбывання пакарання.

9. У лячэбных папраўчых установах адбываюць пакаранне асуджаныя, указаныя ў частцы 5 артыкула 16 гэтага Кодэкса.

10. У выхаваўчых калоніях адбываюць пакаранне непаўналетнія, асуджаныя да пазбаўлення волі, а таксама асуджаныя, пакінутыя ў выхаваўчых калоніях пасля дасягнення імі васямнаццацігадовага ўзросту ў адпаведнасці з артыкулам 132 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 65. Накіраванне асуджаных да пазбаўлення волі для адбывання пакарання**

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі накіроўваюцца для адбывання пакарання ў папраўчыя ўстановы не пазней за дзесяць дзён з дня атрымання адміністрацыяй следчага ізалятара паведамлення аб уступленні прыгавору суда ў законную сілу. На працягу гэтага тэрміну асуджаны мае права на кароткатэрміновую сустрэчу са сваякамі або іншымі асобамі. Парадак накіравання асуджаных у папраўчыя ўстановы вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

2. Асуджаныя да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах пасялення накіроўваюцца да месца адбывання пакарання самастойна за кошт дзяржавы. Тэрытарыяльны орган унутраных спраў на падставе прыгавору суда ўручае асуджанаму прадпісанне аб выездзе да месца адбывання пакарання. Не пазней за трое сутак з дня атрымання прадпісання асуджаны абавязаны выехаць да месца адбывання пакарання і прыбыць туды на працягу неабходнага для праезду тэрміну, указанага ў прадпісанні аб выездзе.

3. Выключана.

4. Пры ўхіленні асуджанага ад атрымання прадпісання аб выездзе да месца адбывання пакарання або пры нявыездзе ва ўстаноўлены тэрмін асуджаны затрымліваецца тэрытарыяльным органам унутраных спраў з санкцыі пракурора на тэрмін да пятнаццаці сутак для выяўлення прычын парушэння парадку самастойнага руху да месца адбывання пакарання. У выпадку нявыезду асуджанага без уважлівых прычын тэрытарыяльны орган унутраных спраў накіроўвае затрыманага да месца адбывання пакарання ў парадку, устаноўленым Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

5. Калі асуджаны накіроўваецца ў папраўчую калонію-пасяленне пад канвоем, ён вызваляецца з-пад варты пасля прыбыцця да месца адбывання пакарання.

6. У выпадку непрыбыцця асуджанага ў папраўчую калонію-пасяленне тэрытарыяльны орган унутраных спраў ажыццяўляе вышук асуджанага і пасля затрымання накіроўвае яго да месца адбывання пакарання ў парадку, устаноўленым Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

$6^1$. Асуджаныя, затрыманыя згодна з пастановай начальніка тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў у выпадках, прадугледжаных часткамі 4 і 6 гэтага артыкула, утрымліваюцца ў следчым ізалятары.

7. Тэрмін пакарання асуджанага да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах пасялення лічыцца з моманту пастаноўкі асуджанага на ўлік у папраўчай калоніі-пасяленні. У гэты тэрмін залічваюцца час утрымання пад вартай у якасці меры стрымання і час руху з месца папярэдняга зняволення або з папраўчай калоніі для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, або папраўчай калоніі для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі. У тэрмін пакарання не залічваецца час самавольнай адсутнасці асуджанага на тэрыторыі папраўчай калоніі-пасялення, большы за суткі.

**Артыкул 66. Перамяшчэнне асуджаных да пазбаўлення волі**

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі накіроўваюцца да месца адбывання пакарання і перамяшчаюцца з аднаго месца адбывання пакарання ў іншае пад канвоем, за выключэннем выпадкаў, указаных у частцы 2 артыкула 65 гэтага Кодэкса.
2. Перамяшчэнне асуджаных да пазбаўлення волі пад канвоем ажыццяўляецца з захаваннем правіл асобнага ўтрымання: мужчын асобна ад жанчын; непаўналетніх – ад дарослых; прыгавораных да пакарання смерцю або пажыццёвага зняволення – ад іншых катэгорый асуджаных; асуджаных па адной крымінальнай справе – асобна паміж сабой. Асуджаныя да пазбаўлення волі, хворыя на актыўную форму туберкулёзу або якія не прайшлі поўнага курса лячэння венерычнага захворвання, асобы, якія хварэюць на псіхічныя расстройствы (захворванні), прызнаныя асобамі з паменшанай наяўнасцю свядомасці, перамяшчаюцца асобна і адасоблена ад асуджаных, якія не маюць указаных захворванняў, а пры неабходнасці згодна з заключэннем урача-спецыяліста – у суправаджэнні медыцынскіх работнікаў.
3. Пры перамяшчэнні асуджаных ім забяспечваюцца неабходныя матэрыяльна-бытавыя і санітарна-гігіенічныя ўмовы.
4. На ўвесь перыяд руху асуджаныя забяспечваюцца адзеннем і абуткам па сезоне, а таксама харчаваннем па ўстаноўленым для іх нормам.
5. Перамяшчэнне асуджаных ажыццяўляецца за кошт дзяржавы.
6. Парадак перамяшчэння асуджаных да пазбаўлення волі вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтым Кодэксам.

**Артыкул 67. Пакіданне асуджаных да пазбаўлення волі ў следчым ізалятары або турме**

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі на тэрмін, не большы за сем гадоў, з адбываннем пакарання ва ўмовах агульнага або ўзмоцненага рэжыму, якія раней не адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, з іх згоды могуць быць пакінуты ў следчым ізалятары або турме для выканання работ па гаспадарчым абслугоўванні.
2. Асуджаныя да пазбаўлення волі пакідаюцца для выканання работ па гаспадарчым абслугоўванні рашэннем начальніка следчага ізалятара або турмы пры наяўнасці пісьмовай згоды асуджаных.
3. Асуджаныя да пазбаўлення волі, пакінутыя ў следчым ізалятары або турме для выканання работ па гаспадарчым абслугоўванні, утрымліваюцца ў агульных камерах, якія не запіраюцца, асобна ад іншых асоб на ўмовах таго рэжыму, які вызначаны ім судом, і карыстаюцца правам штодзённай прагулкі працягласцю не менш за дзве гадзіны.
4. Пры неабходнасці правядзення следчых дзеянняў па справе аб злачынстве, здзейсненым іншай асобай, асуджаны да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай або выхаваўчай калоніі можа быць пакінуты ў следчым ізалятары або турме з санкцыі пракурора на тэрмін, які ўстаноўлены Крымінальна-працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь для правядзення следчых дзеянняў па дадзенай справе і які не перавышае тэрмін пакарання асуджанага да пазбаўлення волі.
$4^1$. Асуджаны да пазбаўлення волі з яго згоды і з санкцыі пракурора можа быць пакінуты ў следчым ізалятары на тэрмін, які неабходны для правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў па крымінальнай справе аб злачынстве, здзейсненым іншай асобай і які не перавышае тэрмін пакарання гэтага асуджанага да пазбаўлення волі.
5. Пры неабходнасці ўдзелу ў судовым разборы па справе аб злачынстве, здзейсненым іншай асобай, асуджаны да пазбаўлення волі можа быць пакінуты паводле прысуду (пастановы) суда ў следчым ізалятары або турме на час разгляду справы ў судзе.
6. У выпадку, калі асуджаны да пазбаўлення волі прыцягваецца да крымінальнай адказнасці па іншай справе, ён можа быць пакінуты ў следчым ізалятары або турме з санкцыі пракурора на тэрмін да дзесяці сутак, але не перавышаючы тэрміну пакарання асуджанага да пазбаўлення волі, для вырашэння пытання аб выбранні меры стрымання ў

выглядзе змяшчэння пад варту. У гэтым выпадку тэрмін яго ўтрымання пад вартай лічыцца ў адпаведнасці з Крымінальна-працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.
7. Асуджаны да пазбаўлення волі можа быць пераведзены з папраўчай установы ў следчы ізалятар або ў турму на падставах, указаных у частках 4–6 гэтага артыкула.

**Артыкул 68. Змяненне ўмоў утрымання асуджаных да пазбаўлення волі ў межах адной папраўчай установы**

1. У залежнасці ад паводзін і адносін да працы асуджаных да пазбаўлення волі ўмовы іх утрымання могуць мяняцца ў межах адной папраўчай установы па пастанове начальніка гэтай установы.
2. Асуджаныя да пазбаўлення волі, прызнаныя стаўшымі на шлях выпраўлення, якія ўтрымліваюцца ў папраўчых калоніях для асоб, што ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, папраўчых калоніях для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, выхаваўчых калоніях, пераводзяцца на палепшаныя ўмовы ўтрымання пасля адбыцці адной чвэрці тэрміну пакарання, а якія ўтрымліваюцца ў папраўчых калоніях асаблівага рэжыму – пасля адбыцця адной трэці тэрміну пакарання. У выпадку прызнання такіх асуджаных асобамі, якія злосна парушаюць устаноўлены парадак адбывання пакарання, палепшаныя ўмовы ўтрымання пастановай начальніка папраўчай установы адмяняюцца.
3. Змяненне ўмоў утрымання асуджаных да пазбаўлення волі ў межах адной папраўчай установы цягне за сабой даванне палепшаных умоў утрымання, прадугледжаных артыкуламі 118–121, 126 і 173 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 69. Змяненне віду папраўчай установы і ўмоў рэжыму**

1. У залежнасці ад паводзін і адносін да працы асуджаных да пазбаўлення волі ім могуць быць зменены від папраўчай установы і ўмовы рэжыму.
2. Асуджаныя да пазбаўлення волі, якія сталі на шлях выпраўлення, могуць быць пераведзены для далейшага адбывання пакарання:
1) з турмы ў папраўчую калонію – пасля адбыцця не менш за палову тэрміну пакарання, прызначанага па прыгаворы або прысудзе суда;
2) з папраўчай калоніі асаблівага рэжыму ў папраўчую калонію для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, з адбываннем пакарання ва ўмовах строгага рэжыму – пасля адбыцця не менш за палову тэрміну пакарання, прызначанага па прыгаворы суда.
3. Асуджаныя да пазбаўлення волі, у тым ліку асуджаныя, якія дасягнулі паўналецця ў выхаваўчай калоніі, якія сталі на шлях выпраўлення, могуць быць пераведзены з папраўчых калоній для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, папраўчых калоній для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, і выхаваўчых калоній у папраўчую калонію-пасяленне пасля адбыцця:
1) не менш за адну чвэрць тэрміну пакарання, прызначанага судом за злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкае злачынства;
2) не менш за палову тэрміну пакарання, прызначанага судом за цяжкае злачынства, а таксама калі раней асоба асуджалася да пазбаўлення волі за наўмыснае злачынства;
3) не менш за дзве трэці тэрміну пакарання, прызначанага судом пры асабліва небяспечным рэцыдыве злачынстваў, за асабліва цяжкае злачынства, а таксама пакарання, прызначанага асобе, якая раней умоўна-датэрмінова вызвалялася ад пакарання і здзейсніла новае злачынства ў перыяд неадбытай часткі пакарання;
4) выключаны.
4. Не падлягаюць пераводу ў папраўчую калонію-пасяленне асуджаныя:
1) якім пакаранне смерцю ў парадку памілавання заменена пажыццёвым зняволеннем;
2) якім прызначана пакаранне ў выглядзе пажыццёвага зняволення;
3) якім пажыццёвае зняволенне заменена ў парадку памілавання пазбаўленнем волі;

4) якім прызначаны прымусовыя меры бяспекі і лячэння, хворыя на актыўную форму туберкулёзу або якія не прайшлі поўнага курса лячэння венерычнага захворвання;
5) якія не далі пісьмовай згоды на перавод у папраўчую калонію-пасяленне;
6) замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія не пражываюць пастаянна ў Рэспубліцы Беларусь.
5. Асуджаныя да пазбаўлення волі, якія злосна парушаюць устаноўлены парадак адбывання пакарання, могуць быць пераведзены:
1) з папраўчай калоніі-пасялення ў папраўчую калонію таго віду і ва ўмовах таго рэжыму, якія былі раней вызначаны судом;
2) з папраўчай калоніі-пасялення, у якую яны былі накіраваны па прыгаворы суда, у папраўчую калонію для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, або папраўчую калонію для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, з адбываннем пакарання ва ўмовах агульнага рэжыму;
3) з папраўчай калоніі для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, і папраўчай калоніі для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, у турму на тэрмін, не большы за тры гады з адбываннем астатняга тэрміну пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах таго рэжыму, які быў вызначаны па прыгаворы суда.
6. Змяненне віду папраўчай установы і ўмоў рэжыму ажыццяўляецца судом па прадстаўленні адміністрацыі папраўчай установы, узгодненым з наглядальнай камісіяй пры мясцовым выканаўчым і распарадчым органе.

### Артыкул 70. Прыём асуджаных да пазбаўлення волі ў папраўчыя ўстановы

1. Прыём асуджаных да пазбаўлення волі ў папраўчыя ўстановы ажыццяўляецца адміністрацыяй указаных устаноў у парадку, устаноўленым Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў.
2. Адміністрацыя папраўчай установы не пазней за тры дні з дня прыбыцця асуджанага паведамляе суду, які пастанавіў прыгавор, аб прывядзенні яго ў выкананне і аб месцы адбывання пакарання асуджаным, а таксама аднаго з членаў сям'і або сваякоў па выбары асуджанага аб месцы адбывання ім пакарання і правах асуджанага.

### Артыкул 71. Асобнае ўтрыманне асуджаных да пазбаўлення волі ў папраўчых установах

1. У папраўчых установах устанаўліваецца асобнае ўтрыманне асуджаных да пазбаўлення волі мужчын і жанчын, непаўналетніх і дарослых.
1[1]. Выключана.
2. Дазваляецца ўтрыманне ў адной папраўчай установе асуджаных жанчын, якім адбыванне пакарання прызначана ў папраўчых калоніях для асоб, што ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, і папраўчых калоніях для асоб, што раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, а таксама непаўналетніх жаночага полу, якім адбыванне пакарання прызначана ў выхаваўчых калоніях. У гэтым выпадку асобна ўтрымліваюцца жанчыны, упершыню асуджаныя да пазбаўлення волі, і жанчыны, якія раней адбывалі гэта пакаранне. Ізалявана ад іншых асуджаных утрымліваюцца непаўналетнія жаночага полу.
3. У адной папраўчай установе асобна ўтрымліваюцца асуджаныя пры асабліва небяспечным рэцыдыве злачынстваў і асуджаныя, якім у парадку памілавання пажыццёвае зняволенне заменена пазбаўленнем волі.
4. Асобна ў памяшканнях, якія запіраюцца, могуць утрымлівацца ў адной папраўчай установе асуджаныя, якія дапамагаюць здзяйсненню правапарушэнняў іншымі асуджанымі або схільныя да ўшчамлення праў і законных інтарэсаў іншых асуджаных або да непадпарадкавання законным патрабаванням адміністрацыі.

5. Для ўтрымання асуджаных – былых работнікаў праваахоўных органаў могуць стварацца асобныя папраўчыя ўстановы. У гэтыя ўстановы могуць быць накіраваны і іншыя асуджаныя.

5[1]. Асуджаныя за злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 327–329 і 331 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, утрымліваюцца ў папраўчых установах асобна ад іншых асуджаных або ў асобных папраўчых установах.

6. Устаноўленыя гэтым артыкулам патрабаванні асобнага ўтрымання асуджаных не распаўсюджваюцца на лячэбна-папраўчыя ўстановы. Асуджаныя, якія накіроўваюцца ва ўказаныя ўстановы, утрымліваюцца на ўмовах, устаноўленых законам для калоніі таго віду, які прызначаны судом.

7. Асуджаныя, што маюць захворванні, уключаныя ў пералік захворванняў, што ўяўляюць небяспеку для здароўя насельніцтва, які вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, утрымліваюцца асобна і ізалявана ад асуджаных, што не маюць указаных захворванняў.

### Артыкул 72. Адбыванне асуджанымі да пазбаўлення волі ўсяго тэрміну пакарання ў адной папраўчай установе

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі павінны адбываць увесь тэрмін пакарання, як правіла, у адной папраўчай калоніі, турме або выхаваўчай калоніі.

2. Перавод асуджанага для далейшага адбывання пакарання з адной папраўчай калоніі ў іншую таго ж віду або з адной турмы ў іншую дапускаецца ў выпадку захворвання асуджанага, пры рэарганізацыі або ліквідацыі папраўчай установы, для атрымання асуджаным адукацыі, а таксама пры выключных абставінах, якія перашкаджаюць далейшаму знаходжанню асуджанага ў дадзенай папраўчай установе. Парадак пераводу асуджаных вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 11
## РЭЖЫМ У ПАПРАЎЧЫХ УСТАНОВАХ І СРОДКІ ЯГО ЗАБЕСПЯЧЭННЯ

### Артыкул 73. Рэжым у папраўчых установах і яго асноўныя патрабаванні

1. Рэжым у папраўчых установах – устаноўлены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадак выканання і адбывання пакарання, які забяспечвае ахову і ізаляцыю асуджаных, пастаянны нагляд за імі, выкананне ўскладзеных на іх абавязкаў, рэалізацыю іх праў і законных інтарэсаў, бяспеку асуджаных і персаналу, асобнае ўтрыманне пэўных катэгорый асуджаных, розныя ўмовы ўтрымання ў залежнасці ад віду папраўчай установы, прызначанага судом, змяненне ўмоў адбывання пакарання ў залежнасці ад паводзін асуджанага.

2. У папраўчых установах дзейнічаюць Правілы ўнутранага распарадку папраўчых устаноў, якія зацвярджае Міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь пасля ўзгаднення з Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь.

3. Асуджаныя носяць адзенне ўстаноўленага ўзору, а ў папраўчых калоніях асаблівага рэжыму – спецыяльнага ўзору, які вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

4. У парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, асуджаныя маюць права набываць па безнаяўным разліку прадукты харчавання і прадметы першай неабходнасці, мець сустрэчы, атрымліваць пасылкі, перадачы, бандэролі і дробныя пакеты, грашовыя пераводы, весці перапіску і тэлефонныя размовы, а таксама адпраўляць пасылкі, бандэролі, дробныя пакеты і грашовыя пераводы блізкім сваякам. Асуджаным дазваляецца атрыманне адной рэчавай пасылкі (абутак, адзенне і іншыя прамысловыя тавары, якія асуджаныя могуць мець пры сабе, акрамя прадуктаў харчавання і тытунёвых вырабаў) у год.

5. Пералік і колькасць рэчаў і прадметаў, якія дазваляецца мець пры сабе асуджаным, устанаўліваюцца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых установаў. Захоўванне асуджанымі пры сабе грошай, каштоўных папер і іншых каштоўнасцей, а таксама прадметаў, не ўказаных у пераліку, не дапускаецца.

6. Карэспандэнцыя асуджаных, за выключэннем указанай у частцы 4 артыкула 13 гэтага Кодэкса, падлягае цэнзуры, а пасылкі, перадачы, бандэролі і дробныя пакеты – агляду.

7. Асуджаныя, а таксама памяшканні, у якіх яны пражываюць, могуць падвяргацца вобшуку, а рэчы асуджаных – агляду. Асабісты вобшук праводзяць асобы аднаго полу з асуджанымі. Парадак правядзення вобшуку і агляду вызначаецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых установаў.

8. Адміністрацыя папраўчай установы мае права рабіць агляд асоб і рэчаў, якія належаць ім, транспартных сродкаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі папраўчай установы, а таксама на тэрыторыях і вытворчых аб'ектах, якія мяжуюць з ёй, на якіх працуюць асуджаныя і ўстаноўлены рэжымныя патрабаванні, канфіскаваць у гэтых асоб прадметы і рэчы, што не ўваходзяць у пералік прадметаў і рэчаў, дазволеных для атрымання і захоўвання, устаноўлены Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых установаў.

9. Знойдзеныя ў асуджаных грошы, замежная валюта канфіскуюцца і, як правіла, залічваюцца на рахунак папраўчай установы па матываванай пастанове начальніка папраўчай установы, санкцыянаванай пракурорам. Каштоўныя рэчы і прадметы, забароненыя да выкарыстання ў папраўчых установах, канфіскуюцца і ў залежнасці ад іх характару і абставін набыцця ў адпаведнасці з Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых установаў здаюцца на захоўванне, або знішчаюцца, або рэалізуюцца. Рэалізацыя канфіскаваных каштоўных рэчаў і прадметаў ажыццяўляецца на падставе матываванай пастановы начальніка папраўчай установы, санкцыянаванай пракурорам. Сродкі ад рэалізацыі канфіскаваных прадметаў і каштоўных рэчаў залічваюцца на рахунак папраўчай установы.

10. Захоўванне набытых асуджанымі ва ўстаноўленым парадку каштоўных папер забяспечваецца адміністрацыяй папраўчай установы.

**Артыкул 74. Тэхнічныя сродкі нагляду і кантролю ў папраўчых установах**

1. Адміністрацыя папраўчых установаў мае права выкарыстоўваць аўдыявізуальныя, электронныя і іншыя тэхнічныя сродкі нагляду і кантролю для папярэджання ўцёкаў і іншых злачынстваў, парушэнняў устаноўленага парадку адбывання пакарання, а таксама атрымання неабходнай інфармацыі аб паводзінах асуджаных.

2. Пералік тэхнічных сродкаў нагляду і кантролю, а таксама парадак іх выкарыстання ўстанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

3. Адміністрацыя папраўчых установаў абавязана пад распіску паведамляць асуджаным аб выкарыстанні ў дачыненні да іх сродкаў кантролю і нагляду.

**Артыкул 75. Аператыўна-вышуковая дзейнасць у папраўчых установах**

1. У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у папраўчых установах ажыццяўляецца аператыўна-вышуковая дзейнасць, задачамі якой з'яўляюцца забеспячэнне асабістай бяспекі асуджаных, работнікаў папраўчых установаў і іншых асоб, выяўленне і папярэджанне падрыхтаваных злачынстваў, вышук ва ўстаноўленым парадку асуджаных, якія здзейснілі ўцёкі з папраўчых установаў, а таксама асуджаных, якія ўхіляюцца ад адбывання пазбаўлення волі, садзейнічанне ў выяўленні і стрыманні злачынстваў, здзейсненых асуджанымі да прыбыцця ў папраўчую ўстанову.

2. Аператыўна-вышуковая дзейнасць ажыццяўляецца аператыўнымі падраздзяленнямі папраўчых установаў і іншымі ўпаўнаважанымі на тое органамі ў межах іх кампетэнцыі.

**Артыкул 76. Рэжым асаблівага становішча ў папраўчых установах**

1. У выпадку стыхійных бедстваў, групавых адмоў асуджаных ад працы, прыёму ежы, іншых непадпарадкаванняў, а таксама групавых дзеянняў, якія груба парушаюць унутраны распарадак, начальнік папраўчай установы мае права ўвесці ва ўстанове рэжым асаблівага становішча, які прадугледжвае ўзмацненне мер для забеспячэння нагляду, ізаляцыі і бяспекі. Аб увядзенні рэжыму асаблівага становішча начальнік установы павінен неадкладна паведаміць пракурору. Рэжым асаблівага становішча ўводзіцца пастановай начальніка папраўчай установы і адмяняецца ім пасля спынення падзей, якія з'явіліся падставай для ўвядзення рэжыму асаблівага становішча.

2. Пры ўвядзенні рэжыму асаблівага становішча начальнік папраўчай установы мае права:

1) прыпыніць адпраўку лістоў асуджаных і ўручэнне прысланых лістоў, за выключэннем тых, якія накіроўваюцца ў пракуратуру і іншыя дзяржаўныя органы, уручэнне прысланых пасылак, бандэролей, дробных пакетаў, прыём перадач, даванне сустрэч, продаж прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці;

2) абмежаваць перамяшчэнне асуджаных у межах жылой і вытворчай зон;

3) адмяніць або абмежаваць выхад ці вываз асуджаных за межы ўстановы;

4) забараніць або абмежаваць наведванне ўстановы прадстаўнікамі грамадскіх аб'яднанняў, рэлігійных арганізацый і сродкаў масавай інфармацыі;

5) забараніць правядзенне масавых мерапрыемстваў культурна-асветнага, фізкультурна-спартыўнага характару;

6) ізаляваць у межах дадзенай установы або перавесці ў іншыя ўстановы асуджаных, якія арганізуюць групавыя проціпраўныя дзеянні, або правакуюць ці падбухторваюць да іх, або актыўна ўдзельнічаюць у іх;

7) устанавіць ва ўстанове ўзмоцнены варыянт аховы і нагляду.

### Артыкул 77. Агульныя палажэнні аб прымяненні фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў і зброі ў папраўчых установах

1. Работнікі папраўчай установы, якія маюць спецыяльныя званні, а таксама ваеннаслужачыя, якія ажыццяўляюць ахову асуджаных і нагляд за імі, могуць прымяняць фізічную сілу, спецыяльныя сродкі і агнястрэльную зброю, калі іншым спосабам выкананне ўскладзеных на іх абавязкаў па забеспячэнні парадку і ўмоў выканання пакарання немагчымае. Фізічная сіла, спецыяльныя сродкі і агнястрэльная зброя прымяняюцца самастойна зыходзячы з рэальнага становішча. Прымяненню фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў і агнястрэльнай зброі, як правіла, павінны папярэднічаць папярэджанні аб намеры іх выкарыстоўваць.

2. У становішчы неабходнай абароны або крайняй неабходнасці работнікі папраўчай установы і ваеннаслужачыя, якія ажыццяўляюць ахову асуджаных і нагляд за імі, пры адсутнасці спецыяльных сродкаў і агнястрэльнай зброі маюць права выкарыстоўваць для адбівання калектыўна небяспечных замахаў з боку асуджаных спадручныя сродкі.

3. Спецыяльныя сродкі і агнястрэльная зброя не прымяняюцца ў дачыненні жанчын з бачнымі прыкметамі цяжарнасці і асуджаных з яўнымі прыкметамі інваліднасці, за выключэннем выпадкаў аказання імі ўзброенага супраціўлення, здзяйснення групавога або ўзброенага нападу на работнікаў папраўчай установы і ваеннаслужачых або іншых дзеянняў, якія пагражаюць жыццю і здароўю грамадзян.

4. У дачыненні да непаўналетніх асуджаных агнястрэльная зброя можа прымяняцца ў выпадку аказання імі ўзброенага супраціўлення, здзяйснення групавога або ўзброенага нападу на работнікаў папраўчай установы і ваеннаслужачых або іншых дзеянняў, якія пагражаюць жыццю і здароўю грамадзян.

5. Ва ўсіх выпадках, калі пазбегнуць прымянення фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў і агнястрэльнай зброі немагчыма, работнікі папраўчай установы, якія маюць спецыяльныя

званні, і ваеннаслужачыя абавязаны імкнуцца зрабіць найменшую шкоду асуджанаму, а таксама забяспечыць аказанне пацярпелым медыцынскай дапамогі.

6. Аб раненні або смерці асуджанага з прычыны прымянення фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў ці агнястрэльнай зброі работнік папраўчай установы або ваеннаслужачы абавязаны паведаміць непасрэднаму начальніку для апавяшчэння пракурора.

7. Неправамернае прымяненне фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў і агнястрэльнай зброі цягне за сабой адказнасць, устаноўленую заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 78. Прымяненне фізічнай сілы ў папраўчых установах**

Работнікі папраўчай установы і ваеннаслужачыя, якія ажыццяўляюць ахову асуджаных і нагляд за імі, маюць права прымяняць фізічную сілу, у тым ліку баявыя прыёмы барацьбы, спадручныя сродкі для прадухілення і стрымання правапарушэнняў, самаабароны, пераадолення процідзеяння законным патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы або ваеннаслужачых.

**Артыкул 79. Прымяненне спецыяльных сродкаў у папраўчых установах**

1. Работнікі папраўчай установы, якія маюць спецыяльныя званні, і ваеннаслужачыя, якія ажыццяўляюць ахову асуджаных і нагляд за імі, маюць права прымяняць наручнікі, гумавыя палкі, сродкі звязвання, спецыяльныя хімічныя рэчывы, святлогукавыя прылады адцягваючага ўздзеяння, прылады для ўскрыцця памяшканняў і прымусовага спынення транспарту, вадамёты, бронемашыны і іншыя спецыяльныя сродкі, а таксама службовых сабак для:

1) адбівання нападу на грамадзян, работнікаў папраўчых устаноў і ваеннаслужачых;

2) вызвалення заложнікаў;

3) адбівання нападу з боку асуджаных на будынкі, памяшканні, збудаванні і транспартныя сродкі незалежна ад іх прыналежнасці або для вызвалення захопленых асуджанымі аб'ектаў;

4) стрымання непадпарадкавання законным патрабаванням адміністрацыі папраўчых устаноў і ваеннаслужачых, праяў буянства, а таксама стрымання правапарушэнняў з боку асуджаных;

5) затрымання асуджаных і дастаўкі іх у службовае памяшканне папраўчай установы, тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў або воінскай часці ў выпадку здзяйснення імі правапарушэння, у тым ліку ўцёкаў, калі яны аказваюць непадпарадкаванне або супраціўленне, а таксама маюцца падставы меркаваць, што яны могуць зрабіць шкоду навакольным або сабе;

6) стрымання масавых беспарадкаў і групавых парушэнняў Правіл унутранага распарадку папраўчых устаноў асуджанымі.

2. Від спецыяльнага сродку і інтэнсіўнасць яго прымянення вызначаюць работнік папраўчай установы, які мае спецыяльнае званне, і ваеннаслужачы самастойна зыходзячы з рэальнага становішча, характару правапарушэння і асобы асуджанага.

**Артыкул 80. Прымяненне агнястрэльнай зброі ў папраўчых установах**

1. Работнікі папраўчых устаноў, якія маюць спецыяльныя званні, і ваеннаслужачыя, якія ажыццяўляюць ахову асуджаных і нагляд за імі, маюць права прымяняць агнястрэльную зброю для:

1) адбівання нападу з боку асуджаных і іншых асоб на работнікаў папраўчай установы, ваеннаслужачых, грамадзян або на саміх асуджаных, які пагражае іх жыццю або здароўю;

2) вызвалення заложнікаў;

3) стрымання групавога або ўзброенага нападу на ахоўныя аб'екты папраўчай установы, вайсковы або службовы нарад указанай установы;

4) затрымання асуджанага, які аказвае ўзброенае супраціўленне або здзяйсняе ўцёкі, а таксама раззбраення асуджанага, які адмаўляецца выконваць законныя патрабаванні аб здачы зброі, у тым ліку прадметаў, спецыяльна прыстасаваных для нанясення цялесных пашкоджанняў.

2. Работнікі папраўчых установ, якія маюць спецыяльныя званні, і ваеннаслужачыя маюць права выкарыстоўваць агнястрэльную зброю ў выпадках:

1) падачы сігнала трывогі або выкліку дапамогі;

2) спынення транспартнага сродку шляхам яго пашкоджання, калі яўна вядома, што яно выкарыстоўваецца асуджаным для здзяйснення ўцёкаў.

3. Работнікі папраўчых установ, якія маюць спецыяльныя званні, і ваеннаслужачыя, якія ажыццяўляюць ахову асуджаных і нагляд за імі, маюць права агаліць агнястрэльную зброю і прывесці яе ў гатоўнасць, калі лічаць, што ў становішчы, якое склалася, могуць узнікнуць прадугледжаныя гэтым артыкулам падставы для яе прымянення. Здзяйсненне асобай, якая затрымліваецца, наўмысна нечаканых рухаў або іншых небяспечных дзеянняў, спробы наблізіцца да работніка папраўчай установы або ваеннаслужачага бліжэй за ўказаную імі адлегласць, дастаць што-небудзь са свайго адзення без каманды работніка або ваеннаслужачага, дакрануцца да іх агнястрэльнай зброі і іншыя падобныя дзеянні, якія могуць быць зразуметы работнікам папраўчай установы або ваеннаслужачым як пагроза гвалту, даюць ім права скарыстаць агнястрэльную зброю ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

4. Пры прымяненні агнястрэльнай зброі работнікі папраўчых установ, якія маюць спецыяльныя званні, і ваеннаслужачыя, якія ажыццяўляюць ахову асуджаных і нагляд за імі, абавязаны прыняць усе магчымыя меры для забеспячэння бяспекі грамадзян, а таксама для аказання пацярпелым медыцынскай дапамогі.

## ГЛАВА 12
## УМОВЫ АДБЫВАННЯ ПАКАРАННЯ У ПАПРАЎЧЫХ УСТАНОВАХ

### Артыкул 81. Умовы адбывання пакарання асуджанымі да пазбаўлення волі

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі ў папраўчых калоніях для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, і папраўчых калоніях для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, утрымліваюцца ў звычайных жылых памяшканнях і ў адпаведнасці з Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых установ могуць перамяшчацца ў межах калоніі.

2. Асуджаныя, якія адбываюць пакаранне ў папраўчых калоніях асаблівага рэжыму, утрымліваюцца ў памяшканнях камернага тыпу або ў звычайных жылых памяшканнях.

3. У памяшканнях камернага тыпу папраўчай калоніі асаблівага рэжыму ўтрымліваюцца асуджаныя за цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы, а таксама асуджаныя за наўмысныя злачынствы, здзейсненыя ў перыяд адбывання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі.

4. Перавод асуджаных з памяшканняў камернага тыпу папраўчай калоніі асаблівага рэжыму ў звычайныя жылыя памяшканні праводзіцца пры адсутнасці спагнанняў за парушэнне ўстаноўленага парадку адбывання пакарання і добрасумленных адносінах да працы пасля адбыцця не менш чым адной трэці ўстаноўленага судом тэрміну пакарання.

5. У выпадку злоснага парушэння ўстаноўленага парадку адбывання пакарання асуджаны, пераведзены з памяшкання камернага тыпу папраўчай калоніі асаблівага рэжыму ў звычайнае жылое памяшканне, можа быць пераведзены ў парадку спагнання ў памяшканне камернага тыпу. Паўторны перавод асуджанага з памяшкання камернага тыпу ў звычайнае жылое памяшканне праводзіцца не раней чым праз год пры адсутнасці спагнанняў.

6. Перавод асуджанага з памяшкання камернага тыпу папраўчай калоніі асаблівага рэжыму ў звычайнае жылое памяшканне і назад на падставах, прадугледжаных часткамі 4 і 5 гэтага артыкула, праводзіцца адпаведна пастанове начальніка папраўчай установы.
7. У турмах устанаўліваюцца агульны і строгі рэжымы ўтрымання асуджаных. Перавод асуджаных з агульнага рэжыму на строгі, а таксама са строгага на агульны праводзіцца адпаведна пастанове начальніка папраўчай установы, узгодненай з наглядальнай камісіяй.
8. У выключных выпадках для забеспячэння асабістай бяспекі асуджанага, які адбывае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі ў любой папраўчай установе, пры наяўнасці яго пісьмовай просьбы начальнік установы мае права перавесці асуджанага на ізаляванае ўтрыманне на тэрмін да шасці месяцаў. Дадзенае палажэнне распаўсюджваецца і на асуджаных, хворых на актыўную форму туберкулёзу, у выпадку, калі па выніках медыцынскага абследавання паказана, што асуджаны можа ўтрымлівацца ў памяшканні для ізаляванага ўтрымання.
9. Асуджаныя, пераведзеныя з адной папраўчай установы ў іншую такога ж віду на падставах, прадугледжаных часткай 2 артыкула 72 гэтага Кодэкса, адбываюць пакаранне на тых жа ўмовах, якія ім былі вызначаны да пераводу.

### Артыкул 82. Набыццё асуджанымі да пазбаўлення волі прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі штомесяц могуць набываць прадукты харчавання і прадметы першай неабходнасці па безнаяўным разліку за кошт грашовых сродкаў, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памерах, устаноўленых артыкуламі 118–121, 125 і 126 гэтага Кодэкса.
2. У выпадку нерасходавання дазволеных грашовых сродкаў у бягучым месяцы асуджаныя могуць набываць прадукты харчавання і прадметы першай неабходнасці на незрасходаваную суму ў наступныя месяцы.
3. Асуджаным, якія перавыконваюць норму выпрацоўкі або ўзорна выконваюць прызначаныя заданні на цяжкіх работах, а таксама на работах са шкоднымі і (або) небяспечнымі ўмовамі працы, адміністрацыя ўстановы мае права павялічваць памер грашовых сродкаў, дазволеных для расходавання, у межах устаноўленага памеру базавай велічыні, прадугледжанай заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.
4. Асуджаныя, якія абавязаны кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, што знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, асуджаныя, якія не кампенсавалі ўрон, прычынены злачынствам, а таксама асуджаныя, прызнаныя злоснымі парушальнікамі ўстаноўленага парадку адбывання пакарання, штомесяц могуць расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі на суму да дзвюх базавых велічынь.
5. Выключана.
6. Асуджаным, які адбываюць пакаранне ў папраўчых і выхаваўчых калоніях, а таксама асуджаным, пакінутым у следчых ізалятарах і турмах для выканання работ па гаспадарчым абслугоўванні, дазваляецца замест атрымання належнай пасылкі або перадачы набываць на працягу месяца прадукты харчавання і прадметы першай неабходнасці на суму да пяці базавых велічынь за кошт грашовых сродкаў, якія ёсць на іх асабовых рахунках. Гэта права не распаўсюджваецца на асуджаных, абавязаных кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, асуджаных, якія не кампенсавалі ўрон, прычынены злачынствам, а таксама на асуджаных, прызнаных злоснымі парушальнікамі ўстаноўленага парадку адбывання пакарання.

7. Пералік прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці, дазволеных для набыцця і захоўвання асуджанымі, устанаўліваецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў.

**Артыкул 83. Даванне сустрэч асуджаным да пазбаўлення волі**

1. Асуджаным да пазбаўлення волі даюцца кароткатэрміновыя сустрэчы працягласцю чатыры гадзіны і працяглыя сустрэчы працягласцю да трох сутак у спецыяльна абсталяваным памяшканні на тэрыторыі папраўчай установы.

2. У папраўчых калоніях-пасяленнях асуджаным могуць давацца працяглыя сустрэчы з пражываннем па-за тэрыторыяй папраўчай установы. У гэтым выпадку парадак і месца правядзення сустрэч вызначае начальнік папраўчай установы.

3. Кароткатэрміновыя сустрэчы са сваякамі або іншымі асобамі даюцца асуджаным у прысутнасці работніка адміністрацыі папраўчай установы. З асобамі, якія не з'яўляюцца сваякамі асуджанага, кароткатэрміновыя сустрэчы даюцца толькі па рашэнні адміністрацыі. Працяглыя сустрэчы даюцца з правам сумеснага пражывання асуджанага з блізкімі сваякамі.

4. Асуджаным па іх просьбе дазваляецца замяніць працяглую сустрэчу кароткатэрміновай. Парадак замены аднаго віду сустрэчы іншым устанаўліваецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў.

5. Асуджаным, якія адбываюць пазбаўленне волі ў папраўчых і выхаваўчых калоніях, а таксама пакінутым у следчых ізалятарах і турмах для выканання работ па гаспадарчым абслугоўванні, пры заключэнні шлюбу ў перыяд адбывання пакарання даецца працяглая сустрэча працягласцю да трох сутак, якая не ўваходзіць у лік належных сустрэч і сустрэч, якія даюцца ў парадку заахвочвання.

6. Для атрымання юрыдычнай дапамогі асуджаным па іх заяве даюцца сустрэчы з адвакатамі або іншымі асобамі, якія маюць права на аказанне юрыдычнай дапамогі.

**Артыкул 84. Атрыманне і адпраўленне асуджанымі да пазбаўлення волі пасылак, бандэролей і дробных пакетаў, атрыманне перадач**

1. Асуджаным да пазбаўлення волі дазваляецца атрыманне пасылак, перадач, бандэролей і дробных пакетаў у колькасці, устаноўленай артыкуламі 118–121, 125 і 126 гэтага Кодэкса. Максімальная вага пасылкі, бандэролі і дробнага пакета вызначаецца Правіламі аказання паслуг паштовай сувязі, якія зацвярджае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

2. Пасылкі, перадачы, бандэролі і дробныя пакеты, якія паступілі не ад блізкіх сваякоў, уручаюцца асуджаным з дазволу начальніка папраўчай установы.

3. Хворым асуджаным і асуджаным, якія з'яўляюцца інвалідамі I і II групы, дазваляецца атрыманне дадатковай бандэролі або дробнага пакета з лекавымі сродкамі паводле заключэння ўрача-спецыяліста, якія захоўваюцца і выдаюцца медыцынскай часцю папраўчай установы, а таксама дадатковай пасылкі або перадачы на працягу трох месяцаў з прадуктамі харчавання, рэкамендаванымі ўрачом-спецыялістам.

4. Асуджаныя маюць права адпраўляць пасылкі, бандэролі і дробныя пакеты блізкім сваякам, а з дазволу адміністрацыі папраўчай установы – і іншым асобам.

5. Парадак прыёму, атрымання, адпраўлення пасылак, бандэролей і дробных пакетаў, атрымання перадач, іх агляду, а таксама пералік прадметаў і рэчаў, дазволены да атрымання, захоўвання, адпраўлення асуджанымі, вызначаюцца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў.

**Артыкул 85. Перапіска асуджаных да пазбаўлення волі, адпраўленне і атрыманне імі грашовых пераводаў**

1. Асуджаным да пазбаўлення волі дазваляецца атрымліваць і адпраўляць лісты і тэлеграмы без абмежавання іх колькасці. Лісты і тэлеграмы адпраўляюцца за кошт асуджаных.

2. Карэспандэнцыя, якая атрымліваецца і адпраўляецца асуджанымі, за выключэннем указанай у частцы 4 артыкула 13 гэтага Кодэкса, падлягае цэнзуры.

3. Перапіска паміж асуджанымі, якія ўтрымліваюцца ў папраўчых установах і не з'яўляюцца блізкімі сваякамі, забараняецца.

4. Асуджаныя маюць права атрымліваць, а таксама адпраўляць грашовыя пераводы блізкім сваякам, а з дазволу адміністрацыі папраўчай установы – і іншым асобам.

5. Грашовыя сумы, якія паступілі, залічваюцца на асабовы рахунак асуджанага, а ў папраўчых калоніях-пасяленнях уручаюцца асуджанаму.

6. Парадак атрымання і адпраўлення асуджанымі лістоў, тэлеграм і грашовых пераводаў вызначаецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў.

**Артыкул 86. Тэлефонныя размовы асуджаных да пазбаўлення волі**

1. Асуджаным да пазбаўлення волі даецца права на тэлефонныя размовы з блізкімі сваякамі ў колькасці і парадку, устаноўленых Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў. Працягласць кожнай размовы не павінна перавышаць пятнаццаць хвілін. Тэлефонныя размовы аплачваюцца асуджанымі за кошт сродкаў, якія ёсць на іх асабовых рахунках, і кантралююцца адміністрацыяй папраўчай установы.

2. Тэлефонныя размовы паміж асуджанымі, якія ўтрымліваюцца ў розных папраўчых установах, забараняюцца.

3. Тэлефонныя размовы асуджаным, якія ўтрымліваюцца ў штрафных (дысцыплінарных) ізалятарах, памяшканнях камернага тыпу, адзіночных камерах і пераведзены з агульнага рэжыму на строгі ў турме, даюцца толькі пры наяўнасці выключных абставін.

Заўвага. Пад выключнымі абставінамі ў частцы 3 гэтага артыкула разумеюцца смерць або цяжкае захворванне блізкага сваяка, якое пагражае яго жыццю, стыхійнае бедства, якое прычыніла значны матэрыяльны ўрон асуджанаму або яго сям'і.

**Артыкул 87. Прагулкі асуджаных да пазбаўлення волі**

Асуджаныя, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі ў памяшканнях камернага тыпу папраўчых калоній асаблівага рэжыму, спецыялізаваных палатах лячэбных папраўчых устаноў, маюць права на прагулку, працягласць якой устанаўліваецца артыкуламі 121, 123 і 173 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 88. Прагляд асуджанымі да пазбаўлення волі кінафільмаў і тэлеперадач, праслухоўванне радыёперадач**

1. Асуджаным да пазбаўлення волі, акрамя пераведзеных у штрафныя ізалятары, памяшканні камернага тыпу і адзіночныя камеры, дэманструюцца кінафільмы або відэафільмы не радзей аднаго разу на два тыдні.

2. Асуджаным, акрамя пераведзеных у штрафныя ізалятары, памяшканні камернага тыпу і адзіночныя камеры, дазваляецца прагляд тэлеперадач у вольны ад працы і іншых абавязковых па распарадку дня мерапрыемстваў час, акрамя адведзенага для начнога адпачынку.

3. Асуджаным і групам асуджаных можа быць дазволена набыццё тэле- і радыёпрыёмнікаў за кошт уласных сродкаў праз гандлёвую сетку або атрыманне іх ад сваякоў і іншых асоб. Парадак набыцця, атрымання, захоўвання і вяртання тэле- і радыёпрыёмнікаў устанаўліваецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў.

4. Асуджаным дазваляецца праслухоўванне радыёперадач у вольны ад абавязковых па распарадку дня мерапрыемстваў час, акрамя адведзенага для начнога адпачынку. Жылыя памяшканні, пакоі выхаваўчай працы, пакоі сустрэч, памяшканні камернага тыпу, адзіночныя камеры абсталёўваюцца сеткавымі радыёпрыёмнікамі за кошт сродкаў папраўчай установы.

**Артыкул 89. Набыццё і захоўванне асуджанымі да пазбаўлення волі літаратуры і пісьмовых прылад**

1. Асуджаным да пазбаўлення волі дазваляецца атрымліваць у пасылках, перадачах, бандэролях і дробных пакетах пісьмовыя прылады, набываць праз гандлёвую сетку літаратуру, а таксама без абмежавання падпісвацца на газеты і часопісы за кошт уласных сродкаў звыш сум, устаноўленых для расходавання на прадукты харчавання і прадметы першай неабходнасці.
2. Асуджаным забараняюцца атрыманне, набыццё, захоўванне і распаўсюджванне выданняў, якія прапагандуюць вайну, распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці, гвалт або жорсткасць, выданняў парнаграфічнага характару, а таксама падпіска на іх.
3. Бандэролі і дробныя пакеты з літаратурай, якая набываецца праз гандлёвую сетку, не ўключаюцца ў колькасць бандэролей і дробных пакетаў, якія маюць права атрымліваць асуджаныя.
4. Асуджанаму дазваляецца мець пры сабе не больш за пяць кніг і часопісаў, не лічачы падручнікаў, неабходных для атрымання агульнай сярэдняй, прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі і праходжання прафесійнай падрыхтоўкі.
5. Літаратура ў колькасці, якая перавышае ўказаную ў частцы 4 гэтага артыкула, здаецца асуджаным на захоўванне на склад або перадаецца сваякам ці з яго згоды ў бібліятэку папраўчай установы.

### Артыкул 90. Умовы і парадак перамяшчэння асуджаных да пазбаўлення волі без канвою або суправаджэння

1. Асуджаным за злачынствы, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, менш цяжкія злачынствы, упершыню асуджаным за цяжкія злачынствы, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчых калоніях, якія сталі на шлях выпраўлення, пасля адбыцця не менш чым адной чвэрці тэрміну пакарання можа быць дазволена перамяшчэнне без канвою або суправаджэння за межамі папраўчай установы, калі гэта неабходна па характары працы, якая выконваецца імі.
2. Асуджаным, якія ўтрымліваюцца ў выхаваўчых калоніях і сталі на шлях выпраўлення, перамяшчэнне за межамі калоніі без канвою або суправаджэння можа быць дазволена пасля адбыцця імі не менш чым шасці месяцаў тэрміну пакарання.
3. Не дапускаецца перамяшчэнне без канвою або суправаджэння за межамі папраўчых устаноў асуджаных пры асабліва небяспечным рэцыдыве злачынстваў; асуджаных за здзяйсненне асабліва цяжкіх злачынстваў; асуджаных, якім пакаранне смерцю ў парадку памілавання заменена пажыццёвым зняволеннем; асуджаных да пажыццёвага зняволення; асуджаных за наўмысныя злачынствы, здзейсненыя ў перыяд адбывання пакарання; асуджаных, хворых на актыўную форму туберкулёзу або не прайшоўшых поўнага курса лячэння алкагалізму, таксікаманіі, наркаманіі, асоб, якія хварэюць на псіхічныя расстройствы (захворванні); асуджаных, якія карысталіся правам перамяшчэння без канвою або суправаджэння, але былі пазбаўлены яго ў сувязі з дапушчанымі парушэннямі.
4. Права перамяшчэння без канвою або суправаджэння за межамі папраўчай установы даецца асуджанаму пастановай начальніка папраўчай установы, якая зацвярджаецца вышэйстаячым начальнікам.
5. Асуджаныя, якія карыстаюцца правам перамяшчэння без канвою або суправаджэння, размяшчаюцца ў асобных жылых памяшканнях. Пражыванне іх па-за калоніяй не дазваляецца.
6. Права перамяшчэння без канвою або суправаджэння распаўсюджваецца толькі на час выканання работ у межах пэўнай тэрыторыі або па пэўным маршруце.
7. Паводзіны асуджаных, якія карыстаюцца правам перамяшчэння без канвою або суправаджэння за межамі папраўчай установы, рэгулююцца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў.

8. У выпадку парушэння асуджанымі Правіл унутранага распарадку папраўчых установ або змянення характару работ, якія выконваюцца асуджанымі, перамяшчэнне іх без канвою або суправаджэння адмяняецца пастановай начальніка папраўчай установы.

**Артыкул 91. Пражыванне асуджаных жанчын па-за папраўчай калоніяй**

1. Асуджаным жанчынам, якія добрасумленна адносяцца да працы і выконваюць патрабаванні рэжыму, па матываванай пастанове начальніка папраўчай калоніі, узгодненай з наглядальнай камісіяй, можа быць дазволена пражыванне па-за папраўчай калоніяй на час вызвалення ад працы па цяжарнасці і родах, а таксама на перыяд да дасягнення дзіцём трохгадовага ўзросту.

2. Асуджаныя жанчыны, якім дазволена пражыванне па-за папраўчай калоніяй:

1) пасяляюцца недалёка ад тэрыторыі папраўчай калоніі ў жылых памяшканнях, якія належаць папраўчай калоніі, і знаходзяцца пад пастаянным наглядам адміністрацыі папраўчай калоніі;

2) могуць насіць адзенне, прынятае ў грамадзянскім ужытку, мець пры сабе грошы і карыстацца імі без абмежавання;

3) карыстаюцца ў час ад пад'ёму да адбою правам свабоднага перамяшчэння па тэрыторыі, межы якой вызначае начальнік папраўчай калоніі;

4) маюць права адпраўляць і атрымліваць лісты, пасылкі, перадачы, бандэролі, дробныя пакеты, ажыццяўляць сустрэчы без абмежавання.

3. Пасля заканчэння перыяду вызвалення ад працы па цяжарнасці і родах асуджаныя жанчыны прыцягваюцца да працы па ўказанні адміністрацыі папраўчай калоніі.

4. У выпадку сістэматычнага або злоснага парушэння асуджанымі жанчынамі рэжыму ці правіл паводзін права на пражыванне па-за папраўчай калоніяй пастановай начальніка папраўчай калоніі адмяняецца.

**Артыкул 92. Выезды асуджаных да пазбаўлення волі за межы папраўчых установ**

1. Асуджаным да пазбаўлення волі, якія ўтрымліваюцца ў папраўчых калоніях для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, і папраўчых калоніях для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, ва ўмовах агульнага рэжыму, папраўчых калоніях-пасяленнях і выхаваўчых калоніях, а таксама асуджаным, пакінутым ва ўстаноўленым парадку ў следчых ізалятарах і турмах для выканання работ па гаспадарчым абслугоўванні, могуць быць дазволены кароткатэрміновыя выезды за межы папраўчых і выхаваўчых установ працягласцю да сямі сутак, не лічачы часу, неабходнага для праезду туды і назад, у сувязі з выключнымі абставінамі, указанымі ў частцы 5 артыкула 59 гэтага Кодэкса, а таксама для папярэдняга вырашэння пытанняў працоўнага і бытавога ўладкавання пасля вызвалення.

2. Асуджаным, які ўтрымліваюцца ў папраўчых калоніях-пасяленнях, у парадку заахвочвання могуць быць дазволены кароткатэрміновыя выезды да блізкіх сваякоў не больш чым два разы на год працягласцю да пяці сутак без уліку часу, неабходнага для праезду туды і назад. У неабходных выпадках пры наяўнасці пацвярджальнага дакумента можа быць дазволены кароткатэрміновы выезд для праходжання экзаменацыйнай сесіі і (або) здачы экзаменаў асуджаным, якія атрымліваюць асноўную адукацыю ў завочнай форме атрымання адукацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Працягласць такога выезду вызначаецца ў рамках перыяду, указанага ў выкліку аб праходжанні экзаменацыйнай сесіі і (або) здачы экзаменаў, з улікам часу, неабходнага для праезду туды і назад.

3. Асуджаным жанчынам, якія маюць дзяцей у дамах дзіцяці папраўчых калоній, для ўладкавання дзяцей у сваякоў або ў дзіцячай інтэрнатнай установе можа быць дазволены кароткатэрміновы выезд за межы папраўчых установ на тэрмін да сямі сутак, не лічачы

часу, неабходнага для праезду туды і назад, а асуджаным жанчынам, якія маюць дзяцей-інвалідаў па-за папраўчай калоніяй, – адзін кароткатэрміновы выезд на год на той жа тэрмін для сустрэчы з імі.

4. Выезды на падставах, указаных у частках 1, 2 і 3 гэтага артыкула, не дазваляюцца асуджаным пры асабліва небяспечным рэцыдыве злачынстваў; асуджаным за цяжкія злачынствы на тэрмін, большы за пяць гадоў, і асабліва цяжкія злачынствы, за выключэннем асуджаных, якія адбываюць пакаранне ў папраўчых калоніях-пасяленнях; асуджаным да пажыццёвага зняволення; асуджаным, якім пакаранне смерцю ў парадку памілавання заменена пажыццёвым зняволеннем; асуджаным, хворым на актыўную форму туберкулёзу; асуджаным, якія не прайшлі поўны курс лячэння алкагалізму, таксікаманіі, наркаманіі, асобам, якія хварэюць на псіхічныя расстройствы (захворванні); асуджаным, якія маюць нязнятыя і (або) непагашаныя спагнанні.

5. Асуджаным, якія з'яўляюцца інвалідамі I і II групы і маюць патрэбу па стане здароўя ў чужым доглядзе, а таксама непаўналетнім асуджаным выезд за межы папраўчай установы дазваляецца ў суправаджэнні сваяка або іншай асобы, якая суправаджае.

6. Дазвол на кароткатэрміновы выезд дае начальнік папраўчай установы пасля ўзгаднення з пракурорам з улікам характару і цяжару здзейсненага злачынства, асабістых якасцей і паводзін асуджанага.

7. Час знаходжання асуджаных за межамі папраўчай установы залічваецца ў тэрмін адбывання пакарання.

8. Расходы асуджаных у сувязі з выездам за межы папраўчай установы аплачваюцца імі з уласных сродкаў або іншымі асобамі.

9. У выпадку ўзнікнення непрадбачаных абставін, якія ўскладняюць зваротны выезд асуджанага ва ўстаноўлены тэрмін, пастановай начальніка тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў па месцы знаходжання асуджанага тэрмін вяртання ў папраўчую ўстанову можа быць прадоўжаны да пяці сутак з абавязковым тэрміновым паведамленнем аб гэтым адміністрацыі папраўчай установы.

9[1]. Пры захворванні падчас выезду і неабходнасці шпіталізацыі асуджаны, яго блізкія сваякі або іншыя асобы неадкладна паведамляюць аб гэтым адміністрацыі папраўчай установы, дзе асуджаны адбывае пакаранне, а таксама тэрытарыяльны орган унутраных спраў па месцы знаходжання асуджанага. Пасля заканчэння лячэння і выпіскі асуджаны ва ўстаноўленым парадку накіроўваецца да месца адбывання пакарання.

10. Парадак ажыццяўлення выездаў асуджаных за межы папраўчых устаноў вызначаецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў.

11. Пры ўхіленні асуджанага ад вяртання ва ўстаноўлены тэрмін у папраўчую ўстанову ён падлягае затрыманню тэрытарыяльным органам унутраных спраў па месцы яго знаходжання з санкцыі пракурора на тэрмін не большы за трыццаць сутак для вырашэння пытання аб накіраванні яго да месца адбывання пакарання пад канвоем або прыцягненні да крымінальнай адказнасці.

11[1]. Асуджаны, затрыманы па пастанове начальніка тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў у выпадку, прадугледжаным часткай 11 гэтага артыкула, утрымліваецца ў следчым ізалятары.

12. Выезды асуджаных на тэрыторыю іншай дзяржавы не дазваляюцца, калі іншае не прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

13. Выезды асуджаных, прадугледжаныя гэтым артыкулам, у выпадках правядзення санітарна-процiэпiдэмiчных мерапрыемстваў забараняюцца.

### Артыкул 93. Абавязковае дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне і пенсійнае забеспячэнне асуджаных да пазбаўлення волі

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі, якія прыцягваюцца да выканання аплатных работ, падлягаюць абавязковаму дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню.

2. Асуджаныя да пазбаўлення волі маюць права на дзяржаўнае пенсійнае забеспячэнне па ўзросце, інваліднасці, у выпадку страты карміцеля і іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

3. Умовы і парадак пенсійнага забеспячэння асуджаных да пазбаўлення волі вызначаюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

4. Выплата пенсій асуджаным ажыццяўляецца органамі, якія прызначаюць і выплачваюць пенсію, па месцы знаходжання папраўчай установы шляхам пералічэння належных сум пенсій на асабовыя рахункі асуджаных.

5. Асуджаныя, якія страцілі працаздольнасць у перыяд адбывання пазбаўлення волі, маюць права на пакрыццё ўрону ў выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 94. Матэрыяльна-бытавое забеспячэнне асуджаных да пазбаўлення волі**

1. Асобам, якія адбываюць пакаранне ў папраўчых установах, забяспечваюцца неабходныя жыллёва-бытавыя ўмовы, якія адпавядаюць правілам санітарыі і гігіены. Норма жылой плошчы на аднаго асуджанага ў папраўчых калоніях і турмах не можа быць меншай за два квадратныя метры, у выхаваўчых калоніях – тры з паловай квадратныя метры, у лячэбных папраўчых установах – тры квадратныя метры. Нормы рэчавага забеспячэння ўстанаўлівае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь пасля ўзгаднення з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2. Асуджаным даюцца індывідуальнае спальнае месца і пасцельныя рэчы. Яны забяспечваюцца адзеннем, бялізнай адпаведна сезону і абуткам.

3. Асуджаныя атрымліваюць харчаванне, якое забяспечвае нармальную жыццядзейнасць арганізма. Нормы харчавання ўстанаўлівае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь пасля ўзгаднення з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

4. Асуджаным цяжарным жанчынам, кормячым маці, непаўналетнім, хворым і інвалідам I і II групы ствараюцца палепшаныя жыллёва-бытавыя ўмовы і ўстанаўліваюцца павышаныя нормы харчавання.

5. Асуджаныя могуць набываць за кошт уласных сродкаў дадаткова дазволенае да выкарыстання ў папраўчых установах адзенне, у тым ліку спартыўнае, аплачваць дадатковыя лячэбна-прафілактычныя і іншыя паслугі, прадугледжаныя Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых установ, звыш устаноўленага памеру сродкаў, дазволеных для расходавання на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці.

6. Асуджаным, якія вызвалены ад працы з-за захворвання, якія не працуюць з-за прычын, што не залежаць ад іх, асуджаным цяжарным жанчынам і кормячым маці на перыяд вызвалення ад працы харчаванне даецца бясплатна. Асуджаным, якія ўтрымліваюцца ў выхаваўчых калоніях, а таксама асуджаным, якія з'яўляюцца інвалідамі I і II групы, харчаванне, адзенне і абутак, камунальныя паслугі і сродкі асабістай гігіены даюцца бясплатна.

7. Для паляпшэння жыллёва-бытавых умоў асуджаных, набыцця прадметаў культурнага і фізкультурна-спартыўнага прызначэння, а таксама аказання матэрыяльнай дапамогі асуджаным у папраўчых установах могуць выкарыстоўвацца грашовыя сродкі і іншая маёмасць, якія перадаюцца бязвыплатна асуджанымі і іншымі фізічнымі асобамі папраўчай установе. Улік і выкарыстанне ўказаных сродкаў ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь пасля ўзгаднення з Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь. Папраўчыя ўстановы могуць выкарыстоўваць бязвыплатную (спонсарскую) дапамогу, якая даецца юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі ў парадку, устаноўленым актамі

заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб даванні і выкарыстанні бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі.

**Артыкул 95. Асаблівасці матэрыяльна-бытавога забеспячэння асуджаных цяжарных жанчын, кормячых маці і жанчын, якія маюць дзяцей**

1. У папраўчых установах, дзе адбываюць пакаранне асуджаныя жанчыны, якія маюць дзяцей, арганізуюцца дамы дзіцяці. У дамах дзіцяці ствараюцца ўмовы, неабходныя для нармальнага пражывання і развіцця дзяцей. Асуджаныя жанчыны могуць змяшчаць у дамы дзіцяці папраўчых устаноў сваіх дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, мецъ зносіны з імі ў вольны ад працы час без абмежаванняў. Ім можа быць дазволена сумеснае пражыванне з дзецьмі ў дамах дзіцяці.

2. Са згоды асуджаных жанчын іх дзеці могуць быць перададзены сваякам або згодна з рашэннем органаў апекі і папячыцельства іншым асобам або пасля дасягнення трохгадовага ўзросту накіраваны ў адпаведныя дзіцячыя ўстановы.

3. Калі дзіцяці, якое ўтрымліваецца ў доме дзіцяці папраўчай установы, споўнілася тры гады, а астатні тэрмін адбывання пакарання маці не перавышае аднаго года, адміністрацыя папраўчай установы можа прадоўжыць час знаходжання дзіцяці ў доме дзіцяці да дня заканчэння тэрміну адбывання пакарання маці.

4. Асуджаныя цяжарныя жанчыны і кормячыя маці ў адпаведнасці з медыцынскім заключэннем могуць атрымліваць дадаткова харчовыя пасылкі і перадачы ў колькасці і асартыменце, неабходных для падтрымання нармальнага здароўя маці і дзіцяці. Асуджаныя цяжарныя жанчыны на перыяд родаў і ў пасляродавы перыяд маюць права на медыцынскую дапамогу.

**Артыкул 96. Медыка-санітарнае забеспячэнне асуджаных**

1. У папраўчых установах арганізуюцца медыцынскія часці, бальніцы, лячэбныя папраўчыя ўстановы.

2. Аказанне медыцынскай дапамогі, санітарна-процiэпідэмічныя мерапрыемствы ў папраўчых установах арганізуюцца і праводзяцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб ахове здароўя, а таксама Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

3. Адміністрацыя папраўчых устаноў нясе адказнасць за выкананне ў папраўчых установах устаноўленых санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў, якія забяспечваюць ахову здароўя асуджаных.

4. Аказанне медыцынскай дапамогі асуджаным, а таксама дзяржаўны санітарны нагляд у папраўчых установах ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

5. Пры адсутнасці ў папраўчых установах магчымасці аказання хуткай або планавай медыцынскай дапамогі неабходная медыцынская дапамога аказваецца асуджаным у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя.

**Артыкул 97. Матэрыяльная адказнасць асуджаных да пазбаўлення волі**

1. У выпадку прычынення падчас адбывання пакарання матэрыяльнага ўрону дзяржаве, фізічным або юрыдычным асобам асуджаныя да пазбаўлення волі нясуць матэрыяльную адказнасць:

1) за ўрон, прычынены пры выкананні працоўных абавязкаў, – у памерах, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб працы;

2) за ўрон, прычынены іншымі дзеяннямі, – у памерах, прадугледжаных грамадзянскім заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

2. Асуджаны абавязаны кампенсаваць урон (шкоду), прычынены папраўчай установе ў выніку сваіх процiпраўных дзеянняў, дадатковыя выдаткі, звязаныя з аказаннем яму

медыцынскай дапамогі ў выпадку наўмыснага прычынення ім шкоды свайму здароўю. У выпадку здзяйснення ўцёкаў з папраўчай установы, самавольнага пакідання папраўчай калоніі-пасялення асуджаны абавязаны ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, кампенсаваць расходы, затрачаныя на правядзенне мерапрыемстваў па яго вышуку, затрыманні і вяртанні ў папраўчую ўстанову. Спагнанне з асуджанага грашовай сумы, зрасходаванай у сувязі з яго вышукам, праводзіцца шляхам здзяйснення выканаўчага надпісу. Памер грашовай сумы, зрасходаванай у сувязі з вышукам асуджанага, вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

3. Няправільна ўтрыманыя за прычынены матэрыяльны ўрон сумы падлягаюць вяртанню асуджанаму з залічэннем на яго асабовы рахунак.

## ГЛАВА 13
## ПРАЦА, ПРАФЕСІЯНАЛЬНА-ТЭХНІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ І ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА АСУДЖАНЫХ ДА ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ

### Артыкул 98. Прыцягненне да працы асуджаных да пазбаўлення волі

1. Кожны асуджаны да пазбаўлення волі абавязаны працаваць у месцах і на работах, якія вызначаюцца адміністрацыяй папраўчых устаноў. Адміністрацыя папраўчай установы абавязана прыцягваць асуджаных да калектыўна карыснай працы з улікам іх полу, узросту, працаздольнасці, стану здароўя і па магчымасці спецыяльнасці. Асуджаныя прыцягваюцца да працы на прадпрыемствах або ў вытворчых майстэрнях папраўчых устаноў, а таксама на іншых прадпрыемствах незалежна ад форм уласнасці пры ўмове забеспячэння належнай аховы і ізаляцыі асуджаных. Пры прыцягненні асуджаных да працы працоўны дагавор (кантракт) з імі не заключаецца.

2. Асуджаныя, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, а таксама асуджаныя, якія з'яўляюцца інвалідамі I і II групы, прыцягваюцца да працы паводле іх жадання ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб працы. Непаўналетнія асуджаныя прыцягваюцца да працы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб працы.

3. Праца асуджаных, якія адбываюць пазбаўленне волі ў турме, арганізуецца толькі на тэрыторыі турмы.

4. Пералік работ, на якіх забараняецца выкарыстоўваць працу асуджаных, устанаўліваецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў.

5. Вытворчая дзейнасць асуджаных арганізуецца з улікам захавання патрабаванняў рэжыму ўтрымання і нагляду за імі.

6. Адмова ад працы або самавольнае спыненне працы з'яўляюцца злосным парушэннем устаноўленага парадку адбывання пакарання і цягнуць за сабой прымяненне мер спагнання.

### Артыкул 99. Умовы працы асуджаных да пазбаўлення волі

1. Працягласць рабочага часу асуджаных да пазбаўлення волі, патрабаванні па ахове працы ўстанаўліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб працы і аб ахове працы. Час пачатку і заканчэння працы вызначаецца графікам, які ўстанаўлівае адміністрацыя папраўчай установы.

2. З улікам характару работ, што выконваюць асуджаныя, якія ўтрымліваюцца ў папраўчых калоніях і турмах, дапускаецца падсумаваны ўлік рабочага часу.

3. Час выканання асуджанымі аплатных работ залічваецца ў працоўны стаж у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Улік адпрацаванага часу ўскладаецца на адміністрацыю папраўчай установы і праводзіцца па выніках каляндарнага года.

4. Асуджаныя, якія адпрацавалі не менш за адзінаццаць месяцаў у каляндарным годзе, маюць права на працоўны водпуск працягласцю васямнаццаць каляндарных дзён – для асуджаных, якія адбываюць пазбаўленне волі ў выхаваўчых калоніях, дванаццаць

каляндарных дзён – для асуджаных, якія адбываюць пазбаўленне волі ў іншых папраўчых установах. Водпуск асобам, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, а таксама ўпершыню асуджаным за цяжкія злачынствы на тэрмін да пяці гадоў, даецца як з выездам за межы папраўчай установы, так і без выезду з яе, а асобам, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, – у межах папраўчай установы. Асуджаныя, абавязаныя кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, маюць права на працоўны водпуск працягласцю сем каляндарных дзён.

5. Парадак выезду асуджанага ў сувязі з водпускам вызначаецца часткамі 4–13 артыкула 92 гэтага Кодэкса. Аплата водпускаў асуджаных устанаўліваецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб працы.

### Артыкул 100. Аплата працы асуджаных да пазбаўлення волі

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі маюць права на аплату працы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

2. Памер аплаты працы асуджаных, якія адпрацавалі месячную норму рабочага часу і выканалі ўстаноўленую для іх норму выпрацоўкі, не можа быць ніжэйшы за ўстаноўлены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь памер аплаты працы за выкананне адпаведных работ.

3. Аплата працы асуджаных пры няпоўным рабочым дні або няпоўным рабочым тыдні праводзіцца прапарцыянальна адпрацаванаму імі часу або ў залежнасці ад выпрацоўкі.

4. Заработная плата асуджаных падлягае індэксацыі ў парадку і на ўмовах, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 101. Прыцягненне асуджаных да пазбаўлення волі да работ без аплаты працы

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі могуць прыцягвацца да выканання работ без аплаты працы толькі па калектыўным самаабслугоўванні, у тым ліку па прыбіранні і добраўпарадкаванні папраўчых устаноў і тэрыторый, якія мяжуюць з імі.

2. Асуджаныя, якія з'яўляюцца інвалідамі I і II групы, асуджаныя, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, асуджаныя цяжарныя жанчыны прыцягваюцца да работ без аплаты працы па іх жаданні.

3. Да ўказаных работ асуджаныя прыцягваюцца ў парадку чарговасці ў вольны ад працы час. Працягласць работ не павінна перавышаць чатырнаццаць гадзін на тыдзень.

### Артыкул 102. Вылічэнні з заработнай платы і іншых даходаў асуджаных да пазбаўлення волі

1. З заработнай платы і прыраўнаваных да яе даходаў у асуджаных да пазбаўлення волі, за выключэннем асуджаных, указаных у частцы 6 артыкула 94 гэтага Кодэкса, праводзяцца вылічэнні для пакрыцця кошту харчавання, камунальных паслуг, сродкаў асабістай гігіены, адзення і абутку (акрамя кошту спецыяльнага харчавання, спецыяльнага адзення, спецыяльнага абутку і іншых неабходных сродкаў індывідуальнай абароны). Кошт харчавання, камунальных паслуг і сродкаў асабістай гігіены, не ўтрыманы ў справаздачным месяцы ў асоб, якія ўтрымліваюцца ў папраўчых установах, у выпадку недастатковасці іх заработнай платы і прыраўнаваных да яе даходаў запазычанасці не ўтварае і ў наступныя месяцы не ўтрымліваецца. Указаны кошт спісваецца на расходы па каштарысе на ўтрыманне папраўчай установы. Кошт адзення і абутку ўтрымліваецца на працягу тэрміну адбывання пакарання да поўнага яго пагашэння. Пасля сканчэння тэрміну адбывання пакарання неўтрыманы кошт адзення і абутку спісваецца на расходы па каштарысе на ўтрыманне папраўчай установы. Парадак разліку і пакрыцця падлеглага вылічэнню кошту харчавання, камунальных паслуг, сродкаў асабістай гігіены, адзення і абутку (акрамя кошту спецыяльнага харчавання, спецыяльнага адзення, спецыяльнага абутку і іншых неабходных сродкаў індывідуальнай

абароны) устанаўлівае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь пасля ўзгаднення з Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

2. Пакрыццё асуджанымі расходаў на іх утрыманне праводзіцца пасля вылічэння падаходнага падатку, абавязковых страхавых узносаў у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь, аліментаў на ўтрыманне непаўналетніх дзяцей, сродкаў на пакрыццё выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, сум па пакрыцці ўрону, прычыненага злачынствам або адміністрацыйным правапарушэннем. Іншыя вылічэнні праводзяцца з астатняй сумы. Вылічэнні па выканаўчых дакументах праводзяцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб выканаўчым вядзенні.

3. У папраўчых установах, за выключэннем папраўчых калоній-пасяленняў, на асабовы рахунак асуджаных залічваецца незалежна ад усіх вылічэнняў не менш чым 25 працэнтаў налічанай заработнай платы або іншых даходаў, а на асабовы рахунак асуджаных, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, асуджаных, якія з'яўляюцца інвалідамі I і II групы, непаўналетніх асуджаных, асуджаных цяжарных жанчын, асуджаных жанчын, якія маюць дзяцей у дамах дзіцяці папраўчай установы, – не менш чым 50 працэнтаў налічанай ім заработнай платы або іншых даходаў. На асабовы рахунак асуджаных, абавязаных кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, асуджаных, якія не кампенсавалі ўрон, прычынены злачынствам, маральную шкоду і шкоду, прычыненую жыццю і здароўю грамадзяніна, звязаныя са здзейсненым злачынствам, залічваецца не менш чым 10 працэнтаў налічанай заработнай платы і іншых даходаў.

4. Асуджаным, які адбываюць пакаранне ў папраўчых калоніях-пасяленнях, незалежна ад усіх вылічэнняў выплачваецца не менш чым 50 працэнтаў налічанай ім заработнай платы.

**Артыкул 103. Выключаны**

## ГЛАВА 14
## ВЫХАВАЎЧАЕ ЎЗДЗЕЯННЕ НА АСУДЖАНЫХ ДА ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ

### Артыкул 104. Выхаваўчая праца з асуджанымі да пазбаўлення волі

1. Выхаваўчая праца з асуджанымі да пазбаўлення волі – планамерная дзейнасць работнікаў папраўчых устаноў, прадстаўнікоў дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, накіраваная на фарміраванне і ўмацаванне ў асуджаных імкнення да займання калектыўна карыснай дзейнасцю, добрасумленных адносін да працы, захавання патрабаванняў заканадаўства і прынятых у грамадстве правіл паводзін, на павышэнне іх культурнага ўзроўню.

2. Для дасягнення вызначаных часткай 1 гэтага артыкула мэт у папраўчых установах з асуджанымі праводзяцца выхаваўчыя мерапрыемствы.

3. Наведванне асуджанымі выхаваўчых мерапрыемстваў, якія праводзяцца, з'яўляецца абавязковым. Удзел асуджаных у правядзенні выхаваўчых мерапрыемстваў улічваецца пры вызначэнні ступені іх выпраўлення і прымяненні да іх мер заахвочвання.

4. Выхаваўчая праца праводзіцца з улікам індывідуальных асаблівасцей асобы асуджанага, здзейсненых ім злачынстваў і паводзін у перыяд адбывання пакарання.

5. Для арганізацыі выхаваўчай працы з асуджанымі ў папраўчых установах ствараецца матэрыяльна-тэхнічная база ў адпаведнасці з нормамі, устаноўленымі Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

6. Парадак арганізацыі і правядзення выхаваўчай працы з асуджанымі вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 105. Папячыцельскія саветы**

1. Для аказання дапамогі адміністрацыі папраўчых устаноў у арганізацыі папраўчага працэсу, атрымання асуджанымі агульнай сярэдняй, прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі і праходжання прафесійнай падрыхтоўкі, умацаванні матэрыяльнай базы папраўчай установы, ажыццяўленні сацыяльнай абароны асуджаных, працоўнага і бытавога ўладкавання вызваленых з папраўчых устаноў, а таксама ў мэтах рашэння пытанняў сацыяльнай абароны работнікаў папраўчых устаноў, павышэння іх прафесійнага ўзроўню ў папраўчых установах, а таксама пры тэрытарыяльных і рэспубліканскім органах кіравання папраўчымі ўстановамі могуць стварацца папячыцельскія саветы.

2. Папячыцельскія саветы ствараюцца на правах грамадскіх аб'яднанняў і рэгіструюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. У склад папячыцельскага савета могуць уваходзіць прадстаўнікі дзяржаўных органаў, арганізацый незалежна ад форм уласнасці, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі, грамадскіх аб'яднанняў і рэлігійных арганізацый, дзеячы навукі і культуры, асобныя грамадзяне.

**Артыкул 106. Грамадскія выхавальнікі асуджаных да пазбаўлення волі**

1. Для ўдзелу ў выпраўленні асуджаных да пазбаўлення волі, аказання дапамогі ў працоўным і бытавым уладкаванні вызваленых з папраўчых устаноў дазваляецца дзейнасць грамадскіх выхавальнікаў асуджаных.

2. Грамадскімі выхавальнікамі могуць быць прадстаўнікі дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў і рэлігійных арганізацый, іншыя асобы, здольныя аказваць выхаваўчае ўздзеянне на асуджаных. Грамадскіх выхавальнікаў асуджаных зацвярджае начальнік папраўчай установы.

**Артыкул 107. Псіхалагічная дапамога асуджаным**

1. Асуджаным, якія адбываюць пакаранне ў папраўчых установах, аказваецца псіхалагічная дапамога ў адаптацыі да ўмоў утрымання, пераадоленні канфліктаў, нармалізацыі псіхічнага стану і нейтралізацыі адмоўных установак асобы.

2. Псіхалагічную дапамогу асуджаным аказваюць на добраахвотнай аснове кваліфікаваныя псіхолагі.

**Артыкул 108. Самадзейныя арганізацыі асуджаных**

1. У папраўчых установах у мэтах развіцця карыснай ініцыятывы і самакіравання асуджаных ствараюцца самадзейныя арганізацыі асуджаных, якія працуюць пад кантролем адміністрацыі. Удзел асуджаных у працы самадзейных арганізацый з'яўляецца добраахвотным і ўлічваецца пры вызначэнні ступені іх выпраўлення.

2. Самадзейныя арганізацыі асуджаных удзельнічаюць у паляпшэнні ўмоў працы, навучання, быту і вольнага часу асуджаных, садзейнічаюць абароне праў і законных інтарэсаў асуджаных, аказваюць сацыяльную дапамогу асуджаным і іх сем'ям, дапамагаюць фарміраванню маральных адносін паміж асуджанымі, садзейнічаюць адміністрацыі ў падтрыманні дысцыпліны і парадку, а таксама могуць ажыццяўляць іншую дзейнасць, якая не супярэчыць мэтам, парадку і ўмовам адбывання пакарання.

3. Члены самадзейных арганізацый асуджаных не карыстаюцца дадатковымі льготамі і не валодаюць паўнамоцтвамі адміністрацыі папраўчай установы.

4. Парадак фарміравання і дзейнасці самадзейных арганізацый асуджаных вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

5. У папраўчых установах з ліку асуджаных, якія станоўча зарэкамендавалі сябе, ствараюцца саветы атрадаў і савет папраўчай установы.

6. У турмах і следчых ізалятарах самадзейныя арганізацыі ствараюцца сярод асуджаных, пакінутых для выканання работ па гаспадарчым абслугоўванні. Сярод асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў памяшканнях камернага тыпу, самадзейныя арганізацыі не ствараюцца.

### Артыкул 109. Атрыманне адукацыі асуджанымі да пазбаўлення волі

1. У папраўчых установах арганізуюцца атрыманне асуджанымі да пазбаўлення волі агульнай сярэдняй, прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі і праходжанне прафесійнай падрыхтоўкі, ствараюцца ўмовы для атрымання сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі ў дыстанцыйнай форме, а таксама дадатковай адукацыі. Прафесіянальна-тэхнічная адукацыя і прафесійная падрыхтоўка арганізуюцца па спецыяльнасцях (напрамках спецыяльнасцей, спецыялізацыях, прафесіях), па якіх асуджаныя, улічваючы прысвоеную кваліфікацыю, змогуць працаваць у папраўчай установе і пасля вызвалення з яе. Для атрымання асуджанымі адукацыі ў папраўчых установах мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ствараюць неабходныя ўмовы.

2. Адносіны асуджаных да атрымання адукацыі ўлічваюцца пры вызначэнні ступені іх выпраўлення.

3. Педагагічныя работнікі, якія ажыццяўляюць педагагічную дзейнасць на тэрыторыі папраўчых устаноў, аказваюць дапамогу адміністрацыі папраўчай установы ў правядзенні выхаваўчай працы з асуджанымі.

4. Атрыманне асуджанымі адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

### Артыкул 110. Меры заахвочвання, якія прымяняюцца да асуджаных да пазбаўлення волі

1. За належнае выкананне ўстаноўленых заканадаўствам абавязкаў, добрасумленныя адносіны да працы, навучання, удзел у выхаваўчых мерапрыемствах, працы самадзейных арганізацый асуджаных і іншую карысную дзейнасць да асуджаных могуць прымяняцца наступныя меры заахвочвання:

1) абвяшчэнне падзякі;

2) выключаны;

3) выключаны;

4) дазвол на атрыманне дадатковай пасылкі або перадачы;

5) выключаны;

6) даванне дадатковай кароткатэрміновай або працяглай сустрэчы;

7) дазвол дадаткова расходаваць грошы ў суме да трох базавых велічынь на куплю прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці;

8) павелічэнне дадаткова часу прагулкі асуджаным, якія ўтрымліваюцца ў турме, на адну гадзіну на працягу месяца;

9) перавод асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў папраўчай калоніі асаблівага рэжыму, пасля адбыцця адной трэці тэрміну пакарання з памяшканняў камернага тыпу ў звычайныя жылыя памяшканні;

10) выключаны;

11) датэрміновае зняцце раней накладзенага спагнання.

2. У парадку заахвочвання асуджаным на працягу года можа быць дазволена атрыманне дадаткова да чатырох пасылак або перадач і даванне дадаткова да чатырох сустрэч.

3. Да асуджаных, якія адбываюць пакаранне ў папраўчых калоніях-пасяленнях, могуць прымяняцца меры заахвочвання ў выглядзе дазволу на правядзенне за межамі папраўчай калоніі-пасялення выхадных, дзяржаўных свят і святочных дзён, устаноўленых і аб'яўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь нерабочымі, а таксама кароткатэрміновага выезду да блізкіх сваякоў працягласцю да пяці сутак без уліку часу, неабходнага для праезду туды і назад.

4. Да асуджаных у парадку заахвочвання могуць быць таксама прыменены меры, прадугледжаныя часткамі 2 і 3 артыкула 69 гэтага Кодэкса.

5. Асуджаныя, да якіх ва ўстаноўленых законам выпадках і парадку могуць быць прыменены замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем або ўмоўна-

датэрміновае вызваленне ад пакарання, якія цвёрда сталі на шлях выпраўлення або даказалі сваё выпраўленне, могуць быць адпаведна прадстаўлены да замены неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем або да ўмоўна-датэрміновага вызвалення ад пакарання.

**Артыкул 111. Парадак прымянення мер заахвочвання да асуджаных да пазбаўлення волі**

1. Заахвочванні асуджаным абвяшчаюцца пастановамі службовых асоб папраўчых установ, якія маюць права прымяняць меры заахвочвання.
2. Датэрміновае зняцце раней накладзенага спагнання дапускаецца, як правіла, не раней:
1) аднаго месяца з дня накладання спагнанняў, указаных у пунктах 1 і 2 часткі 1 артыкула 112 гэтага Кодэкса;
2) трох месяцаў з дня накладання спагнанняў, указаных у пунктах 3 і 4 часткі 1 і часткі 3 артыкула 112 гэтага Кодэкса;
3) трох месяцаў з дня адбыцця меры спагнання, указанай у пункце 6 часткі 1 артыкула 112 гэтага Кодэкса;
4) шасці месяцаў з дня адбыцця мер спагнання, указаных у пункце 7 часткі 1 артыкула 112 гэтага Кодэкса.
3. Меры заахвочвання, за выключэннем датэрміновага зняцця раней накладзенага спагнання, прымяняюцца, калі асуджаны не мае спагнанняў.
4. Датэрміновае зняцце раней накладзеных спагнанняў ажыццяўляецца пачаргова, пачынаючы з першага непагашанага спагнання.

**Артыкул 112. Меры спагнання, якія прымяняюцца да асуджаных да пазбаўлення волі**

1. За парушэнне ўстаноўленага парадку адбывання пакарання да асуджаных да пазбаўлення волі могуць прымяняцца наступныя меры спагнання:
1) вымова;
2) пазачарговае дзяжурства па прыбіранні памяшканняў або тэрыторыі папраўчай установы;
3) пазбаўленне права на атрыманне чарговай пасылкі або перадачы;
4) пазбаўленне чарговай працяглай або кароткатэрміновай сустрэчы;
5) выключаны;
6) змяшчэнне асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў папраўчых калоніях і турмах, у штрафны ізалятар з вывадам ці без вываду на працу або навучанне на тэрмін да дзесяці сутак;
7) перавод асуджаных, прызнаных асобамі, якія злосна парушаюць устаноўлены парадак адбывання пакарання, што ўтрымліваюцца ў папраўчых калоніях для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, папраўчых калоніях для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, а таксама асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў звычайных жылых памяшканнях папраўчых калоній асаблівага рэжыму, у памяшканні камернага тыпу на тэрмін да шасці месяцаў; перавод асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў папраўчых калоніях асаблівага рэжыму ў памяшканнях камернага тыпу, у адзіночныя камеры на тэрмін да шасці месяцаў, а ў турмах – на строгі рэжым на тэрмін ад двух да шасці месяцаў; вяртанне асуджаных, пераведзеных у звычайныя жылыя памяшканні папраўчых калоній асаблівага рэжыму ў адпаведнасці з пунктам 9 часткі 1 артыкула 110 гэтага Кодэкса, у памяшканні камернага тыпу.
2. Асуджаныя да пазбаўлення волі цяжарныя жанчыны і кормячыя маці ў штрафны ізалятар, памяшканні камернага тыпу не змяшчаюцца і на строгі рэжым у турме не пераводзяцца.
3. Да асуджаных, якія адбываюць пазбаўленне волі ў папраўчых калоніях-пасяленнях, могуць прымяняцца спагнанні ў выглядзе адмены права пражывання па-за інтэрнатам і забароны выхаду за межы інтэрната ў вольны ад працы час на тэрмін да трыццаці дзён.

4. Да асуджаных, якія злосна парушаюць устаноўлены парадак адбывання пакарання, могуць быць таксама прыменены меры, прадугледжаныя часткай 5 артыкула 69 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 113. Парадак прымянення мер спагнання да асуджаных да пазбаўлення волі**

1. Пры прымяненні мер спагнання да асуджаных улічваюцца абставіны здзяйснення парушэння, асабістыя якасці асуджанага і яго папярэднія паводзіны. Накладзенае спагнанне павінна адпавядаць цяжару і характару парушэння. Не дапускаецца за адно парушэнне накладаць некалькі спагнанняў. За некалькі парушэнняў, здзейсненых адначасова або на працягу адных сутак, можа накладацца адно спагнанне.
2. Спагнанне накладаецца не пазней за дзесяць сутак з дня выяўлення парушэння, а калі ў сувязі з парушэннем праводзілася праверка, – з дня яе заканчэння, але не пазней за тры месяцы з дня здзяйснення парушэння. Спагнанне выконваецца неадкладна, а ў выпадках немагчымасці неадкладнага выканання – не пазней за трыццаць дзён з дня яго накладання.
3. Асуджаны не можа быць падвергнуты спагнанню, не атрымаўшы магчымасці выказацца і даць пісьмовае тлумачэнне ў сваё апраўданне. Службовыя асобы, якія выкарыстоўваюць да асуджаных меры спагнання, павінны ўсебакова і поўна ўлічваць абставіны здзяйснення парушэння, ступень віны асуджанага і яго апраўданні і накладаць спагнанне пасля асабістай размовы з ім.
4. Спагнанні накладаюцца пастановамі службовых асоб папраўчых устаноў, якія маюць права накладаць спагнанні.
5. Пры накладанні спагнання ў выглядзе пазбаўлення права атрымліваць чарговую пасылку або перадачу асуджаны можа быць пазбаўлены бліжэйшай чарговай пасылкі або перадачы, на атрыманне якой ён мае права на момант накладання спагнання. Да выканання дадзенай меры спагнання, а таксама на працягу аднаго месяца пасля яе выканання асуджанаму не дазваляецца атрыманне пасылкі або перадачы, прадугледжаных палепшанымі ўмовамі ўтрымання.
6. Пры накладанні спагнання ў выглядзе пазбаўлення чарговай працяглай або кароткатэрміновай сустрэчы від сустрэчы, якой пазбаўляецца асуджаны, вызначае службовая асоба, якая накладвае дадзенае спагнанне. Асуджаны можа быць пазбаўлены найбліжэйшай сустрэчы, на якую ён мае права на момант накладання спагнання.
7. Змяшчэнне асуджаных у штрафны ізалятар, перавод у памяшканні камернага тыпу і адзіночныя камеры праводзяцца з указаннем тэрміну ўтрымання ў іх.
8. Да асуджаных, пераведзеных у памяшканні камернага тыпу, могуць прымяняцца ўсе меры спагнання, акрамя пераводу ў памяшканні камернага тыпу, а да асуджаных, пераведзеных у адзіночныя камеры калоній асаблівага рэжыму, – усе меры спагнання, акрамя пераводу ў адзіночныя камеры.
9. Прымяненне мер спагнання ў выглядзе змяшчэння ў штрафны ізалятар, пераводу ў памяшканне камернага тыпу або адзіночную камеру ажыццяўляецца толькі пасля агляду асуджанага медыцынскім работнікам, які павінен пісьмова пацвердзіць, што асуджаны здольны перанесці такое спагнанне. Медыцынскі работнік штодзённа наведвае асуджаных, якія адбываюць указанае спагнанне. Медыцынскі работнік абавязаны неадкладна паведамляць пісьмова начальніку папраўчай установы аб неабходнасці прыпынення выканання дадзенага спагнання з-за фізічнага або псіхічнага стану асуджанага.
10. Выкананне спагнання ў выглядзе змяшчэння ў штрафны ізалятар, пераводу ў памяшканне камернага тыпу або адзіночную камеру прыпыняецца з-за медыцынскіх паказанняў рашэннем начальніка папраўчай установы. Выкананне спагнання

аднаўляецца рашэннем начальніка папраўчай установы, які пры гэтым мае права скараціць астатні тэрмін спагнання або прыняць рашэнне аб спыненні яго выканання.

11. Асуджаны мае права абскардзіць рашэнне службовай асобы аб накладанні спагнання вышэйстаячай службовай асобе, пракурору або ў суд. Пры абскарджанні асуджаным рашэння аб накладанні спагнання выкананне яго не прыпыняецца. Пры наяўнасці падстаў спагнанне можа быць адменена або заменена службовай асобай, якая яго прымяніла, або вышэйстаячай службовай асобай, якая мае на гэта права, або адменена пракурорам ці судом. Рашэнне службовай асобы аб накладанні спагнання можа быць абскарджана не пазней аднаго года з моманту накладання спагнання вышэйстаячай службовай асобе або пракурору. Абскарджанне ў суд рашэння службовай асобы аб накладанні спагнання праводзіцца ў парадку, устаноўленым Грамадзянскім працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

12. Асуджаны лічыцца не маючым спагнанняў, калі на працягу аднаго года з дня накладання апошняга спагнання ён не быў падвергнуты новаму спагнанню.

13. Парадак накладання, пагашэння і зняцця спагнання рэгулюецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў.

**Артыкул 114. Умовы ўтрымання асуджаных да пазбаўлення волі ў штрафных ізалятарах, памяшканнях камернага тыпу і адзіночных камерах**

1. Асуджаным да пазбаўлення волі, змешчаным у штрафны ізалятар, забараняюцца працяглыя і кароткатэрміновыя сустрэчы, тэлефонныя размовы, набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці, атрыманне пасылак, перадач, бандэроляў і дробных пакетаў, адпраўленне і атрыманне лістоў, карыстанне настольнымі гульнямі і курэнне. Пасцельныя рэчы ім не выдаюцца, прагулкі не даюцца.

2. Асуджаныя, пераведзеныя ў памяшканні камернага тыпу або ў адзіночныя камеры ў парадку спагнання, маюць права:

1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у адпаведнасці з часткамі 2–6 артыкула 82 гэтага Кодэкса ў памеры адной базавай велічыні;

2) атрымліваць адну бандэроль або дробны пакет на працягу шасці месяцаў;

3) рабіць штодзённую прагулку працягласцю трыццаць хвілін.

2[1]. Пры наяўнасці выключных абставін начальнік папраўчай установы можа даць кароткатэрміновую сустрэчу з асуджаным, змешчаным у штрафны ізалятар, пераведзеным у памяшканне камернага тыпу і адзіночную камеру папраўчай калоніі асаблівага рэжыму.

3. Асуджаныя, змешчаныя ў штрафны ізалятар, а таксама пераведзеныя ў памяшканні камернага тыпу або адзіночныя камеры, працуюць асобна ад іншых асуджаных.

4. Выключана.

5. Датэрміновы перавод асуджаных з памяшканняў камернага тыпу папраўчых калоній для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, папраўчых калоній для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, і адзіночных камер папраўчых калоній асаблівага рэжыму ў звычайныя жылыя памяшканні не дапускаецца, акрамя выпадкаў, калі гэта неабходна з-за стану здароўя асуджанага згодна з медыцынскім заключэннем.

6. Парадак змяшчэння асуджаных у штрафны ізалятар, пераводу ў памяшканні камернага тыпу або адзіночныя камеры вызначаецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў.

Заўвага. Пад выключнымі абставінамі ў частцы $2^1$ гэтага артыкула разумеюцца смерць або цяжкае захворванне блізкага сваяка, якое пагражае яго жыццю, стыхійнае бедства, якое прычыніла значны матэрыяльны ўрон асуджанаму або яго сям'і.

### Артыкул 115. Службовыя асобы папраўчых установ, якія выкарыстоўваюць меры заахвочвання і спагнання да асуджаных да пазбаўлення волі

1. Прымяняць меры заахвочвання і спагнання ў поўным аб'ёме маюць права начальнікі папраўчых установ, а таксама вышэйстаячыя службовыя асобы, пералік якіх устанаўліваецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых установ.
2. Намеснікі начальнікаў папраўчых установ маюць права прымяняць меры заахвочвання, указаныя ў пунктах 1, 4–8 часткі 1 артыкула 110 гэтага Кодэкса, а таксама накладаць спагнанні, указаныя ў пунктах 1–4 часткі 1 артыкула 112 гэтага Кодэкса.
3. Выключана.
4. Начальнікі атрадаў маюць права прымяняць меры заахвочвання ў выглядзе абвяшчэння падзякі, а таксама накладаць спагнанні ў выглядзе вымовы або пазачарговага дзяжурства па прыбіранні памяшканняў і тэрыторыі папраўчай установы.
5. Датэрмінова здымаць спагнанні з асуджанага маюць права службовыя асобы, якія наклалі спагнанні, а таксама вышэйстаячыя службовыя асобы.

### Артыкул 116. Крытэрыі і ступень выпраўлення асуджаных да пазбаўлення волі

1. Ступень выпраўлення асуджанага да пазбаўлення волі вызначаецца адміністрацыяй папраўчай установы па выніках атэстацыі асуджанага на падставе ўсебаковага вывучэння яго асобы і ацэнкі паводзін у перыяд адбывання пакарання ў частцы адпаведнасці асуджанага крытэрыям, прадугледжаным часткамі 3–5 гэтага артыкула.
2. Асуджаны можа быць прызнаны стаўшым на шлях выпраўлення, цвёрда стаўшым на шлях выпраўлення і даказаўшым сваё выпраўленне пасля адбыцці не менш чым адной чвэрці тэрміну пакарання.
3. Стаўшым на шлях выпраўлення можа быць прызнаны асуджаны, калі ён прыняў пісьмовае абавязацельства аб правапаслухмяных паводзінах, не мае спагнанняў, добрасумленна адносіцца да працы або навучання, выканання работ па калектыўным самаабслугоўванні, прыбіранні і добраўпарадкаванні папраўчых установ і тэрыторый, якія мяжуюць з імі, і праяўляе карысную ініцыятыву ў іншай калектыўна карыснай дзейнасці, а асуджаны, які не пагасіў да пастановы прыгавору ўрон, прычынены злачынствам, – калі ён таксама прыняў усё залежныя ад яго меры для пакрыцця ўрону.
4. Цвёрда стаўшым на шлях выпраўлення можа быць прызнаны асуджаны, калі яго паводзіны адпавядаюць крытэрыям, указаным у частцы 3 гэтага артыкула, і сведчаць аб устойлівым імкненні да правапаслухмяных паводзін.
5. Даказаўшым сваё выпраўленне можа быць прызнаны асуджаны, калі яго паводзіны адпавядаюць крытэрыям, указаным у частцы 3 гэтага артыкула, і сведчаць аб тым, што ў асуджанага сфарміравана гатоўнасць весці правапаслухмяны лад жыцця.
6. Парадак атэстацыі асуджаных устанаўлівае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 117. Злоснае парушэнне асуджанымі да пазбаўлення волі ўстаноўленага парадку адбывання пакарання

1. Адміністрацыяй папраўчай установы прызнае асуджанага да пазбаўлення волі злосным парушальнікам устаноўленага парадку адбывання пакарання на працягу тэрміну дзеяння спагнанняў, калі ён мае не менш чым:

1) чатыры спагнанні, прадугледжаныя пунктамі 1 і 2 часткі 1 артыкула 112 гэтага Кодэкса, а для асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў выхаваўчых калоніях, – пунктамі 1 і 2 артыкула 129 гэтага Кодэкса;
2) тры спагнанні, адно з якіх прадугледжана пунктамі 3 і 4 часткі 1 артыкула 112 гэтага Кодэкса, а для асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў выхаваўчых калоніях, – пунктамі 3 і 4 артыкула 129 гэтага Кодэкса;
3) два спагнанні, адно з якіх прадугледжана пунктам 6 часткі 1 артыкула 112 гэтага Кодэкса, а для асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў выхаваўчых калоніях, – пунктам 5 артыкула 129 гэтага Кодэкса.
2. Злосным парушальнікам установленага парадку адбывання пакарання на працягу аднаго года прызнаецца асуджаны, што здзейсніў у перыяд адбывання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі наўмыснае злачынства, за якое ён асуджаны да пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі, а таксама асуджаны, якому пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі было заменена больш мяккім пакараннем або які быў вызвалены ад пакарання ўмоўна-датэрмінова ці датэрмінова на падставе акта амністыі ці акта памілавання і здзейсніў на працягу неадбытага тэрміну пакарання наўмыснае злачынства, за якое быў асуджаны да пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі.
3. Тэрмін, на працягу якога асуджаны прызнаецца злосным парушальнікам установленага парадку адбывання пакарання ў адпаведнасці з часткай 2 гэтага артыкула, лічыцца з дня змяшчэння пад варту асобы, асуджанай да пазбаўлення волі за наўмыснае злачынства, здзейсненае ў перыяд адбывання пакарання або на працягу неадбытай часткі тэрміну пакарання.
4. Адміністрацыя папраўчай установы пры правядзенні атэстацыі прызнае асуджанага злосным парушальнікам установленага парадку адбывання пакарання і спыняе прызнанне асуджанага злосным парушальнікам установлены парадку адбывання пакарання .

## ГЛАВА 15
## АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАНАННЯ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ Ў ПАПРАЎЧЫХ УСТАНОВАХ РОЗНЫХ ВІДАЎ І ВА ЎМОВАХ РОЗНЫХ РЭЖЫМАЎ

### Артыкул 118. Адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму маюць права:
1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памеры шасці базавых велічынь у парадку, які вызначаецца часткамі 2–6 артыкула 82 гэтага Кодэкса;
2) мець тры кароткатэрміновыя і тры працяглыя сустрэчы на працягу года;
3) атрымліваць чатыры пасылкі або перадачы і дзве бандэролі або два дробныя пакеты на працягу года.
2. Асуджаным да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму, пераведзеным на палепшаныя ўмовы ўтрымання, дазваляецца дадаткова:
1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памеры чатырох базавых велічынь у парадку, які вызначаецца часткамі 2–6 артыкула 82 гэтага Кодэкса;
2) мець дзве кароткатэрміновыя і дзве працяглыя сустрэчы на працягу года;
3) атрымліваць дзве пасылкі або перадачы і тры бандэролі або два дробных пакеты на працягу года.

**Артыкул 119. Адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму**

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму маюць права:

1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памеры пяці базавых велічынь у парадку, які вызначаецца часткамі 2–6 артыкула 82 гэтага Кодэкса;

2) мець тры кароткатэрміновыя і дзве працяглыя сустрэчы на працягу года;

3) атрымліваць тры пасылкі або перадачы і дзве бандэролі або два дробных пакеты на працягу года.

2. Асуджаным да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму, пераведзеным на палепшаныя ўмовы ўтрымання, дазваляецца дадаткова:

1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памеры трох базавых велічынь у парадку, які вызначаецца часткамі 2–6 артыкула 82 гэтага Кодэкса;

2) мець дзве кароткатэрміновыя і дзве працяглыя сустрэчы на працягу года;

3) атрымліваць дзве пасылкі або перадачы і тры бандэролі або два дробных пакеты на працягу года.

**Артыкул 120. Адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ва ўмовах строгага рэжыму**

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах строгага рэжыму маюць права:

1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памеры чатырох базавых велічынь у парадку, які вызначаецца часткамі 2–6 артыкула 82 гэтага Кодэкса;

2) мець дзве кароткатэрміновыя і дзве працяглыя сустрэчы на працягу года;

3) атрымліваць дзве пасылкі або перадачы і дзве бандэролі або два дробных пакеты на працягу года.

2. Асуджаным да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах строгага рэжыму, пераведзеным на палепшаныя ўмовы ўтрымання, дазваляецца дадаткова:

1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памеры дзвюх базавых велічынь у парадку, які вызначаецца часткамі 2–6 артыкула 82 гэтага Кодэкса;

2) мець адну кароткатэрміновую і адну працяглую сустрэчу на працягу года;

3) атрымліваць адну пасылку або перадачу і дзве бандэролі або два дробных пакеты на працягу года.

**Артыкул 121. Адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ва ўмовах асаблівага рэжыму**

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах асаблівага рэжыму маюць права:

1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памеры трох базавых велічынь у парадку, які вызначаецца часткамі 2–6 артыкула 82 гэтага Кодэкса;

2) мець дзве кароткатэрміновыя і адну працяглую сустрэчу на працягу года;

3) атрымліваць адну пасылку або перадачу і дзве бандэролі або два дробных пакеты на працягу года.

2. Асуджаным да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах асаблівага рэжыму, пераведзеным на палепшаныя ўмовы ўтрымання, дазваляецца дадаткова:

1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памеры адной базавай велічыні ў парадку, які вызначаецца часткамі 2–6 артыкула 82 гэтага Кодэкса;

2) мець адну кароткатэрміновую і адну працяглую сустрэчу на працягу года;

3) атрымліваць адну пасылку або перадачу і дзве бандэролі або два дробныя пакеты на працягу года.

3. Асуджаным да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах асаблівага рэжыму, якія ўтрымліваюцца ў памяшканнях камернага тыпу, дазваляецца мець штодзённую прагулку працягласцю да дзвюх гадзін.

**Артыкул 122. Адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ва ўмовах пасялення**

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах пасялення ўтрымліваюцца ў адных і тых жа ўмовах.

2. Асобна ў адной папраўчай калоніі-пасяленні могуць утрымлівацца асуджаныя мужчыны і жанчыны.

3. Асуджаныя да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах пасялення:

1) утрымліваюцца без аховы, але пад наглядам; у час ад пад’ёму да адбою карыстаюцца правам свабоднага перамяшчэння ў межах тэрыторыі папраўчай калоніі-пасялення; з дазволу адміністрацыі папраўчай калоніі-пасялення могуць перамяшчацца без нагляду па-за папраўчай калоніяй-пасяленнем, але ў межах тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, калі гэта неабходна па характары працы, якая выконваецца імі, або ў сувязі з навучаннем;

2) пражываюць, як правіла, у спецыяльна прызначаных для іх інтэрнатах. Асуджаным, якія не дапускаюць парушэнняў устаноўленага парадку адбывання пакарання і маюць сем’і, пастановай начальніка папраўчай калоніі-пасялення можа быць дазволена пражыванне са сваімі сем'ямі ў жылым памяшканні, якое належыць ім на праве ўласнасці або займаецца імі па дагаворы найму (паднайму) жылога памяшкання на тэрыторыі папраўчай калоніі-пасялення або за яе межамі. Гэтыя асуджаныя абавязаны з'яўляцца для рэгістрацыі ў папраўчую калонію-пасяленне да чатырох разоў на месяц. Перыядычнасць рэгістрацыі ўстанаўліваецца пастановай начальніка папраўчай калоніі-пасялення. Жылыя памяшканні, у якіх пражываюць асуджаныя, могуць наведваць у любы час прадстаўнікі адміністрацыі папраўчай калоніі-пасялення. Асуджаныя, якія пражываюць у жылым памяшканні, што належыць ім на праве ўласнасці або займаецца імі па дагаворы найму (паднайму) жылога памяшкання, абавязаны ў вольны ад працы (навучання) час пастаянна знаходзіцца ў сваім жыллі або на прыдамавой тэрыторыі, не адыходзячы ад жылля далей за адлегласць, вызначаную адміністрацыяй папраўчай калоніі-пасялення, а з дзевятнаццаці да шасці гадзін – толькі ў сваім жыллі. Калі рэжым рабочага часу або расклад заняткаў асуджанага не дазваляюць яму знаходзіцца ва ўказаны час у сваім жыллі, адміністрацыя папраўчай калоніі-пасялення ўстанаўлівае іншы час пастаяннага знаходжання асуджанага ў яго жыллі. Час выхаду асуджанага за межы адлегласці ад жылля, вызначанай адміністрацыяй папраўчай калоніі-пасялення, на працу (навучанне) устанаўліваецца на аснове рэжыму рабочага часу або раскладу заняткаў і часу, неабходнага на дарогу. Выхад асуджанага за межы ўказанай адлегласці для наведвання арганізацый аховы здароўя, сувязі, гандлю, бытавога абслугоўвання і іншых арганізацый дапускаецца толькі ў межах населенага пункта да дзвюх гадзін на дзень у час, устаноўлены адміністрацыяй папраўчай калоніі-пасялення. Асуджаным забараняецца

наведванне месцаў правядзення фізкультурна-аздараўленчых, спартыўна-масавых, культурных мерапрыемстваў, іграальных устаноў, а таксама гандлёвых аб'ектаў, дзе ажыццяўляецца распіванне алкагольных, слабаалкагольных напояў, піва, жылля іншых асоб;

3) маюць пасведчанне асуджанага, узор і парадак выдачы якога зацвярджае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Дакумент, які сведчыць асобу, і іншыя асабістыя дакументы асуджаных захоўваюцца ў іх асабістых справах.

4. Асуджаныя да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах пасялення маюць права:

1) насіць адзенне, прынятае ў грамадзянскім ужытку;

2) мець пры сабе грошы, а асуджаныя, якія пражываюць з сем'ямі, – і каштоўныя рэчы, каштоўныя паперы;

3) расходаваць грошы без абмежавання;

4) атрымліваць пасылкі, перадачы, бандэролі і дробныя пакеты без абмежавання;

5) мець сустрэчы без абмежавання.

5. Выключана.

6. Асуджаным, якія пражываюць з сем'ямі на тэрыторыі папраўчай калоніі-пасялення і па-за яе межамі, забараняецца набываць, захоўваць і выкарыстоўваць:

1) прадметы, вырабы і рэчывы, знятыя з грамадзянскага абарачэння;

2) алкагольныя, слабаалкагольныя напоі, піва;

3) усе віды агнястрэльнай і халоднай зброі;

4) аўтамотатранспарт, маторныя лодкі.

7. Праца асуджаных да пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах пасялення рэгулюецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб працы, за выключэннем правіл прыёму на працу, звальнення з працы і пераводу на іншую працу. Адміністрацыя арганізацый, у якіх працуюць асуджаныя, па ўзгадненні з адміністрацыяй папраўчай калоніі-пасялення можа пераводзіць іх на іншую працу, у тым ліку ў іншую мясцовасць.

8. Права на адукацыю асуджанымі, якія адбываюць пакаранне ў папраўчай калоніі ва ўмовах пасялення, ажыццяўляецца шляхам атрымання імі асноўнай адукацыі ў завочнай форме атрымання адукацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 123. Парадак размяшчэння і ўмовы ўтрымання асуджаных у бальніцах і лячэбных папраўчых установах**

1. Ізалявана ад іншых катэгорый асуджаных у лячэбных папраўчых установах крымінальна-выканаўчай сістэмы ўтрымліваюцца асобы, якія адбываюць пажыццёвае зняволенне і адбываюць пакаранне ў турмах і папраўчых калоніях асаблівага рэжыму ў памяшканнях камернага тыпу. Гэтыя асуджаныя ўтрымліваюцца ў спецыялізаваных палатах з захаваннем санітарных норм, правіл і гігіенічных нарматываў, устаноўленых для арганізацый аховы здароўя.

2. Да асуджаных, якія парушаюць дысцыпліну ў лячэбных папраўчых установах, прымяняюцца меры спагнання ў парадку, вызначаным крымінальна-выканаўчым заканадаўствам, за выключэннем пераводу ў памяшканні камернага тыпу. У выпадках беспаспяховага прымянення да іх дысцыплінарнага ўздзеяння яны могуць пераводзіцца ў спецыялізаваныя палаты на тэрмін да шасці месяцаў па пастанове начальніка лячэбнай папраўчай установы. Датэрміновы перавод са спецыялізаваных палат у бальніцу праводзіцца толькі ў выпадках, калі гэта неабходна з-за стану здароўя асуджаных.

3. Умовы ўтрымання асуджаных, пераведзеных у спецыялізаваныя палаты ў парадку дысцыплінарнага спагнання, вызначаюцца артыкулам 114 гэтага Кодэкса як для асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў памяшканнях камернага тыпу, за наступным выключэннем: асуджаныя, што ўтрымліваюцца ў спецыялізаваных палатах у парадку

дысцыплінарнага спагнання, забяспечваюцца пасцельнымі рэчамі, харчаваннем па нормах лячэбнай папраўчай установы, праходзяць курс лячэння па прызначэнні ўрача-спецыяліста, маюць права на прагулку працягласцю да дзвюх гадзін на дзень. На такіх асуджаных не распаўсюджваецца права атрымання дадатковых пасылак або перадач.

4. Асобы, якія знаходзяцца ў лячэбнай папраўчай установе і пераведзены ў спецыялізаваныя палаты ў парадку дысцыплінарнага спагнання, па меры вылячэння і вяртання ў свае ўстановы неадбытую частку пакарання працягваюць адбываць у памяшканнях камернага тыпу.

5. Сустрэчы асуджаным, які знаходзіцца ў лячэбных папраўчых установах, даюцца ў парадку, устаноўленым для адпаведных відаў папраўчых устаноў. Пры наяўнасці медыцынскіх проціпаказанняў сустрэчы асуджаных з непаўналетнімі не дапускаюцца.

6. У выпадку цяжкага захворвання асуджанага, якое ставіць у небяспеку яго жыццё, начальнік лячэбнай папраўчай установы або бальніцы можа дазволіць яму сустрэчу з блізкімі сваякамі. Такое наведванне ў лік чарговай сустрэчы не залічваецца.

7. Асуджаным дазваляецца атрымліваць пасылкі, перадачы, бандэролі або дробныя пакеты па нормах, устаноўленых для адпаведных відаў рэжыму.

8. У лячэбных папраўчых установах, якія маюць у сваёй структуры псіхіятрычныя і інфекцыйныя аддзяленні (палаты), устанаўліваецца рэжым, які забяспечвае ізаляцыю хворых асоб.

9. Праца асуджаных, якія знаходзяцца ў лячэбных папраўчых установах, рэгулюецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб працы і нарматыўнымі прававымі актамі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь і Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

## Артыкул 124. Турмы

1. У турмах утрымліваюцца асуджаныя да пазбаўлення волі ў выглядзе зняволення ў турме, а таксама асуджаныя, пераведзеныя ў турму на тэрмін да трох гадоў за парушэнне рэжыму ўтрымання ў папраўчых калоніях для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, папраўчых калоніях для асоб, якія раней адбывалі пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, і папраўчых калоніях асаблівага рэжыму.

2. У турмах існуюць агульны і строгі рэжымы.

3. На строгім рэжыме ўтрымліваюцца асуджаныя, якія паступілі ў дадзеную папраўчую ўстанову, і асуджаныя, пераведзеныя з агульнага рэжыму.

4. На строгім рэжыме не могуць утрымлівацца асуджаныя цяжарныя жанчыны і жанчыны, якія маюць пры сабе малалетніх дзяцей, а таксама асуджаныя, якія з'яўляюцца інвалідамі I і II групы.

5. Пасля адбыцця не менш чым шасці месяцаў тэрміну пакарання на строгім рэжыме асуджаныя могуць быць пераведзены на агульны рэжым.

## Артыкул 125. Умовы адбывання пакарання ў турме

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі ўтрымліваюцца ў турмах у агульных камерах, якія запіраюцца. У неабходных выпадках па пастанове начальніка турмы і са згоды пракурора яны могуць утрымлівацца ў адзіночных камерах.

2. Асуджаныя размяшчаюцца ў камерах з захаваннем патрабаванняў, прадугледжаных артыкулам 71 гэтага Кодэкса. Акрамя таго, асобна ўтрымліваюцца асуджаныя, якія знаходзяцца на агульным і строгім рэжымах. Асобна ад іншых утрымліваюцца асуджаныя, пакінутыя ў турме для выканання работ па гаспадарчым абслугоўванні.

3. Прагулкі асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў турме, праводзяцца пакамерна ў дзённы час на спецыяльна абсталяванай на адкрытым паветры частцы тэрыторыі турмы. Прагулка асуджанага можа быць датэрмінова спынена ў выпадку парушэння ім устаноўленых правіл унутранага распарадку.

4. Асуджаным, якія адбываюць пакаранне на агульным рэжыме, дазваляецца:
1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памеры дзвюх базавых велічынь у парадку, які вызначаецца часткамі 2–6 артыкула 82 гэтага Кодэкса;
2) мець дзве кароткатэрміновыя сустрэчы на працягу года;
3) атрымліваць адну пасылку або перадачу і дзве бандэролі або два дробныя пакеты на працягу года;
4) мець штодзённую прагулку працягласцю да паўтары гадзіны.
5. Асуджаным, якія адбываюць пакаранне на строгім рэжыме, дазваляецца:
1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памеры адной базавай велічыні ў парадку, які вызначаецца часткамі 2–6 артыкула 82 гэтага Кодэкса;
2) мець адну кароткатэрміновую сустрэчу на працягу года;
3) атрымліваць адну бандэроль або адзін дробны пакет на працягу года;
4) карыстацца штодзённай прагулкай працягласцю адну гадзіну.
6. Для асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў турме, перавод на палепшаныя ўмовы ўтрымання не прадугледжваецца.

## ГЛАВА 16
## АСАБЛІВАСЦІ АДБЫВАННЯ ПАКАРАННЯ У ВЫХАВАЎЧЫХ КАЛОНІЯХ

### Артыкул 126. Умовы адбывання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі ў выхаваўчых калоніях

1. Асуджаныя, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі ў выхаваўчых калоніях, пражываюць у інтэрнатах і маюць права:
1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памеры трох базавых велічынь;
2) мець восем кароткатэрміновых і чатыры працяглыя сустрэчы на працягу года;
3) атрымліваць шэсць пасылак або перадач і дзве бандэролі або два дробныя пакеты на працягу года.
2. Асуджаным, пераведзеным на палепшаныя ўмовы ўтрымання, дазваляецца дадаткова:
1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памеры дзвюх базавых велічынь;
2) мець дзве кароткатэрміновыя і дзве працяглыя сустрэчы на працягу года;
3) атрымліваць дзве пасылкі або перадачы на працягу года.

### Артыкул 127. Меры заахвочвання, якія прымяняюцца да асуджаных у выхаваўчых калоніях

За належнае выкананне ўстаноўленых абавязкаў, добрасумленныя адносіны да працы, навучання, удзел у правядзенні выхаваўчых мерапрыемстваў, рабоце самадзейных арганізацый асуджаных і іншую карысную дзейнасць да асуджаных могуць прымяняцца наступныя меры заахвочвання:
1) абвяшчэнне падзякі;
2) выключаны;
3) выключаны;
4) дазвол на атрыманне дадаткова да чатырох пасылак або перадач у год;
5) выключаны;
6) даванне дадаткова да чатырох кароткатэрміновых сустрэч у год;
7) дазвол дадаткова расходаваць грошы ў памеры да адной базавай велічыні на куплю прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці;

8) даванне права наведвання культурна-відовішчных і спартыўных мерапрыемстваў за межамі выхаваўчай калоніі ў суправаджэнні работнікаў калоніі;

9) дазвол пасля адбыцця не менш чым адной чвэрці тэрміну пакарання сустрэчы з бацькамі або асобамі, іх якія замяняюць, або іншымі блізкімі сваякамі за межамі ўстановы;

10) выключаны;

11) датэрміновае зняцце раней накладзенага спагнання.

**Артыкул 128. Асаблівасці прымянення мер заахвочвання да асуджаных у выхаваўчых калоніях**

1. Пры прымяненні меры заахвочвання, указанай у пункце 9 артыкула 127 гэтага Кодэкса, у пастанове ўказваюцца асобы, з якімі дазваляецца сустрэча за межамі выхаваўчай калоніі.

2. Асуджаным, да якіх прымяняюцца меры заахвочвання, указаныя ў пунктах 8 і 9 артыкула 127 гэтага Кодэкса, выдаецца адзенне, прынятае ў грамадзянскім ужытку, якое належыць ім. Працягласць выхаду за межы выхаваўчай калоніі не павінна перавышаць восем гадзін у дзённы час.

**Артыкул 129. Меры спагнання, якія прымяняюцца да асуджаных у выхаваўчых калоніях**

За парушэнне ўстаноўленага парадку адбывання пакарання да асуджаных у выхаваўчых калоніях могуць прымяняцца наступныя меры спагнання:

1) вымова;

2) пазачарговае дзяжурства па прыбіранні памяшканняў або тэрыторыі выхаваўчай калоніі;

3) пазбаўленне права на атрыманне чарговай пасылкі або перадачы;

4) пазбаўленне чарговай сустрэчы;

5) змяшчэнне ў дысцыплінарны ізалятар на тэрмін да сямі сутак.

**Артыкул 130. Парадак прымянення мер спагнання да асуджаных у выхаваўчых калоніях**

1. Пры прымяненні мер спагнання да асуджаных у выхаваўчых калоніях захоўваюцца агульныя патрабаванні, выкладзеныя ў артыкуле 113 гэтага Кодэкса.

2. Асуджаным, змешчаным у дысцыплінарны ізалятар, забараняюцца тэлефонныя размовы, набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці, атрыманне пасылак, перадач, бандэроляў і дробных пакетаў, карыстанне настольнымі гульнямі і курэнне, адпраўленне лістоў. Яны маюць права на штодзённую прагулку працягласцю адну гадзіну. Пасцельныя рэчы выдаюцца ім толькі на перыяд сну.

3. Да асуджаных, змешчаных у дысцыплінарны ізалятар, могуць прымяняцца ўсе меры спагнання, у тым ліку і паўторнае змяшчэнне ў дысцыплінарны ізалятар, але не больш чым два разы.

4. Начальнік выхаваўчай калоніі можа датэрмінова вызваліць асуджанага з дысцыплінарнага ізалятара з-за медыцынскіх паказанняў або зыходзячы з педагагічнай мэтазгоднасці.

**Артыкул 131. Службовыя асобы выхаваўчай калоніі, якія прымяняюць меры заахвочвання і спагнання да асуджаных**

1. Правам прымянення мер заахвочвання і спагнання ў поўным аб'ёме карыстаюцца начальнікі выхаваўчых калоній, а таксама вышэйстаячыя службовыя асобы, пералік якіх устанаўліваецца Правіламі ўнутранага распарадку папраўчых устаноў.

2. Намеснікі начальнікаў выхаваўчых калоній маюць права прымяняць меры заахвочвання, указаныя ў пунктах 1, 4–7 артыкула 127 гэтага Кодэкса, у тым ліку ў выглядзе датэрміновага зняцця раней накладзенага імі спагнання, а таксама накладаць спагнанні, указаныя ў пунктах 1–4 артыкула 129 гэтага Кодэкса.

3. Начальнікі атрадаў маюць права прымяняць заахвочванні ў выглядзе абвяшчэння падзякі, датэрміновага зняцця раней накладзенага імі спагнання, а таксама накладаць спагнанні ў выглядзе вымовы і пазачарговага дзяжурства па прыбіранні памяшканняў або тэрыторыі выхаваўчай калоніі.

**Артыкул 132. Пакіданне ў выхаваўчых калоніях асуджаных, якія дасягнулі паўналецця**

1. Асуджаныя да пазбаўлення волі, якія дасягнулі васямнаццацігадовага ўзросту, як правіла, працягваюць адбываць пакаранне ў выхаваўчай калоніі да дасягнення імі ўзросту дваццаці аднаго года.
2. Асуджаных, якія дасягнулі васямнаццацігадовага ўзросту, пакідаюць у выхаваўчай калоніі па матываванай пастанове начальніка выхаваўчай калоніі, узгодненай з камісіяй па справах непаўналетніх.
3. На асуджаных, якія дасягнулі васямнаццацігадовага ўзросту і пакінуты ў выхаваўчай калоніі, распаўсюджваюцца ўмовы адбывання пакарання, нормы харчавання і матэрыяльна-бытавога забеспячэння, устаноўленыя для непаўналетніх асуджаных. Умовы працы асуджаных, якія дасягнулі васямнаццацігадовага ўзросту, устанаўліваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб працы.
4. У выключных выпадках тэрмін знаходжання ў выхаваўчай калоніі асуджаным, які дасягнуў узросту дваццаці аднаго года, можа быць прадоўжаны кожны раз яшчэ да аднаго года па матываванай пастанове начальніка выхаваўчай калоніі, узгодненай з камісіяй па справах непаўналетніх і санкцыянаванай пракурорам.

**Артыкул 133. Перавод асуджаных з выхаваўчых калоній у папраўчыя ўстановы**

1. Асуджаныя, якія дасягнулі васямнаццацігадовага ўзросту, для далейшага адбывання пакарання могуць пераводзіцца з выхаваўчай калоніі ў папраўчую калонію для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, з адбываннем пакарання ва ўмовах агульнага рэжыму. Рашэнне аб пераводзе прымаецца з улікам цяжару здзейсненага злачынства, астатняга тэрміну адбывання пакарання і неабходнасці завяршэння агульнай сярэдняй (сярэдняй спецыяльнай) адукацыі.
2. Рашэнне аб пераводзе ў папраўчую калонію асуджанага, які дасягнуў васямнаццацігадовага ўзросту, прымае суд па прадстаўленні начальніка выхаваўчай калоніі, узгодненым з камісіяй па справах непаўналетніх і рэспубліканскім органам кіравання папраўчымі ўстановамі.
3. Асуджаныя, якія дасягнулі ўзросту дваццаці аднаго года і больш, пераводзяцца для далейшага адбывання пакарання з выхаваўчай калоніі ў папраўчую калонію для асоб, якія ўпершыню адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, з адбываннем пакарання ва ўмовах агульнага рэжыму па пастанове начальніка выхаваўчай калоніі, узгодненай з рэспубліканскім органам кіравання папраўчымі ўстановамі.

**Артыкул 134. Арганізацыя адукацыйнага працэсу і выхаваўчай працы ў выхаваўчай калоніі**

1. Адукацыйны працэс у выхаваўчай калоніі арганізуецца і ажыццяўляецца ў спалучэнні з выхаваўчай працай.
2. Для павышэння эфектыўнасці выхаваўчага ўздзеяння на асуджаных і аказання дапамогі адміністрацыі выхаваўчай калоніі пры атрадах у выхаваўчай калоніі могуць ствараецца бацькоўскія камітэты з бацькоў і іншых сваякоў асуджаных. Дзейнасць бацькоўскіх камітэтаў рэгулюецца палажэннем, якое зацвярджае начальнік выхаваўчай калоніі.

**Артыкул 135. Дзейнасць камісіі па справах непаўналетніх**

1. У выпраўленні асуджаных да пазбаўлення волі ў выхаваўчых калоніях, а таксама ў ажыццяўленні грамадскага кантролю за дзейнасцю гэтых калоній удзельнічаюць камісіі па справах непаўналетніх пры мясцовых выканаўчых і распарадчых органах.

2. Задачы і правы камісій па справах непаўналетніх і арганізацыя іх працы ўстанаўліваюцца гэтым Кодэксам і Палажэннем аб камісіях па справах непаўналетніх.

# РАЗДЗЕЛ V
# ВЫКАНАННЕ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА АСУДЖАНЫХ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ АБМЕЖАВАННЯ ПА ВАЕННАЙ СЛУЖБЕ І АРЫШТУ

## ГЛАВА 17
## ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ АБМЕЖАВАННЯ ПА ВАЕННАЙ СЛУЖБЕ

### Артыкул 136. Абавязкі камандзіра (начальніка) воінскай часці па выкананні пакарання ў выглядзе абмежавання па ваеннай службе

1. Камандзір (начальнік) воінскай часці ў адпаведнасці з прыгаворам суда не пазней за тры дні пасля атрымання з суда копіі або выпіскі з прыгавору і распараджэння аб яго выкананні аддае пісьмовы загад, у якім пазначае, на якой падставе і на працягу якога тэрміну асуджаны ваеннаслужачы не прадстаўляецца да павышэння ў пасадзе і прысваення чарговага воінскага звання, які тэрмін яму не залічваецца ў выслугу гадоў для прысваення чарговага воінскага звання. Акрамя таго, указваецца, у якім памеры павінна праводзіцца згодна з прыгаворам вылічэнне ў даход дзяржавы з грашовага забеспячэння асуджанага ў перыяд адбывання ім пакарання. Загад даводзіцца да ведама асуджанага ваеннаслужачага.

2. Аб выкананні прыгавору камандзір (начальнік) воінскай часці на працягу трох дзён паведамляе суду, які пастанавіў прыгавор.

### Артыкул 137. Вылічэнні з грашовага забеспячэння асуджанага ваеннаслужачага

Устаноўлены прыгаворам суда памер вылічэння з грашовага забеспячэння асуджанага ваеннаслужачага вылічваецца з акладаў па пасадзе і воінскім званні.

### Артыкул 138. Перамяшчэнне па службе асуджанага ваеннаслужачага

1. У парадку выканання пакарання на працягу вызначанага прыгаворам суда тэрміну асуджаны да абмежавання па ваеннай службе ваеннаслужачы можа быць ва ўстаноўленым парадку пераведзены на роўную пасаду.

2. Калі з улікам характару здзейсненага злачынства і іншых абставін асуджаны ваеннаслужачы не можа быць пакінуты на пасадзе, звязанай з кіраваннем падначаленымі, то па рашэнні адпаведнага камандзіра (начальніка) воінскай часці ён пераводзіцца на іншую пасаду як у межах сваёй воінскай часці, так і ў іншую часць або мясцовасць. Пры гэтым асуджаны ваеннаслужачы на працягу тэрміну пакарання не можа быць павышаны ў пасадзе.

### Артыкул 139. Выхаваўчая праца з асуджанымі ваеннаслужачымі

З асуджанымі ваеннаслужачымі, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе абмежавання па ваеннай службе, камандзір (начальнік) воінскай часці арганізуе і праводзіць выхаваўчую працу з улікам характару і ступені грамадскай небяспекі здзейсненага злачынства і асобы асуджанага, а таксама яго паводзін і адносін да ваеннай службы.

### Артыкул 140. Спыненне выканання пакарання ў выглядзе абмежавання па ваеннай службе

Не пазней за тры дні да сканчэння ўстаноўленага прыгаворам суда і аб'яўленага загадам па воінскай часці тэрміну абмежавання па ваеннай службе камандзір (начальнік) воінскай часці аддае загад аб спыненні выканання пакарання з указаннем даты спынення.

**Артыкул 141. Вызваленне ад пакарання або замена пакарання асуджанаму да абмежавання па ваеннай службе**

У выпадку ўзнікнення ў перыяд адбывання асуджаным ваеннаслужачым пакарання ў выглядзе абмежавання па ваеннай службе абставін, прадугледжаных часткай 3 артыкула 53 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, а таксама іншых абставін, якія з'яўляюцца падставай для звальнення з ваеннай службы ў адпаведнасці з заканадаўствам, суд па прадстаўленні органа, на які ўскладзена выкананне прыгавору, вызваляе асуджанага ад далейшага адбывання пакарання або замяняе неадбытую частку пакарання больш мяккім пакараннем.

## ГЛАВА 18
## ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ АРЫШТУ У ДАЧЫНЕННІ ДА АСУДЖАНЫХ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ

**Артыкул 142. Месцы адбывання арышту асуджанымі ваеннаслужачымі**

Ваеннаслужачыя, асуджаныя да арышту, адбываюць пакаранне ў адпаведных аддзяленнях гаўптвахт ваенных камендатур.

**Артыкул 143. Асобнае ўтрыманне асуджаных ваеннаслужачых**

1. Асуджаныя ваеннаслужачыя з ліку асоб афіцэрскага складу ўтрымліваюцца асобна ад іншых катэгорый асуджаных ваеннаслужачых.

2. Асуджаныя ваеннаслужачыя, якія маюць званні прапаршчыкаў, мічманаў, утрымліваюцца асобна ад іншых катэгорый асуджаных ваеннаслужачых, а якія маюць званні старшын і сяржантаў, – асобна ад асуджаных ваеннаслужачых радавога складу.

3. Асуджаныя ваеннаслужачыя, якія праходзяць ваенную службу па прызыве, утрымліваюцца асобна ад асуджаных ваеннаслужачых, якія праходзяць ваенную службу па кантракце.

4. Асуджаныя ваеннаслужачыя ўтрымліваюцца асобна ад ваеннаслужачых, арыштаваных на іншых падставах.

**Артыкул 144. Накіраванне асуджаных ваеннаслужачых на гаўптвахту ваеннай камендатуры**

Ваеннаслужачыя, асуджаныя да арышту, павінны быць накіраваны на гаўптвахту ваеннай камендатуры для адбывання арышту ў трохдзённы тэрмін пасля атрымання распараджэння суда аб выкананні прыгавору ў парадку, вызначаным воінскімі статутамі.

**Артыкул 145. Парадак і ўмовы адбывання арышту асуджанымі ваеннаслужачымі**

У дачыненні да асуджаных ваеннаслужачых, якія ўтрымліваюцца на гаўптвахце ваеннай камендатуры, дзейнічаюць парадак і ўмовы адбывання пакарання ў выглядзе арышту, вызначаныя артыкулам 59 гэтага Кодэкса, а таксама воінскімі статутамі.

**Артыкул 146. Меры заахвочвання і спагнання, якія прымяняюцца да асуджаных да арышту ваеннаслужачых**

1. За прыкладныя паводзіны і добрасумленныя адносіны да ваеннай службы да асуджаных ваеннаслужачых могуць прымяняцца наступныя меры заахвочвання:

1) абвяшчэнне падзякі;

2) датэрміновае зняцце раней накладзенага спагнання;

3) залік часу адбывання арышту ў агульны тэрмін ваеннай службы поўнасцю або часткова.

2. За парушэнне парадку адбывання пакарання да асуджаных ваеннаслужачых могуць прымяняцца наступныя меры спагнання:

1) вымова;
2) перавод у адзіночную камеру на тэрмін да дзесяці сутак.
3. Права прымяняць меры заахвочвання і спагнання мае ваенны камендант.
4. Права прымяняць меры заахвочвання ў выглядзе заліку часу адбывання арышту ў агульны тэрмін ваеннай службы маюць Міністр абароны Рэспублікі Беларусь і начальнік Генеральнага штаба Узброеных сіл – першы намеснік Міністра абароны Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 147. Асаблівасці прававога становішча асуджаных да арышту ваеннаслужачых**

1. Час адбывання арышту ў агульны тэрмін ваеннай службы і выслугу гадоў для прысваення чарговага воінскага звання не залічваецца.
2. Падчас адбывання арышту асуджаны ваеннаслужачы не можа быць прадстаўлены да прысваення чарговага воінскага звання, прызначаны на вышэйстаячую пасаду, пераведзены на новае месца службы і звольнены з ваеннай службы, за выключэннем выпадкаў звальнення яго па захворванні.
3. Асуджаным ваеннаслужачым за час адбывання арышту выплачваецца толькі аклад па воінскім званні.

## ГЛАВА 19
## ВЫКЛЮЧАНА

**Артыкул 148. Выключаны**
**Артыкул 149. Выключаны**
**Артыкул 150. Выключаны**
**Артыкул 151. Выключаны**
**Артыкул 152. Выключаны**
**Артыкул 153. Выключаны**
**Артыкул 154. Выключаны**
**Артыкул 155. Выключаны**
**Артыкул 156. Выключаны**
**Артыкул 157. Выключаны**
**Артыкул 158. Выключаны**
**Артыкул 159. Выключаны**
**Артыкул 160. Выключаны**
**Артыкул 161. Выключаны**
**Артыкул 162. Выключаны**
**Артыкул 163. Выключаны**
**Артыкул 164. Выключаны**

# РАЗДЗЕЛ VI
# ВЫКАНАННЕ ДАДАТКОВЫХ ПАКАРАННЯЎ

## ГЛАВА 20
## ПАРАДАК ВЫКАНАННЯ ДАДАТКОВЫХ ПАКАРАННЯЎ

**Артыкул 165. Парадак выканання прыгавору аб пазбаўленні асуджанага воінскага або спецыяльнага звання**

1. Суд, які пастанавіў прыгавор аб пазбаўленні асуджанага воінскага або спецыяльнага звання, пасля ўступлення яго ў законную сілу накіроўвае копію або выпіску з прыгавору органу ці службовай асобе, якія прысвоілі асуджанаму гэта званне.
2. Пасля атрымання копіі або выпіскі з прыгавору орган або службовая асоба ва ўстаноўленым парадку ўносяць у адпаведныя дакументы запіс аб пазбаўленні асуджанага воінскага або спецыяльнага звання, а таксама прымаюць меры для пазбаўлення яго правоў і ільгот, прадугледжаных для асоб, якія маюць адпаведнае званне.

3. Копія або выпіска з прыгавору аб пазбаўленні асуджанага ваеннаабавязанага воінскага звання накіроўваюцца ў ваенны камісарыят па месцы воінскага ўліку.
4. Орган або службовая асоба на працягу месяца з дня атрымання копіі або выпіскі з прыгавору паведамляюць суду, які пастанавіў прыгавор, аб яго выкананні.

**Артыкул 166. Выключаны**

**Артыкул 167. Выключаны**

**Артыкул 168. Выключаны**

**Артыкул 169. Выключаны**

**Артыкул 170. Выключаны**

**Артыкул 171. Выключаны**

## РАЗДЗЕЛ VII
## ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ У ВЫГЛЯДЗЕ ПАЖЫЦЦЁВАГА ЗНЯВОЛЕННЯ

### ГЛАВА 21
### ПАРАДАК І ЎМОВЫ ВЫКАНАННЯ ПАКАРАННЯ У ВЫГЛЯДЗЕ ПАЖЫЦЦЁВАГА ЗНЯВОЛЕННЯ

**Артыкул 172. Месцы адбывання пажыццёвага зняволення**

1. Асуджаныя да пажыццёвага зняволення, а таксама асуджаныя, якім пакаранні смерцю ў парадку памілавання заменены пажыццёвым зняволеннем, адбываюць пакаранне ў папраўчай калоніі асаблівага рэжыму або ў турме.
2. Асуджаныя, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе пажыццёвага зняволення ў папраўчай калоніі асаблівага рэжыму або ў турме, утрымліваюцца асобна ад іншых асуджаных, якія адбываюць пакаранне ў дадзенай калоніі або ў турме.

**Артыкул 173. Парадак і ўмовы выканання пакарання ў выглядзе пажыццёвага зняволення**

1. Асуджаныя, якія адбываюць пажыццёвае зняволенне, утрымліваюцца ў памяшканнях камернага тыпу або ў звычайных жылых памяшканнях папраўчай калоніі асаблівага рэжыму, камерах турмы і носяць адзенне спецыяльнага ўзору.
2. Асуджаныя да пажыццёвага зняволення ўтрымліваюцца ў памяшканнях камернага тыпу папраўчай калоніі асаблівага рэжыму, камерах турмы, як правіла, не больш чым па два чалавекі. Па просьбе асуджанага і ў іншых неабходных выпадках па пастанове начальніка папраўчай калоніі, турмы пры ўзнікненні пагрозы асабістай бяспекі асуджанага ён можа ўтрымлівацца ў адзіночнай камеры. Праца такіх асуджаных арганізуецца з улікам патрабаванняў утрымання асуджаных у камерах.
3. Асуджаныя да пажыццёвага зняволення пераводзяцца ў звычайныя жылыя памяшканні папраўчай калоніі асаблівага рэжыму пры адсутнасці спагнанняў за парушэнне ўстаноўленага парадку адбывання пакарання і пры добрасумленных адносінах да працы пасля адбыцця імі не менш чым дзесяці гадоў пажыццёвага зняволення.
4. Асуджаныя да пажыццёвага зняволення, якія ўтрымліваюцца ў звычайных жылых памяшканнях папраўчай калоніі асаблівага рэжыму і злосна парушаюць установлены парадак адбывання пакарання, пераводзяцца ў памяшканні камернага тыпу папраўчай калоніі асаблівага рэжыму, у турму. Паўторны перавод у звычайныя жылыя памяшканні дапускаецца не раней чым праз год.
4[1]. Суд пераводзіць асуджаных да пажыццёвага зняволення з турмы ў папраўчую калонію асаблівага рэжыму для ўтрымання ў звычайных жылых памяшканнях або з папраўчай калоніі асаблівага рэжыму ў турму па прадстаўленні адміністрацыі папраўчай установы, узгодненым з наглядальнай камісіяй пры мясцовым выканаўчым і распарадчым органе.
5. Асуджаныя да пажыццёвага зняволення маюць права:

1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памеры трох базавых велічынь у парадку, які вызначаецца часткамі 2–6 артыкула 82 гэтага Кодэкса;

2) мець дзве кароткатэрміновыя сустрэчы на працягу года;

3) атрымліваць адну пасылку або перадачу і дзве бандэролі або два дробныя пакеты на працягу года;

4) рабіць штодзённую прагулку працягласцю трыццаць хвілін.

5[1]. Атрыманне адукацыі асуджанымі да пажыццёвага зняволення не ажыццяўляецца. Адміністрацыяй папраўчай установы для такіх асуджаных ствараюцца ўмовы для самаадукацыі, якія не супярэчаць парадку і ўмовам адбывання пакарання.

6. Пасля сканчэння дзесяці гадоў пажыццёвага зняволення асуджаныя могуць быць пераведзены на палепшаныя ўмовы ўтрымання. У гэтым выпадку ім дазваляецца дадаткова:

1) штомесяц расходаваць на набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у памеры адной базавай велічыні ў парадку, які вызначаецца часткамі 2–6 артыкула 82 гэтага Кодэкса;

2) мець адну кароткатэрміновую сустрэчу на працягу года;

3) атрымліваць адну пасылку або перадачу і дзве бандэролі або два дробныя пакеты на працягу года;

4) рабіць штодзённую прагулку працягласцю трыццаць хвілін.

7. На асуджаных да пажыццёвага зняволення распаўсюджваюцца ўмовы адбывання пакарання, устаноўленыя гэтым Кодэксам для асуджаных да пазбаўлення волі, з улікам асаблівасцей адбывання пажыццёвага зняволення. Меры заахвочвання і спагнання прымяняюцца ў парадку, устаноўленым артыкуламі 111 і 113 гэтага Кодэкса, з улікам характару і віду мер заахвочвання і спагнання, якія прымяняюцца пры адбыванні пакарання.

# РАЗДЗЕЛ VIII
# ВЫКАНАННЕ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАКАРАННЯ СМЕРЦЮ

## ГЛАВА 22
## ПАРАДАК ВЫКАНАННЯ ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ПАКАРАННЯ СМЕРЦЮ

### Артыкул 174. Прававое становішча асуджаных да пакарання смерцю

1. Асуджаныя да пакарання смерцю ўтрымліваюцца пад узмоцненай аховай у асобных камерах, выконваюць абавязкі і маюць правы, устаноўленыя для асоб, якія ўтрымліваюцца ў месцах выканання меры стрымання ў выглядзе змяшчэння пад варту. Прагулка гэтай катэгорыі асуджаных не даецца.

2. Пасля ўступлення прыгавору ў законную сілу асуджаныя да пакарання смерцю маюць права:

1) звярнуцца ва ўстаноўленым законам парадку з хадайніцтвам аб памілаванні;

2) мець сустрэчы з адвакатамі і іншымі асобамі, якія маюць права на аказанне юрыдычнай дапамогі, без абмежавання іх працягласці і колькасці;

3) атрымліваць і адпраўляць лісты без абмежаванняў;

4) мець адну кароткатэрміновую сустрэчу з блізкімі сваякамі на месяц;

5) атрымліваць адну пасылку або перадачу адзін раз у тры месяцы ў парадку, які ўстанаўлівае адміністрацыя ўстановы, набываць на працягу месяца па безнаяўным разліку прадукты харчавання і прадметы першай неабходнасці на грашовыя сродкі, якія ёсць на іх асабовых рахунках, у тым ліку атрыманыя па паштовых пераводах, у памеры, устаноўленым для асоб, якія ўтрымліваюцца ў турмах на строгім рэжыме;

6) афармляць ва ўстаноўленым законам парадку неабходныя грамадзянска-прававыя і шлюбна-сямейныя адносіны;

7) мець сустрэчы са свяшчэннаслужыцелем;
8) атрымліваць неабходную медыцынскую дапамогу.

**Артыкул 175. Парадак выканання пакарання смерцю**

1. Прыгавор да пакарання смерцю, які ўступіў у законную сілу, выконваецца пасля атрымання афіцыйнага паведамлення аб адхіленні скаргаў, накіраваных у парадку нагляду, і хадайніцтва аб памілаванні.
2. Пакаранне смерцю выконваецца непублічна шляхам расстрэлу. Выкананне пакарання смерцю ў дачыненні да некалькіх асуджаных праводзіцца асобна адносна кожнага і пры адсутнасці іншых асуджаных да пакарання смерцю.
3. Пры выкананні пакарання смерцю прысутнічаюць пракурор, прадстаўнік установы, у якой выконваецца пакаранне смерцю, і ўрач-спецыяліст. Па дазволе пракурора ў выключных выпадках пры выкананні пакаранні смерцю дапускаецца прысутнасць і іншых асоб.
4. Смерць асуджанага канстатуе ўрач-спецыяліст. Аб выкананні прыгавору складаецца акт.
5. Адміністрацыя ўстановы, у якой выконваецца пакаранне смерцю, абавязана паведаміць аб выкананні прыгавору суду, які пастанавіў яго, а суд паведамляе аднаму з блізкіх сваякоў. Суд, які пастанавіў прыгавор, накіроўвае ў орган, што рэгіструе акты грамадзянскага стану, па месцы знаходжання гэтага суда паведамленне аб смерці асобы, асуджанай да пакарання смерцю. Цела для пахавання не выдаецца, аб месцы пахавання не паведамляецца.

**Артыкул 176. Прыпыненне выканання пакарання смерцю**

1. Пры выяўленні ў асуджанага да пакарання смерцю прыкмет псіхічнага расстройства (захворвання) адміністрацыя ўстановы арганізуе яго медыцынскі агляд камісіяй у складзе трох урачоў-спецыялістаў, аб чым складаецца пратакол.
2. У выпадку выяўлення псіхічнага расстройства (захворвання), якое пазбаўляе асуджанага магчымасці разумець сутнасць сваіх дзеянняў, прыгавор да пакарання смерцю ў выкананне не прыводзіцца і пратакол медыцынскага агляду накіроўваецца ў суд, які пастанавіў прыгавор.
3. У дачыненні да асуджанага, указанага ў частцы 2 гэтага артыкула, суд прыпыняе выкананне прыгавору да пакарання смерцю і вырашае пытанне аб прызначэнні асуджанаму прымусовай меры бяспекі і лячэння ў парадку, устаноўленым Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.
4. У выпадку папраўкі асуджанага пытанне аб прымяненні да яго пакарання смерцю або магчымасці замены яго іншым пакараннем вырашае судом, які пастанавіў прыгавор.

# РАЗДЗЕЛ IX
# ВЫКАНАННЕ МЕР КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ, НЕ ЗВЯЗАНЫХ З ПРЫМЯНЕННЕМ ПАКАРАННЯ

## ГЛАВА 23
## ПАРАДАК ПРЫМЯНЕННЯ МЕР ВЫПРАБАВАЛЬНАГА І ПРАФІЛАКТЫЧНАГА ЎЗДЗЕЯННЯ ПРЫ АДТЭРМІНОЎЦЫ ВЫКАНАННЯ ПАКАРАННЯ, УМОЎНЫМ НЕПРЫМЯНЕННІ ПАКАРАННЯ, А ТАКСАМА ПРЫ АСУДЖЭННІ БЕЗ ПРЫЗНАЧЭННЯ ПАКАРАННЯ

**Артыкул 177. Органы, якія ажыццяўляюць выпрабавальны і прафілактычны кантроль, а таксама прафілактычнае назіранне за паводзінамі асуджаных**

1. Кантроль за паводзінамі асуджаных з адтэрміноўкай выканання пакарання, умоўным непрымяненнем пакарання і без прызначэння пакарання, а таксама арганізацыю выканання прыгавору суда і кантроль за выкананнем абавязкаў, устаноўленых

прыгаворам суда, ажыццяўляюць крымінальна-выканаўчыя інспекцыі, а прафілактычнае назіранне адпаведна на працягу тэрміну адтэрміноўкі, выпрабавальнага тэрміну і тэрміну судзімасці ажыццяўляюць тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў па месцы жыхарства асуджаных.

2. У дачыненні да непаўналетніх і ваеннаслужачых, асуджаных да ўказаных у частцы 1 гэтага артыкула мер крымінальнай адказнасці, кантроль ажыццяўляюць адпаведна інспекцыі па справах непаўналетніх і камандаванне воінскіх часцей.

3. У парадку, прадугледжаным заканадаўствам, да кантролю і прафілактычнага назірання могуць прыцягвацца работнікі іншых службаў тэрытарыяльных органаў унутраных спраў.

**Артыкул 178. Абавязкі асуджаных пры ажыццяўленні мер крымінальнай адказнасці, не звязаных з прымяненнем пакарання**

1. Асуджаныя з адтэрміноўкай выканання пакарання, умоўным непрымяненнем пакарання або без прызначэння пакарання адпаведна на працягу адтэрміноўкі, выпрабавальнага тэрміну або тэрміну судзімасці выконваюць абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 9 гэтага Кодэкса, а пры адтэрміноўцы выканання пакарання і ўмоўным непрымяненні пакарання – і абавязкі, устаноўленыя прыгаворам суда.

2. Пры адтэрміноўцы выканання пакарання і ўмоўным непрымяненні пакарання асуджаныя абавязаны рабіць справаздачу аб сваіх паводзінах перад крымінальна-выканаўчай інспекцыяй, камандаваннем воінскай часці, з'яўляцца на іх выклік без абмежаванняў перыядычнасці яўкі, даваць тлумачэнні адносна невыканання ўстаноўленых для іх абавязкаў.

3. Выкананне асуджанымі з адтэрміноўкай выканання пакарання і ўмоўным непрымяненнем пакарання ўстаноўленых для іх абавязкаў улічваецца крымінальна-выканаўчай інспекцыяй, камандаваннем воінскай часці пры рашэнні пытання аб неабходнасці накіравання ў суд прадстаўлення аб адмене адтэрміноўкі выканання пакарання або ўмоўнага непрымянення пакарання, а таксама пры рашэнні пытання аб вызваленні ад пакарання асуджанага пасля сканчэння адтэрміноўкі.

4. Арганізацыя выканання асуджаным з адтэрміноўкай выканання пакарання, умоўным непрымяненнем пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі ўстаноўленага для яго судом абавязку выканаць у пэўным аб'ёме калектыўна карысныя работы ўскладаецца на крымінальна-выканаўчую інспекцыю, камандаванне воінскай часці, а ў дачыненні да непаўналетняга – на інспекцыю па справах непаўналетніх. Парадак і ўмовы выканання асуджаным указанага абавязку ажыццяўляюцца па правілах главы 4 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 179. Парадак ажыццяўлення кантролю і прафілактычнага назірання за асуджанымі**

1. Крымінальна-выканаўчая інспекцыя ажыццяўляе рэгістрацыю і персанальны ўлік асуджаных з адтэрміноўкай выканання пакарання і ўмоўным непрымяненнем пакарання, асуджаных без прызначэння пакарання, кантралюе з удзелам іншых службаў тэрытарыяльных органаў унутраных спраў захаванне асуджанымі ўмоў выпрабавання і выкананне ўскладзеных на іх абавязкаў, ажыццяўляе прафілактычнае назіранне за асуджанымі без прызначэння пакарання, аказвае асуджаным дапамогу ў працаўладкаванні, атрыманні адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, абароне іх праў і законных інтарэсаў, арганізуе і праводзіць выхаваўчую працу з асуджанымі. Парадак арганізацыі і правядзення выхаваўчай працы з асуджанымі вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

$1^1$. Камандаванне воінскай часці ажыццяўляе рэгістрацыю і персанальны ўлік асуджаных з адтэрміноўкай выканання пакарання і ўмоўным непрымяненнем пакарання, асуджаных без прызначэння пакарання, кантралюе захаванне асуджанымі ўмоў выпрабавання і выкананне ўскладзеных на іх абавязкаў, ажыццяўляе прафілактычнае назіранне за

асуджанымі без прызначэння пакарання, аказвае асуджаным дапамогу ў атрыманні адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, абароне іх праў і законных інтарэсаў.

2. Крымінальна-выканаўчая інспекцыя, камандаванне воінскай часці на працягу дзесяці дзён пасля атрымання копіі або выпіскі з прыгавору выклікаюць асуджанага для размовы, паведамляюць яму аб узяцці на персанальны ўлік, растлумачваюць яму яго правы і абавязкі з улікам вызначанай судом меры крымінальнай адказнасці і прававыя наступствы невыканання асуджаным ускладзеных на яго абавязкаў.

3. Пры наяўнасці або ўзнікненні абставін, якія сведчаць аб мэтазгоднасці ўскладання на асуджанага з адтэрміноўкай выканання пакарання або ўмоўным непрымяненнем пакарання дадатковых абавязкаў, якія прадугледжаны законам, але не былі ўскладзены на яго пры вынясенні прыгавору, крымінальна-выканаўчая інспекцыя, камандаванне воінскай часці маюць права накіраваць у суд прадстаўленне аб іх устанаўленні.

4. Калі пры адтэрміноўцы выканання пакарання або пры ўмоўным непрымяненні пакарання суд прызначыў асуджанаму дадатковае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, крымінальна-выканаўчая інспекцыя ў поўным аб'ёме ажыццяўляе мерапрыемствы, прадугледжаныя артыкуламі 31–35 гэтага Кодэкса.

5. Выключана.

6. Пры ўхіленні асуджанага з адтэрміноўкай выканання пакарання або ўмоўным непрымяненнем пакарання ад кантролю крымінальна-выканаўчая інспекцыя, камандаванне воінскай часці праводзяць першапачатковыя мерапрыемствы для выяўлення месца яго знаходжання і прычын ухілення.

### Артыкул 180. Падлік тэрміну судзімасці, выпрабавальнага тэрміну і адтэрміноўкі

1. Тэрмін судзімасці, выпрабавальны тэрмін і адтэрміноўка адпаведна пры асуджэнні без прызначэння пакарання, з умоўным непрымяненнем пакарання або адтэрміноўкай выканання пакарання лічацца з дня ўступлення ў законную сілу прыгавору суда.

2. Пасля сканчэння тэрміну судзімасці або выпрабавальнага тэрміну адпаведна прафілактычнае назіранне і кантроль за паводзінамі асуджанага без прызначэння пакарання або з умоўным непрымяненнем пакарання спыняюцца. Асуджаны здымаецца з уліку ў крымінальна-выканаўчай інспекцыі, воінскай часці, аб чым яму паведамляецца пісьмова.

3. Пры адтэрміноўцы выканання пакарання крымінальна-выканаўчая інспекцыя, камандаванне воінскай часці за два тыдні да сканчэння адтэрміноўкі прадстаўляюць у суд у поўным аб'ёме неабходныя матэрыялы, якія маюць дачыненне да ацэнкі паводзін асуджанага і ступені яго выпраўлення, а таксама афіцыйнае заключэнне адносна магчымасці вызвалення асуджанага ад прызначанага пакарання.

### Артыкул 181. Прававыя наступствы невыканання асуджаным ускладзеных на яго абавязкаў і невыканання ўмоў выпрабавання

1. У выпадку ўхілення асуджанага ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў, нявыплаты або няпоўнай выплаты крымінальна-прававой кампенсацыі ва ўстаноўлены прыгаворам тэрмін без уважлівых прычын або парушэння грамадскага парадку, за якое да яго была прыменена мера адміністрацыйнага спагнання, крымінальна-выканаўчая інспекцыя, камандаванне воінскай часці выносяць асуджанаму афіцыйнае папярэджанне.

2. Калі асуджаны пасля афіцыйнага папярэджання працягвае ўхіляцца ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў, не заплаціць у поўным аб'ёме крымінальна-прававую кампенсацыю, крымінальна-выканаўчая інспекцыя, камандаванне воінскай часці могуць у дачыненні да асуджанага з адтэрміноўкай выканання пакарання або ўмоўным непрымяненнем пакарання накіраваць у суд прадстаўленне аб адмене адтэрміноўкі або ўмоўнага непрымянення прызначанага пакарання.

3. Крымінальна-выканаўчая інспекцыя, камандаванне воінскай часці таксама могуць накіраваць у суд прадстаўленне аб адмене адтэрміноўкі выканання пакарання або ўмоўнага непрымянення пакарання, калі асуджаны пасля вынесенага яму афіцыйнага папярэджання неаднаразова (два або больш разоў) парушыў грамадскі парадак, за што да яго двойчы былі прыменены меры адміністрацыйнага спагнання, а таксама ў выпадках, калі асуджаны схаваўся.

4. Асуджаным, які схаваўся, лічыцца асуджаны, месца знаходжання якога невядомае і не было выяўлена на працягу трыццаці дзён, нягледзячы на прынятыя першапачатковыя меры вышуку.

5. Калі з хадайніцтвам у суд аб адмене адтэрміноўкі выканання пакарання або ўмоўнага непрымянення пакарання звярнулася асоба, якой было даручана назіранне за асуджаным, крымінальна-выканаўчая інспекцыя, камандаванне воінскай часці прадстаўляюць сваё заключэнне адносна мэтазгоднасці прыняцця судом такога рашэння.

## ГЛАВА $23^1$
## ПАРАДАК ВЫКАНАННЯ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ КАНФІСКАЦЫІ

### Артыкул $181^1$. Парадак выканання спецыяльнай канфіскацыі

1. Суд, які пастанавіў прыгавор аб спецыяльнай канфіскацыі маёмасці, пасля ўступлення яго ў законную сілу накіроўвае копію прыгавору, выканаўчы ліст для выканання ў органы прымусовага выканання па месцы знаходжання маёмасці разам з копіямі рашэння (пратакола, пастановы) аб канфіскацыі і (або) арышце маёмасці, вопісу маёмасці, дакумента, які ўтрымлівае інфармацыю аб месцы знаходжання маёмасці. Пры адсутнасці ў справе вопісу маёмасці накіроўваецца даведка аб тым, што вопіс маёмасці не праводзіўся.

2. Улік, захоўванне, ацэнка і рэалізацыя канфіскаванай маёмасці ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул $181^2$. Абавязкі трэціх асоб у дачыненні да маёмасці, якая падлягае спецыяльнай канфіскацыі

1. Арганізацыі і грамадзяне, якім перададзена на захоўванне маёмасць, што падлягае спецыяльнай канфіскацыі, абавязаны забяспечыць яе захаванасць.

2. За пашкоджанне, зрасходаванне, скрыванне або адчужэнне маёмасці, падвергнутай вопісу або арышту, а таксама за ажыццяўленне банкам і (або) нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыяй аперацый з грашовымі сродкамі, размешчанымі на рахунках і (або) ва ўклады (дэпазіты), на якія накладзены арышт, вінаватыя прыцягваюцца да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 24
## ПРЫМЯНЕННЕ ПРЫМУСОВЫХ МЕР ВЫХАВАЎЧАГА ХАРАКТАРУ І ПРАФІЛАКТЫЧНАГА НАЗІРАННЯ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА НЕПАЎНАЛЕТНІХ АСУДЖАНЫХ

### Артыкул 182. Органы, якія кантралююць прымяненне прымусовых мер выхаваўчага характару і прафілактычнага назірання за асуджанымі

1. Кантроль за выкананнем непаўналетнімі асуджанымі, установамі і асобнымі асобамі патрабаванняў, абумоўленых прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару ў дачыненні да непаўналетніх асуджаных, а таксама прафілактычнае назіранне за імі ажыццяўляюць інспекцыі па справах непаўналетніх па месцы іх жыхарства або па месцы знаходжання спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установы, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установы.

2. Інспекцыі па справах непаўналетніх вядуць улік непаўналетніх, асуджаных з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, растлумачваюць ім парадак і ўмовы выканання і адбывання ўказаных мер, кантралююць выкананне ўскладзеных на іх

абавязкаў, у тым ліку звязаных з выкананнем адпаведных прымусовых мер выхаваўчага характару, прымяняюць меры заахвочвання і спагнання.

3. Выключана.

4. Выключана.

**Артыкул 183. Парадак выканання прымусовых мер выхаваўчага характару**

1. На працягу дзесяці дзён пасля ўступлення прыгавору ў сілу непаўналетні асуджаны запрашаецца ў інспекцыю па справах непаўналетніх для пастаноўкі на ўлік наконт выканання прызначанай судом прымусовай меры выхаваўчага характару.

2. На працягу тэрміну судзімасці за непаўналетнім асуджаным, якому прызначана прымусовая мера выхаваўчага характару, ажыццяўляецца прафілактычнае назіранне і ў сувязі з гэтым на яго ўскладаюцца абавязкі, прадугледжаныя часткай 3 артыкула 9 гэтага Кодэкса.

3. Пры ўскладанні на непаўналетняга асуджанага абавязку кампенсаваць сваімі сродкамі або пакрыць сваёй працай прычынены ўрон інспекцыя па справах непаўналетніх вызначае тэрмін і па жаданні асуджанага парадак пакрыцця прычыненага ўрону (сваёй працай або сродкамі асуджанага), а таксама форму прынясення прабачэння пацярпеламу.

4. Прымусовая мера выхаваўчага характару ў выглядзе абмежавання свабоды вольнага часу непаўналетняга асуджанага выконваецца шляхам захавання непаўналетнім на працягу ўстаноўленага судом тэрміну пэўнага парадку выкарыстання свабоднага ад навучання або працы часу, а таксама абавязкаў і забарон, устаноўленых судом. Інспекцыя па справах непаўналетніх па месцы жыхарства асуджанага абавязана забяспечыць належны кантроль за паводзінамі непаўналетняга ў свабодны ад працы або навучання час і захаваннем ім устаноўленых для яго забарон. Пры неабходнасці інспекцыя па справах непаўналетніх мае права накіраваць у суд прадстаўленне аб устанаўленні для непаўналетняга асуджанага дадатковых забарон, прадугледжаных пунктам 4 часткі 2 артыкула 117 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, калі гэтакія не былі ўстаноўлены судом пры пастанове прыгавору.

5. Пры змяшчэнні непаўналетняга асуджанага ў спецыяльную навучальна-выхаваўчую ўстанову, спецыяльную лячэбна-выхаваўчую ўстанову ён накіроўваецца ва ўказаную ўстанову за кошт дзяржавы і ў суправаджэнні работніка інспекцыі па справах непаўналетніх.

**Артыкул 184. Падлік тэрмінаў прымянення прымусовых мер выхаваўчага характару**

1. Тэрмін абмежавання свабоды вольнага часу лічыцца суткамі з дня пастаноўкі непаўналетняга асуджанага на ўлік у інспекцыю па справах непаўналетніх. Прымяненне прымусовай меры выхаваўчага характару ў выглядзе абмежавання свабоды вольнага часу спыняецца пасля дасягнення асуджаным паўналетняга ўзросту.

2. Тэрмін знаходжання непаўналетняга асуджанага ў спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установе, спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе лічыцца месяцамі з дня паступлення асуджанага ва ўказаную ўстанову.

3. Спыненне прымянення прымусовых мер выхаваўчага характару ў сувязі з дасягненнем асуджаным паўналетняга ўзросту не цягне за сабой пагашэння судзімасці, калі не скончыліся тэрміны яе пагашэння, устаноўленыя артыкулам 121 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 185. Меры заахвочвання і спагнання, якія прымяняюцца да непаўналетніх, асуджаных з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару**

1. За добрыя паводзіны і адносіны да навучання непаўналетняму асуджанаму можа быць аб'яўлена падзяка.

2. За парушэнне грамадскага парадку, навучальнай і працоўнай дысцыпліны, невыкананне абавязку ва ўстаноўлены тэрмін кампенсаваць або пакрыць прычынены ўрон, незахаванне пэўнага парадку выкарыстання свабоднага часу або парушэнне ўстаноўленых забарон у сувязі з абмежаваннем свабоды вольнага часу, а таксама за выхад са спецыяльнай навучальна-выхаваўчай установы або спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установы без дазволу кіраўнікоў указаных устаноў непаўналетняму асуджанаму можа быць вынесена афіцыйнае папярэджанне, а пры паўторным пасля афіцыйнага папярэджання здзяйсненні ўказаных парушэнняў – аб'яўлена вымова ў пісьмовай форме.

3. У выпадку, калі непаўналетні асуджаны пасля аб'яўленай яму вымовы дапусціць да сканчэння тэрміну судзімасці ўказаныя ў частцы 2 гэтага артыкула парушэнні, інспекцыя па справах непаўналетніх мае права накіраваць у суд прадстаўленне аб замене прымусовай меры выхаваўчага характару больш строгай, прадугледжанай часткай 2 артыкула 117 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

# РАЗДЗЕЛ X
# ВЫЗВАЛЕННЕ АД АДБЫВАННЯ ПАКАРАННЯ. ДАПАМОГА АСОБАМ, ВЫЗВАЛЕНЫМ АД АДБЫВАННЯ ПАКАРАННЯ, І КАНТРОЛЬ ЗА ІМІ

## ГЛАВА 25
## ВЫЗВАЛЕННЕ АД АДБЫВАННЯ ПАКАРАННЯ

### Артыкул 186. Падставы вызвалення ад адбывання пакарання

Падставамі вызвалення асуджанага ад адбывання пакарання з'яўляюцца:

1) адбыццё тэрміну пакарання, прызначанага па прыгаворы суда;

2) адмена прыгавору суда са спыненнем вядзення па справе;

3) умоўна-датэрміновае вызваленне ад адбывання пакарання;

4) замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем;

5) амністыя або памілаванне;

6) цяжкае захворванне або інваліднасць;

7) іншыя падставы, прадугледжаныя Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 187. Парадак прадстаўлення да датэрміновага вызвалення ад адбывання пакарання

1. У дачыненні да асуджанага, да якога могуць быць прыменены ўмоўна-датэрміновае вызваленне або замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем, орган або ўстанова, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, накіроўваюць у суд прадстаўленне аб умоўна-датэрміновым вызваленні асуджанага ад адбывання пакарання або аб замене яго неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем.

2. У дачыненні да асуджанага, які прадстаўляецца да памілавання органам або ўстановай, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, адпаведнае хадайніцтва ўносіцца ў парадку, які вызначае зацверджанае Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Палажэннем аб парадку ажыццяўлення памілавання грамадзян, асуджаных судамі Рэспублікі Беларусь.

3. У прадстаўленні да ўмоўна-датэрміновага вызвалення або замены неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем і ў хадайніцтве аб памілаванні павінны ўтрымлівацца даныя, якія характарызуюць асабістыя якасці асуджанага, яго паводзіны, адносіны да працы і навучання падчас адбывання пакарання, адносіны да здзейсненага дзеяння, інфармацыя аб ліквідацыі наступстваў здзейсненага дзеяння, аб прызнанні віны ў здзейсненым злачынстве, выказаныя ім гарантыі правапаслухмянага ладу жыцця пасля вызвалення, а таксама іншыя, абставіны, якія заслугоўваюць увагі і пацвярджаюць дасягненне асуджаным пэўнай ступені выпраўлення.

4. Парадак прымянення амністыі вызначае орган, які выдаў акт аб амністыі.
5. Прадстаўленне аб вызваленні ад адбывання пакарання з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) асуджанага накіроўвае ў суд начальнік органа або ўстановы, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці. Адначасова з прадстаўленнем у суд накіроўваюцца заключэнне медыцынскай камісіі і асабістая справа асуджанага.
6. Прадстаўленне аб вызваленні ад адбывання пакарання з прычыны іншага цяжкага захворвання накіроўвае ў суд начальнік органа або ўстановы, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці. Адначасова з прадстаўленнем у суд накіроўваюцца заключэнне медыцынскай або рэабілітацыйнай экспертнай камісіі і асабістая справа асуджанага. У прадстаўленні павінны ўтрымлівацца даныя, якія характарызуюць паводзіны асуджанага падчас адбывання пакарання.
7. У выпадку прызнання інвалідам I або II групы асобы, асуджанай да грамадскіх работ, папраўчых работ або абмежавання волі, орган або ўстанова, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, накіроўваюць у суд прадстаўленне аб яе датэрміновым вызваленні ад адбывання пакарання.
$7^1$. Парадак медыцынскага агляду і пералік захворванняў, якія перашкаджаюць далейшаму адбыванню пакарання, вызначаюцца Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.
8. У выпадку цяжарнасці жанчыны, якая адбывае пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ, папраўчых работ або абмежавання волі, орган або ўстанова, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, накіроўваюць у суд прадстаўленне аб яе датэрміновым вызваленні ад адбывання пакарання з моманту давання водпуску па цяжарнасці і родах.
9. Пасля адбыцця асуджаным устаноўленай законам часткі тэрміну пакарання адміністрацыя органа або ўстановы, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, абавязана ў месячны тэрмін разгледзець пытанне аб яго прадстаўленні да ўмоўна-датэрміновага вызвалення ад пакарання або замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем.
10. У выпадку адмовы суда ва ўмоўна-датэрміновым вызваленні або замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем паўторнае накіраванне прадстаўлення па любой з гэтых падстаў можа мець месца не раней чым пасля сканчэння шасці месяцаў з дня вынясення прысуду (пастановы) суда аб адмове.
11. Асобы, вызваленыя ад пакарання ўмоўна-датэрмінова, калі яны былі накіраваны ў папраўчыя ўстановы, папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу ў выпадках, прадугледжаных пунктам 1 часткі 6 артыкула 90 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, могуць быць зноў прадстаўлены да ўмоўна-датэрміновага вызвалення або замены неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем не раней чым пасля сканчэння аднаго года з дня вынясення прысуду (пастановы) суда аб іх накіраванні ў папраўчыя ўстановы, папраўчыя ўстановы адкрытага тыпу.
12. У выпадку прызнання ваеннаслужачага, асуджанага да абмежавання па ваеннай службе, нягодным да ваеннай службы з-за стану здароўя камандзір воінскай часці накіроўвае ў суд прадстаўленне аб вызваленні асуджанага ад далейшага адбывання пакарання або аб замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем. Адначасова з прадстаўленнем у суд накіроўваецца медыцынскае заключэнне.
13. У дачыненні да асуджанага ваеннаслужачага, які адбывае пакаранне ў выглядзе абмежавання па ваеннай службе, камандзір воінскай часці накіроўвае ў суд прадстаўленне аб вызваленні ад адбывання пакарання або аб замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем пры ўзнікненні абставін, прадугледжаных часткай 3 артыкула 53 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

14. У выпадку ўступлення ў сілу крымінальнага закона, які мае зваротную сілу, прадстаўленне аб умоўна-датэрміновым вызваленні асуджанага ад адбывання пакарання, аб замене яму неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем або аб іншым паляпшэнні становішча асуджанага мае права накіраваць у суд з захаваннем парадку, устаноўленага гэтым артыкулам, наглядальная камісія пры мясцовым выканаўчым і распарадчым органе.

**Артыкул 188. Прадстаўленне асоб, якія адбываюць пажыццёвае зняволенне, да замены гэтага пакарання пазбаўленнем волі**

1. Адміністрацыя папраўчай установы можа ўнесці ў суд прадстаўленне аб замене пажыццёвага зняволення пазбаўленнем волі на падставах, прадугледжаных Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь, калі асуджаны на працягу апошніх трох гадоў не прызнаваўся злосным парушальнікам устаноўленага парадку адбывання пакарання.

2. Не прадстаўляюцца да замены пажыццёвага зняволення пазбаўленнем волі асуджаныя, якія здзейснілі падчас адбывання пажыццёвага зняволення новае цяжкае або асабліва цяжкае злачынства.

3. У выпадку адмовы суда ў замене асуджанаму пажыццёвага зняволення пазбаўленнем волі паўторнае ўнясенне прадстаўлення можа мець месца не раней чым пасля сканчэння трох гадоў з дня прыняцця судом рашэння аб адмове.

**Артыкул 189. Адтэрміноўка адбывання пакарання ў дачыненні да асуджаных цяжарных жанчын і жанчын, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў**

1. Асуджаным цяжарным жанчынам і жанчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, што адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, суд можа даць адтэрміноўку адбывання пакарання на перыяд, калі яны могуць быць вызвалены ад працы па цяжарнасці, родах і да дасягнення дзіцём трохгадовага ўзросту.

2. Адтэрміноўка адбывання пакарання не прымяняецца да жанчын, асуджаных да пазбаўлення волі на тэрмін, большы за пяць гадоў, за цяжкае або асабліва цяжкае злачынства.

3. Прадстаўленне ў суд аб вызваленні асуджанай жанчыны, узгодненае з наглядальнай камісіяй пры мясцовым выканаўчым і распарадчым органе, накіроўвае адміністрацыя папраўчай установы. Да прадстаўлення дадаюцца характарыстыка асуджанай, даведка аб згодзе сваякоў або іншых асоб прыняць яе і дзіця, даць ім жыллё і стварыць неабходныя ўмовы для пражывання, медыцынскае заключэнне аб цяжарнасці або даведка аб наяўнасці дзіцяці, а таксама асабістая справа асуджанай.

4. Адміністрацыя папраўчай установы, атрымаўшы прысуд (пастанову) суда аб адтэрміноўцы адбывання пакарання ў дачыненні да асуджанай, вызваляе яе з папраўчай установы. У асуджанай бярэцца падпіска аб яўцы ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю па месцы жыхарства ў трохдзённы тэрмін з дня прыбыцця і аб адказнасці за няяўку без уважлівых прычын ва ўстаноўлены тэрмін для пастаноўкі на ўлік.

5. Асуджаная накіроўваецца да месца жыхарства самастойна за кошт дзяржавы.

6. У дзень вызвалення асуджанай у крымінальна-выканаўчую інспекцыю па месцы яе жыхарства накіроўваецца копія прысуду (пастановы) суда аб адтэрміноўцы адбывання пакарання з указаннем даты вызвалення.

7. Крымінальна-выканаўчая інспекцыя ставіць асуджаную на ўлік і ў далейшым кантралюе яе паводзіны, арганізуе і праводзіць выхаваўчую працу з асуджанай. Парадак арганізацыі і правядзення выхаваўчай працы з асуджанай вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

8. Пасля яўкі асуджанай крымінальна-выканаўчая інспекцыя на працягу трох сутак абавязана накіраваць пацвярджэнне яе яўкі ў папраўчую ўстанову па месцы вызвалення асуджанай.

**Артыкул 190. Наступствы невыканання ўмоў адтэрміноўкі адбывання пакарання асуджанай жанчынай да дасягнення дзіцём трохгадовага ўзросту**

1. У выпадку непрыбыцця асуджанай да месца яе жыхарства ў двухтыднёвы тэрмін з дня вызвалення крымінальна-выканаўчая інспекцыя праводзіць першапачатковыя мерапрыемствы па вышуку асуджанай, абвяшчае яе ў вышук. Такая асуджаная можа быць затрымана з санкцыі пракурора на тэрмін да трыццаці сутак і па пастанове начальніка тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў можа змяшчацца ў ізалятар часовага ўтрымання тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў. Грашовая сума, зрасходаваная ў сувязі з вышукам асуджанай, спаганяецца з яе шляхам здзяйснення выканаўчага надпісу. Памер грашовай сумы, зрасходаванай у сувязі з вышукам асуджанай, вызначае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

2. Калі асуджаная, у дачыненні да якой прыменена адтэрміноўка адбывання пакарання, дапускае парушэнні грамадскага парадку ці працоўнай дысцыпліны або ўхіляецца ад выхавання дзіцяці або догляду за ім, крымінальна-выканаўчая інспекцыя абвяшчае ёй афіцыйнае папярэджанне.

3. У выпадку, калі дзіця нарадзілася мёртвым ці асуджаная адмовілася ад дзіцяці, перадала яго ў дзіцячую інтэрнатную ўстанову ці знікла з месца жыхарства або працягвае пасля зробленага папярэджання ўхіляцца ад выхавання дзіцяці ці догляду за ім, дапускае парушэнні грамадскага парадку ці працоўнай дысцыпліны, крымінальна-выканаўчая інспекцыя па месцы яе жыхарства ўносіць у суд прадстаўленне аб адмене адтэрміноўкі адбывання пакарання і накіраванні асуджанай для адбывання пакарання, прызначанага прыгаворам суда. Да прадстаўлення дадаецца копія прысуду (пастановы) суда аб адтэрміноўцы адбывання пакарання.

4. Пасля дасягнення дзіцём трохгадовага ўзросту або ў выпадку яго смерці крымінальна-выканаўчая інспекцыя па месцы жыхарства асуджанай з улікам яе паводзін, адносін да выхавання дзіцяці, характару здзейсненага злачынства, адбытага тэрміну пакарання накіроўвае ў суд прадстаўленне аб умоўна-датэрміновым вызваленні асуджанай ад пакарання, або аб замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем, або аб накіраванні яе ў папраўчую ўстанову для далейшага адбывання пакарання. У апошнім выпадку крымінальна-выканаўчая інспекцыя прадстаўляе ў суд сваё заключэнне аб магчымасці заліку ў тэрмін пакарання часу адтэрміноўкі, калі асуджаная не адбывала пакаранне.

**Артыкул 191. Спыненне адбывання пакарання і парадак вызвалення асуджаных**

1. Адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю, грамадскіх работ, папраўчых работ, абмежавання па ваеннай службе, арышту, абмежавання волі, пазбаўлення волі спыняецца ў апошні дзень тэрміну пакарання з улікам тых змяненняў, якія могуць быць унесены ў тэрмін пакарання ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

2. Асуджаныя да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, арышту і пазбаўлення волі вызваляюцца ў першай палове апошняга дня тэрміну пакарання. Калі тэрмін пакарання канчаецца ў выхадны, дзяржаўнае свята і святочны дзень, устаноўленыя і аб'яўленыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь нерабочымі, асуджаны вызваляецца ад адбывання пакарання ў перадвыхадны або перадсвяточны дзень. Пры падліку тэрміну месяцамі ён канчаецца ў адпаведны дзень апошняга месяца, а калі дадзены месяц не мае адпаведнага дня, – у апошні дзень гэтага месяца.

3. Пры вызваленні асуджанаму выдаюцца рэчы і каштоўнасці, якія належаць яму, грошы, якія захоўваюцца на яго асабовым рахунку, асабістыя дакументы, а таксама дакументы аб вызваленні ад пакарання і аб працоўнай дзейнасці. У выпадку неабходнасці працаўладкавання асуджаных, абавязаных кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, адміністрацыя ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы ў дзень вызвалення асуджанага накіроўвае ў суд па яго месцы жыхарства выканаўчы дакумент.

4. Дакумент, які сведчыць асобу асуджанага, што вызваляецца ад пакарання ў выглядзе арышту, абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу або пазбаўлення волі, і захоўваецца ў яго асабістай справе, выдаецца яму на рукі.

4[1]. Вызваленыя асуджаныя абавязаныя кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, што падлягаюць працаўладкаванню, да месца жыхарства суправаджаюцца работнікам установы крымінальна-выканаўчай сістэмы.

5. Датэрміновае вызваленне ад адбывання пакарання праводзіцца ў дзень паступлення адпаведных дакументаў, а калі дакументы атрыманы пасля заканчэння рабочага дня, – раніцай наступнага дня.

6. Крымінальна-выканаўчая інспекцыя ў дзень заканчэння тэрміну пакарання ў выглядзе папраўчых работ, а пры вызваленні ад гэтага пакарання на іншых падставах не пазней за наступны рабочы дзень пасля атрымання адпаведных дакументаў абавязана прапанаваць адміністрацыі ўстановы, дзе асуджаны адбываў пакаранне, спыніць вылічэнні з яго заработнай платы. Вызвалены пісьмова апавяшчаецца аб спыненні адбывання пакарання і зняцці з уліку ў крымінальна-выканаўчай інспекцыі.

7. Асуджанаму, які вызваляецца ад адбывання пакарання з прычыны адмены прыгавору са спыненнем вядзення па крымінальнай справе, начальнік органа або ўстановы, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, растлумачвае яго правы на аднаўленне маёмасных, працоўных, жыллёвых і іншых страчаных праў. У дакуменце аб вызваленні асуджанаму прыносяцца афіцыйныя прабачэнні ад імя дзяржавы.

## ГЛАВА 26
## ДАПАМОГА ВЫЗВАЛЕНЫМ АД АДБЫВАННЯ ПАКАРАННЯ

### Артыкул 192. Аказанне дапамогі вызваленым у іх працоўным і бытавым уладкаванні

1. Не пазней за тры месяцы да сканчэння тэрміну пакарання асуджанага да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу або да пазбаўлення волі адміністрацыя ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы праз тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў і камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, кіраўніцтва (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта прымае меры па яго працоўным і бытавым уладкаванні. У дачыненні да асоб, абавязаных кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, у выпадку неабходнасці іх працаўладкавання адміністрацыя ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы не пазней за тры месяцы да будучага вызвалення інфармуе пра гэта суд, тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў і камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, кіраўніцтва (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта па месцы жыхарства ўказаных асоб. Парадак аказання адміністрацыяй установы крымінальна-выканаўчай сістэмы дапамогі асуджаным, указаным у гэтай частцы, у працоўным і бытавым уладкаванні ўстанаўлівае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

2. З дня фактычнага адбывання пакарання служба сацыяльнай адаптацыі ўстаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы праводзіць з асуджанымі выхаваўчую працу з мэтай падрыхтоўкі іх да вызвалення, растлумачвае іх правы і абавязкі пасля вызвалення.
3. Інваліды I і II групы, а таксама асобы, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, пры неабходнасці па іх згодзе накіроўваюцца камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне абласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ў дамы-інтэрнаты для састарэлых і інвалідаў. Непаўналетнія, якія не маюць бацькоў, у неабходных выпадках перадаюцца органам апекі і папячыцельства па месцы жыхарства непаўналетніх для давання ім статусу дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, і для іх далейшага ўладкавання.

### Артыкул 193. Аказанне дапамогі вызваленым з папраўчых установаў, папраўчых установаў адкрытага тыпу, арыштных дамоў

1. Вызваленыя ад адбывання пакарання ў выглядзе арышту або пазбаўлення волі забяспечваюцца бясплатным праездам да месца жыхарства або працы, а таксама прадуктамі харчавання або грашыма на дарогу паводле ўстаноўленых норм.
2. Пры адсутнасці неабходных адпаведна сезону адзення, абутку і сродкаў на іх набыццё вызваленыя ад пакарання забяспечваюцца адзеннем і абуткам бясплатна, а таксама ім можа быць выдадзена аднаразовая грашовая дапамога за кошт сродкаў, якія выдзяляюцца з рэспубліканскага бюджэту на фінансаванне органаў і ўстаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы, і іншых крыніц у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.
3. Забеспячэнне харчаваннем, адзеннем, абуткам, выдача аднаразовай дапамогі, а таксама аплата праезду вызваленых ад пакарання праводзяцца ў парадку і памерах, якія ўстанаўлівае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь пасля ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.
4. Пры вызваленні ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, арышту або пазбаўлення волі інвалідаў I і II групы, цяжарных жанчын і жанчын, якія маюць малалетніх дзяцей, а таксама непаўналетніх асуджаных адміністрацыя ўстановы або органа, якія выконваюць пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці, загадзя апавяшчаюць іх сваякоў або іншых асоб.
5. Асобы, якія вызвалены ад пакарання і патрабуюць з-за стану здароўя пастаяннага нагляду, а таксама непаўналетнія ва ўзросце да шаснаццаці гадоў накіроўваюцца да месца іх жыхарства ў суправаджэнні сваякоў або работніка папраўчай установы.

### Артыкул 194. Права вызваленых ад пакарання на працоўнае і бытавое ўладкаванне і іншыя віды сацыяльнай дапамогі

Вызваленыя ад пакарання ў выглядзе абмежавання волі, арышту і пазбаўлення волі маюць права на працоўнае і бытавое ўладкаванне і атрыманне іншых відаў сацыяльнай дапамогі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 27
## НАЗІРАННЕ І НАГЛЯД ЗА ВЫЗВАЛЕНЫМІ АД АДБЫВАННЯ ПАКАРАННЯ

### Артыкул 195. Прававое становішча асоб, якія адбылі пакаранне

Асобы, якія адбылі пакаранне або вызвалены ад пакарання, якія маюць судзімасць, выконваюць абавязкі і карыстаюцца правамі, якія ўстаноўлены для грамадзян Рэспублікі Беларусь, з абмежаваннямі, устаноўленымі гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 196. Прафілактычнае назіранне за асобамі, якія адбылі пакаранне і ўмоўна-датэрмінова вызвалены ад пакарання

1. За асуджанымі пасля адбыцця пакарання за цяжкае або асабліва цяжкае злачынства, умоўна-датэрміновага вызвалення ад пакарання або асобамі, якія былі асуджаны два і больш разы да пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі за любыя наўмысныя злачынствы, на працягу тэрміну судзімасці ажыццяўляецца прафілактычнае назіранне органам унутраных спраў, а за непаўналетнімі – інспекцыямі па справах непаўналетніх па іх месцы жыхарства.
2. Адміністрацыя папраўчых устаноў, папраўчых устаноў адкрытага тыпу, арыштных дамоў паведамляе аб будучым вызваленні асуджаных у тэрытарыяльны орган унутраных спраў па месцы іх жыхарства за дзесяць дзён да іх вызвалення пасля адбыцця тэрміну пакарання, а пры вызваленні на іншых падставах – у дзень вызвалення. Вызвалены апавяшчаецца аб неабходнасці яўкі ў тэрытарыяльны орган унутраных спраў або інспекцыю па справах непаўналетніх па месцы яго жыхарства для пастаноўкі на ўлік на працягу трох дзён пасля прыбыцця да месца жыхарства.
3. Асуджаныя за цяжкія або асабліва цяжкія злачынствы пасля адбыцця пакарання аж да пагашэння або зняцця судзімасці знаходзяцца пад прафілактычным назіраннем і выконваюць абавязкі, устаноўленыя часткай 3 артыкула 9 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 197. Кантроль за ўмоўна-датэрмінова вызваленымі ад пакарання на працягу неадбытай часткі пакарання**

1. За ўмоўна-датэрмінова вызваленымі ад пакарання на працягу неадбытай часткі пакарання ажыццяўляецца кантроль крымінальна-выканаўчымі інспекцыямі па месцы іх жыхарства. За непаўналетнімі, умоўна-датэрмінова вызваленымі ад пакарання, кантроль ажыццяўляюць інспекцыі па справах непаўналетніх па месцы іх жыхарства. З умоўна-датэрмінова вызваленымі ад пакарання на працягу неадбытай часткі пакарання праводзіцца выхаваўчая праца, парадак арганізацыі і правядзення якой вызначае Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.
2. Пры ўмоўна-датэрміновым вызваленні ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі, пазбаўлення волі адміністрацыя ўстановы паведамляе ў дзень вызвалення ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю, у дачыненні да непаўналетніх – у інспекцыю па справах непаўналетніх па месцы жыхарства асуджанага аб яго вызваленні і накіроўвае туды копію прысуду суда аб умоўна-датэрміновым вызваленні ад адбывання пакарання. У сваю чаргу вызвалены апавяшчаецца аб неабходнасці яўкі ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю, інспекцыю па справах непаўналетніх для пастаноўкі на ўлік на працягу трох дзён пасля прыбыцця да месца яго жыхарства.
3. На працягу неадбытай часткі пакарання асуджаныя павінны выконваць абавязкі, устаноўленыя для асуджаных, якія знаходзяцца пад прафілактычным назіраннем, а таксама абавязкі, які былі ўскладзены на іх судом пры ўмоўна-датэрміновым вызваленні ад пакарання, сваімі паводзінамі пацвярджаць выпраўленне, рабіць справаздачу аб сваіх паводзінах перад органам, які кантралюе ўмоўна-датэрмінова вызваленых ад пакарання, з'яўляцца на яго выклік без абмежавання перыядычнасці яўкі.
4. У выпадку ўхілення асуджанага на працягу неадбытай часткі пакарання ад выканання ўстаноўленых абавязкаў або парушэння грамадскага парадку крымінальна-выканаўчая інспекцыя абвяшчае яму афіцыйнае папярэджанне.
5. Калі ўмоўна-датэрмінова вызвалены ад пакарання ў адпаведнасці з артыкуламі 90 і 119 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь пасля афіцыйнага папярэджання не выконвае ўскладзеныя на яго абавязкі або неаднаразова парушыў грамадскі парадак, за што да яго двойчы былі прыменены меры адміністрацыйнага спагнання, крымінальна-выканаўчая інспекцыя або інспекцыя па справах непаўналетніх могуць накіраваць у суд прадстаўленне аб адмене ўмоўна-датэрміновага вызвалення ад пакарання.

**Артыкул 198. Парадак устанаўлення прэвентыўнага нагляду**

1. Прадстаўленне аб устанаўленні прэвентыўнага нагляду за асобамі, указанымі ў частцы 3 і пункце 1 часткі 4 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, накіроўвае ў суд адміністрацыя папраўчай установы за месяц да будучага вызвалення гэтых асоб з папраўчай установы, а прадстаўленне аб устанаўленні прэвентыўнага нагляду за асобай, указанай у пункце 2 часткі 4 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, – тэрытарыяльны орган унутраных спраў па месцы жыхарства гэтай асобы.
2. Прысуд (пастанова) суда аб устанаўленні прэвентыўнага нагляду за асобамі, указанымі ў частцы 3 і пункце 1 часткі 4 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, і патрабаванняў прэвентыўнага нагляду накіроўваецца судом адміністрацыі папраўчай установы, а прысуд (пастанова) суда аб устанаўленні прэвентыўнага нагляду за асобай, указанай у пункце 2 часткі 4 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, і патрабаванняў прэвентыўнага нагляду – у тэрытарыяльны орган унутраных спраў па месцы жыхарства гэтай асобы.
3. Прысуд (пастанова) суда аб устанаўленні прэвентыўнага нагляду за асобамі, указанымі ў частцы 3 і пункце 1 часткі 4 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, і патрабаванняў прэвентыўнага нагляду абвяшчаецца гэтым асобам адміністрацыяй папраўчай установы за дзень да іх вызвалення з папраўчай установы і ў той жа дзень накіроўваецца ў тэрытарыяльны орган унутраных спраў па выбраным месцы жыхарства. Пры гэтым асобы папярэджваюцца аб адказнасці за непрыбыццё без уважлівых прычын ва ўстаноўлены тэрмін да выбранага месца жыхарства, або выезд за межы раёна (горада) без згоды тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў, або перамену месца жыхарства ў межах раёна (горада) без паведамлення тэрытарыяльнаму органу ўнутраных спраў, здзейсненыя з мэтай ухілення ад прэвентыўнага нагляду, а таксама за незахаванне іншых патрабаванняў прэвентыўнага нагляду без уважлівых прычын.
4. Прысуд (пастанова) суда аб устанаўленні прэвентыўнага нагляду за асобай, указанай у пункце 2 часткі 4 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, і патрабаванняў прэвентыўнага нагляду абвяшчае гэтай асобе тэрытарыяльны орган унутраных спраў па яе месцы жыхарства. Пры гэтым асоба папярэджваецца аб адказнасці за выезд за межы раёна (горада) без згоды тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў або перамену месца жыхарства ў межах раёна (горада) без паведамлення тэрытарыяльнаму органу ўнутраных спраў, здзейсненыя з мэтай ухілення ад прэвентыўнага нагляду, а таксама за незахаванне іншых патрабаванняў прэвентыўнага нагляду без уважлівых прычын.
5. Прэвентыўны нагляд за асобамі, указанымі ў частцы 3 і пункце 1 часткі 4 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, лічыцца ўстаноўленым з дня вызвалення іх з папраўчай установы, а прэвентыўны нагляд за асобай, указанай у пункце 2 часткі 4 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, – з дня абвяшчэння гэтай асобе тэрытарыяльным органам унутраных спраў прысуду (пастановы) суда аб устанаўленні за ёю прэвентыўнага нагляду.

**Артыкул 199. Выключаны**

**Артыкул 199[1]. Выключаны**

**Артыкул 200. Парадак ажыццяўлення прэвентыўнага нагляду**

1. Ажыццяўленне прэвентыўнага нагляду не павінна мець мэтамі знявагу чалавечай годнасці і кампраметацыю асобы, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд.
2. Ажыццяўленне прэвентыўнага нагляду ўскладаецца на тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў па месцы жыхарства асобы, за якой ён устаноўлены.
3. Пры ажыццяўленні прэвентыўнага нагляду ўпаўнаважаныя супрацоўнікі тэрытарыяльных органаў унутраных спраў абавязаны:
1) зарэгістраваць асобу, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, у дзень звароту яе за рэгістрацыяй;

2) паставіць на ўлік асобу, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, у адпаведнасці з актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь;

3) сфатаграфаваць асобу, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд;

4) абвясціць пад распіску асобе, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, патрабаванні прэвентыўнага нагляду;

5) кантраляваць захаванне патрабаванняў прэвентыўнага нагляду асобай, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд.

4. Пры ажыццяўленні прэвентыўнага нагляду ўпаўнаважаныя супрацоўнікі тэрытарыяльных органаў унутраных спраў маюць права:

1) патрабаваць звесткі аб паводзінах асобы, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, ад адміністрацыі арганізацыі па месцы яе працы, а таксама ад грамадзян па месцы жыхарства;

2) хадайнічаць перад адпаведнымі дзяржаўнымі органамі, іншымі арганізацыямі аб працоўным і бытавым уладкаванні асобы, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд;

3) выклікаць асобу, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, і праводзіць з ёй прафілактычныя размовы, а пры неабходнасці – у прысутнасці прадстаўнікоў адміністрацыі арганізацыі па месцы яе працы, а таксама яе сваякоў;

4) апытаць асобу, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, аб захаванні ёй патрабаванняў прэвентыўнага нагляду;

5) уваходзіць у любы час сутак у жыллё асобы, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд.

5. Пры ажыццяўленні кантролю за захаваннем патрабаванняў прэвентыўнага нагляду асобай, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў могуць прыцягваць членаў наглядальных камісій і грамадзян, якія бяруць удзел у ахове правапарадку.

6. Пры ажыццяўленні прэвентыўнага нагляду тэрытарыяльны орган унутраных спраў, які ажыццяўляе прэвентыўны нагляд, мае права ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь накіраваць у суд прадстаўленне аб прадаўжэнні або датэрміновым спыненні прэвентыўнага нагляду, аб змяненні патрабаванняў прэвентыўнага нагляду ў межах, прадугледжаных часткай 8 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

7. Прысуд (пастанова) суда аб прадаўжэнні прэвентыўнага нагляду, аб змяненні патрабаванняў прэвентыўнага нагляду абвяшчаецца асобе, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, тэрытарыяльным органам унутраных спраў, які ажыццяўляе прэвентыўны нагляд.

8. Вышук асоб, якія ўхіляюцца ад прэвентыўнага нагляду, ажыццяўляюць тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў.

### Артыкул 201. Абавязкі асобы, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд

1. Асоба, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, абавязана выконваць наступныя патрабаванні прэвентыўнага нагляду:

1) прыбыць ва ўстаноўлены тэрытарыяльным органам унутраных спраў, адміністрацыяй папраўчай установы, папраўчай установы адкрытага тыпу, арыштнага дома або лячэбна-працоўнага прафілакторыя тэрмін да выбранага месца жыхарства і зарэгістравацца ў тэрытарыяльным органе ўнутраных спраў;

2) з'яўляцца на выклік у тэрытарыяльны орган унутраных спраў ва ўказаны тэрмін і даваць тлумачэнні аб пытаннях выканання ёй патрабаванняў прэвентыўнага нагляду;

3) паведамляць тэрытарыяльнаму органу ўнутраных спраў аб перамене месца працы і (або) жыхарства;

4) выязджаць за межы раёна (горада) па службовых і асабістых справах толькі са згоды тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў.

2. Асоба, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, у выпадку, указаным у частцы 8 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, абавязана:

1) не наведваць пэўныя месцы;

2) не пакідаць сваё жыллё ў пэўны час сутак;

3) з'яўляцца ў тэрытарыяльны орган унутраных спраў для рэгістрацыі ва ўстаноўлены тэрытарыяльным органам унутраных спраў час;

4) не выязджаць за межы Рэспублікі Беларусь.

3. Асоба, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, не павінна здзяйсняць злачынствы і адміністрацыйныя правапарушэнні.

**Артыкул 202. Парадак спынення прэвентыўнага нагляду**

1. Прэвентыўны нагляд спыняецца ў выпадках, указаных у частцы 11 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

2. Спыненне прэвентыўнага нагляду ў выпадках, указаных у пунктах 1–3 часткі 11 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, праводзіцца прысудам (пастановай) суда па прадстаўленні тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў, які ажыццяўляе прэвентыўны нагляд.

3. Прысуд (пастанова) суда аб спыненні прэвентыўнага нагляду абвяшчаецца тэрытарыяльным органам унутраных спраў, які ажыццяўляе прэвентыўны нагляд, асобе пад распіску.

4. Прэвентыўны нагляд у выпадках, указаных у пунктах 4–6 часткі 11 артыкула 80 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, спыняецца тэрытарыяльным органам унутраных спраў.

**Артыкул 203. Адказнасць за незахаванне патрабаванняў прэвентыўнага нагляду**

Асоба, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, за незахаванне патрабаванняў прэвентыўнага нагляду прыцягваецца да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 204. Скаргі і заявы, звязаныя з ажыццяўленнем прэвентыўнага нагляду**

Скаргі і заявы асобы, у дачыненні да якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, на дзеянні тэрытарыяльных органаў унутраных спраў, звязаныя з ажыццяўленнем прэвентыўнага нагляду, разглядаюць начальнік вышэйстаячага тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў, пракурор або суд.

## РАЗДЗЕЛ XI
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 205. Увядзенне ў дзеянне гэтага Кодэкса**

Гэты Кодэкс уводзіцца ў дзеянне спецыяльным законам Рэспублікі Беларусь.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** **А. Лукашэнка**